НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**В. І. РУСІЛКА**

# *НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРА Ў ЯГО РОДАВАЙ І ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІЦЫ*

**8 клас**

***Дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

*Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2010

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Р88

*Серыя заснавана ў 2010 г.*

**Русілка, В. І.**
Р88 Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы : 8-ы кл. дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Русілка. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 184 с. — (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі).
ISBN 978-985-6941-73-6.

**УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)**
**ББК 83.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-6941-73-6**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2010

## ДАРАГІЯ ВАСЬМІКЛАСНІКІ!

Вы зрабілі ўдалы выбар, калі вырашылі займацца факультатывам «Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы», бо наша асноўная задача — не толькі паглыбіць веды пра літаратуру, а навучыцца чытаць яе так, каб само чытанне было цікавым, прыносіла радасць і задавальненне, каб у вас заўсёды было жаданне ўзяць у рукі добрую кнігу і апынуцца ў яе чарадзейным свеце. А для гэтага трэба пазнаёміцца з тым, хто такі пісьменнік, заглянуць у яго творчую лабараторыю і зразумець законы, па якіх будуюцца розныя творы. Каб палюбіць, трэба ведаць. Спадзяёмся, што нашы заняткі наблізяць вас да роднай літаратуры і, магчыма, раскрыюць і ўдасканаляць вашы ўласныя літаратурныя здольнасці. Вы паспрабуеце стаць «сааўтарам» твора, прайсці яго шляхам пісьменніка і аб’ектыўна ацаніць вынікі сваёй творчай працы. Факультатыў дапаможа вам папоўнаму зірнуць на многія з тых твораў, з якімі вы ўжо знаёміліся самастойна ці да ўрокаў пазакласнага чытання, бо наш асноўны ракурс позірку: не толькі ***пра што*** хацеў сказаць аўтар, а ***як*** ён гэта зрабіў, выбраўшы пэўную жанравую форму драматычнай п’есы ці вадэвіля, бытавой, дэтэктыўнай ці фантастычнай аповесці, казкі ці байкі, песеннага верша ці санета, трыялета, актавы. Нават няпоўны пералік літаратурных жанраў падказвае, што знаёміцца з імі трэба ў непасрэдным адзінстве з іншымі відамі мастацтва — жывапісам, музыкай, тэатрам, бо яны не існуюць асобна адзін ад аднаго. Насамрэч,

з якога віду мастацтва паняцці «партрэт», «пейзаж», «рытм», «накцюрн», «раманс»? Хутка вы з лёгкасцю працягнеце гэты спіс, зразумеўшы, што законы прыгажосці, заканамернасці стварэння мастацкага вобраза, аднолькава ўласцівы розным відам мастацтва, якія не толькі існуюць, але і ўзаемаўзбагачаюцца. Нават аўтара зусім розных твораў называюць аднолькава — мастак, і сама назва нясе ў сабе ацэначны момант: той, хто ўмее тварыць незвычайны свет і нясе яго ў сваёй душы.

Мастацкія творы адрозніваюцца па спосабе адлюстравання рэчаіснасці (знешні ці ўнутраны па адносінах да аўтара свет), асаблівасцях вобразнасці, мастацкай форме, аб'ёме, моўным афармленні, адметнасці чытацкага ўспрыняцця (перавага пачуццёвага ці лагічнага). У адпаведнасці з гэтым і спасцігаць іх мы будзем па-рознаму: казку ўспрымаць праз мастацкае расказванне; сюжэты апавяданняў і аповесцяў пераказваць, пераасэнсоўваць і працягваць; вершы, якія сталі песняй, успрымаць у адзінстве з музыкай, «дапісваць» апошнія радкі верша ці спрабаваць скласці верш і параўнаць яго з арыгінальным творам паэта, аб'ектыўна ацэньваючы свае спробы; працаваць як калектыў маленькага драматычнага тэатра (рэжысёр, акцёры, дэкаратары, касцюмеры, музычны аператар і г. д.) пры вывучэнні п'есы; параўноўваць творы літаратуры і выяўленчага мастацтва, рабіць ілюстрацыі словамі ці фарбамі… Які цікавы свет творчасці можа адкрыцца перад вамі! У добры шлях!

# ХТО ТАКІ ПІСЬМЕННІК?

***Сяргей Грахоўскі***

* * *

Каб пісаліся вершы,
Трэба быць закаханым
У жанчыну, у неба,
У добрых людзей.
І ад шчасця заўсёды
Быць крышачку п’яным
І ніколі, ніколі
Не траціць надзей.

Трэба быць закаханым
У гоманы бору,
У світанкі над полем,
У дождж на сяўбе,
Трэба быць закаханым
У сінія зоры
І ніколі, ніколі —
У самога сябе.

***Алег Салтук***

**НАТХНЕННЕ**

Успыхнулі дровы ў кастры —
Агеньчык узвіўся высока.

У поўні савінае вока
Ярчэй заблішчэла ўгары.
Гары, мой агеньчык, гары!

Да раніцы сцішыўся гай.
Гуляе ў палях адзінота.
Спакой мой кароткі, бывай —
Душа патрабуе работы.
Імгненне, спыніся — ты рай!

Хвалюецца ў добрай цішы
Жытнёвая спелая ніва.
Туман расплываецца сівы…
Хутчэй мне пісьмо напішы,
Пакрыўдзі, змані, саграшы —
Ўсё роўна я сёння шчаслівы!

1. Што аб'ядноўвае змест вершаў С. Грахоўскага і А. Салтука? У чым адметнасць твораў?

2. Як вы разумееце словы «натхненне», «творчасць»?

# ШТО ТАКОЕ ТВОР?

Творам мастак называе карціну, музыкант — мелодыю, скульптар — статуэтку, рэжысёр ці акцёр — фільм… Літаратурны твор — гэта завершаны па форме празаічны ці вершаваны тэкст, які адпавядае законам прыгажосці. Пачынаецца праца пісьменніка з творчай задумы і можа быць доўгай, складанай і карпатлівай справай, якая называецца творчай гісторыяй. Трэба ж вывучыць багаты жыццёвы і гістарычны матэрыял, вызначыць тэму і ідэю будучага твора, прадумаць жанравую форму яго ўвасаблення, знайсці неабходныя мастацкія сродкі і прыёмы.

Тэма — тыя жыццёвыя з’явы, якія паказвае аўтар, ідэя — галоўная думка, якую ён хоча сцвердзіць. Твор — непарыўнае адзінства формы і зместу. Як будуць увасоблены тэма і ідэя, ці знойдуць яны водгук у чытача — залежыць ад таленту аўтара і яго настойлівай працы над словам.

# АГУЛЬНАЕ ЎЯЎЛЕННЕ ПРА РОДЫ ЛІТАРАТУРЫ

*Андрэй Федарэнка*

## РЭПЕТЫЦЫЯ
*Апавяданне*

### I

Пад канец трэцяга ўрока дзверы ў шостым «А» класе прачыніліся, зазірнула маладая практыкантка Ліза Сасноўская — яна ж кіраўніца школьнага драмгуртка — і, папрасіўшы ў настаўніка прабачэння, зрабіла аб'яву:

— Каця і Аксана, на перапынку, калі ласка, збіраемся ў актавай зале... Абавязкова, бо прыйдзе сам завуч, — дадала яна, знікаючы.

Празвінеў званок. Удзельніцы драмгуртка Каця Аляшкевіч і Аксана Гамола хуценька збеглі на першы паверх і ўвайшлі ў гулкую актавую залу. Сапраўды, завуч Андрэй Адамавіч ужо сядзеў на адным з крэслаў у першым радзе, перад сцэнаю, трымаючы ў руцэ нейкую паперчыну, і размаўляў з Лізай Сасноўскаю.

— Праходзьце, сядайце! — убачыўшы дзяўчынак, запрасіла Ліза.

— Нічога, мы пастаім...

У гэты момант у дзвярах адзін за адным з'явіліся яшчэ ўдзельнікі — тры хлопчыкі са старэйшых класаў: светлавалосы хударлявы Антон, рэдактар школьнай сценгазеты, паэт, футбаліст і вялікі выдумшчык; Віця — невысокі, таўсматы,

добры (заўсёды дасць спісаць); і Мікола — круглы выдатнік і разам з тым чамусьці надзвычай сарамлівы.

— Усе ў зборы? — спытаў у Сасноўскай завуч.

— Яшчэ павінен быць хлопчык, але захварэў.

— Ну што ж, хопіць і гэтых.

Вучні паўкругам абступілі завуча. Той зірнуў у паперку, пачаў:

— Такая справа... Пазванілі мне толькі што з гарана — так і так, праз тыдзень адбудзецца агляд-конкурс на лепшую пастаноўку сярод школьных драмгурткоў. Умовы... паглядзім умовы. Першая, яна ж галоўная, — каб пастаноўка была арыгінальная. Што азначае прыдуманая або калектыўна, або аўтарам, кім-небудзь з нашых вучняў... Я думаю, такія знойдуцца. Другая — пастаноўка павінна быць арыгінальная ў прамым значэнні, павінна... так сказаць... розніцца ад сцэнак, што будуць паказаны на аглядзе іншымі школамі.

— Яе трэба напісаць нам самім? — спытаў Антон.

— Вось іменна. Я думаю, гэта павінна быць нешта без цімураўцаў, без чырвоных гальштукаў, без ералашаўскіх школьных анекдоцікаў... Але разам з тым — каб было нешта сучаснае. Без псеўдафальклору, без featureрознага сюсюкання, бабаў-ёгаў і кашчэяў. Усё гэта адразу прыходзіць у галаву, і ўсё гэта лёгка могуць прыдумаць і ў іншых школах.

Практыкантка Ліза Сасноўская пераглянулася з вучнямі.

— Можа...

— Можа, нешта нацыянальнае? — перабіў яе завуч. — Каб быў подых гісторыі і разам з тым — павевы сучаснасці? Ну і мараль, само сабою... Гэта абавязкова. Каб кожны знаходзіў у гістарычным сюжэце штосьці сваё, сённяшняе... Дарэчы, ніколі не мог зразумець, чым дзіцячыя творы павінны розніцца ад дарослых. Помню, у восем гадоў прачытаў Гюго «Дзевяноста трэці год», а ў шаснаццаць — «Віцю Малеева ў школе і дома» — і цікава было! Я думаю, дзеці школьнага ўзросту ўсё разумеюць і ўспрымаюць так, як і дарослыя, про-

ста яны часта, каб не крыўдзіць дарослых, падстройваюцца пад іх, робяць выгляд, што ім цікава, як Іван-дурань збіраецца ратаваць царэўну...

— Зразумела, Андрэй Адамавіч, — ізноў сказаў Антон. — Трэба прыдумаць штосьці для дзяцей, але каб цікава было і дарослым.

— Так! Бачу, вам многа тлумачыць не трэба. Мы ўсе тут у прынцыпе дарослыя людзі, чаму я і гавару з вамі як з роўняю... Паўтару толькі: будзе многа калектываў. Па выніках гэтага агляду будуць меркаваць аб культурным узроўні нашай школы ў цэлым. Будзе прымаць сур'ёзная камісія. І тым не менш не сумняваюся, што мы неяк вылучымся, здзівім усіх, спадабаемся...

Ён паглядзеў на гадзіннік.

— Словам, усё зразумела? Рэпеціруйце, выдумляйце, эксперыментуйце... Час ёсць. Актавая зала на гэты ты — дзень, што застаўся да агляду, — вашая. Калі спатрэбіцца, магу нават вызваліць вас ад урокаў... не ўсіх, вядома... Фізкультуры там ці працы... Аднак прабачце, я спяшаюся.

Завуч падняўся.

— Пачакайце, Андрэй Адамавіч! — спыніла яго Сасноўская. — Здаецца, у нас ёсць такая сцэнка, пра якую вы казалі. Гэта казка, але ў ёй, здаецца, ёсць усё, што трэба: элементы нацыянальнага, фальклор, пэўная мараль, і яна, здаецца, будзе цікаваю як дзецям, так і дарослым!

— Ліза, вы не зразумелі, народныя казкі…

— Казка не народная, а стылізацыя! Прычым, як мне здаецца, не без таленту. Яе прыдумаў наш Антон.

Ад здзіўлення завуч сеў ізноў на сваё месца, забыўшы, што спяшаўся.

— Антон? Вось гэты? Сам?

— Сам, — пацвердзіла Сасноўская. — Ён увогуле малайчына, усе нашыя сцэнкі — гэта яго работа! Яшчэ вершы піша і нават друкаваўся ў гэтым... як яго... «Першацвеце».

— Сапраўды? — Андрэй Адамавіч раптам нават працягнуў руку, каб пагладзіць Антона па галаве, але спахапіўся і зрабіў выгляд, што хацеў толькі зірнуць на гадзіннік. — Ну што ж, так і быць — паказвайце вашу сцэнку. Праўда, у мяне ўрок вось-вось...

— Ды мы хутка! — узрадавалася Сасноўская. — Толькі фінал! Так, хлопчыкі, давайце касцюмы, дэкарацыі! Аксана, рыхтуй магнітафон!

Хлопчыкі між тым вынеслі з-за кулісаў крэслы, стол, Мікола накрыў яго абрусам. Віця з Антонам устанавілі на сцэне дзве вялікія бутафорскія калоны. Затым дзеці ненадоўга зніклі за кулісамі. За стол, у крэслы селі Антон — у світцы, з прыклеенымі доўгімі вусамі — «пан», і Каця — «пані».

— Пачынаем! — крыкнула Сасноўская, сядаючы побач з завучам.

Аксана пстрыкнула клавішам магнітафона, і загучала чароўная старадаўняя скрыпічная музыка.

З-за кулісаў, нясмела падштурхоўваючы адзін аднаго, паказаліся Мікола з Віцем, пераапранутыя ў мужыкоў. Яны яшчэ здалёк знялі шапкі і, падыходзячы, пачалі нізка кланяцца Антону з Кацяй — «пану» і «пані».

*Пан*. Значыць, просіце дапамогі? Што ж, так і быць, памагу.

— Каця, рухайся трохі — умяшалася Сасноўская. — Устань, прайдзіся, зрабі так, што не пан сам дадумваецца, а ты яму падказваеш!

Каця паслухмяна паднялася, абышла стол, штосьці прашаптала на вуха «пану»-Антону. Абое засмяяліся.

*Пан*. Што ж, быць так, як ты, жоначка, раіш... Памагу, мужычкі, але пры адной умове: калі хваліць мяне не будзеце!

«Мужычкі» паціснулі плячыма, узрадаваныя.

*Першы мужык.* Што можа быць лягчэй?

*Другі мужык*. Смешны ты, Пан! Першы раз чалавека бачу, які не любіць, каб яго хвалілі!

*Пан.* Вось і добра, калі згодныя. Тады сядайце са мною за стол, пакармлю вас спачатку — сама Пані прынясе... Жонка!

«Мужычкі» нясмела сядаюць за стол. Пані выходзіць і прыносіць вялізную міску баршчу і смажаную качку. «Мужычкі» прагна ядуць.

*Пан.* Ці дагадзіў я вам з абедам, мужычкі?

*Першы імкнецца нешта сказаць, другі штурхае яго пад бок.*

*Другі мужык.* Хіба гэта абед? Не мог кожнаму па місцы даць, наліў у адну... Боршч кіслы, качка перасмажаная, сухая... Нябось, сам такое не ясі?

*Пан (смеючыся).* Добра... Вось табе залаты! А цяпер сядайце вальней, можаце люлькі курыць, а я вам сыграю. Жонка, вынесі скрыпку!

*Пані выносіць скрыпку. Пан пачынае іграць — да таго весела, што мужычкі прытупваюць у лад.*

*Пан.* Ці дагадзіў я вам, мужычкі? Ці адпачылі пасля абеду?

*І зноў імкнецца нешта сказаць першы мужык, другі яму не дае.*

*Другі мужык.* Які абед, такі і адпачынак! Мой падсвінак у хляве лепш пішчыць, чым ты граеш!..

*Пан (зноў смеючыся).* Што ж, на табе другі залаты.

*Другі мужык (увaходзячы ў ролю).* Усяго? Пры сваіх грашах мог бы і больш даць!

*Пан.* Магу і больш. Прасіце, колькі вам трэба.

*Першы мужык (на гэты раз адштурхнуўшы другога).* Ты нас карміў, паіў, сама Пані на стол падавала, люлькі курыць дазволіў, іграў нам, грошай хочаш даць — і за усё гэта цябе няможна пахваліць?! Няможна падзякаваць табе?! Не, хай лепш мне нічога не дастанецца, скажу — добры ты чалавек, і дай табе Бог здароўя!

*Другі мужык плюецца.*

*Пан (устае, абдымае першага мужыка).* Дзякую на добрым слове, чалавеча!.. Жонка, загадай, каб насыпалі яму поўныя кішэні залатых! А табе *(да другога)* і двух хопіць. І запомні, братка, не варта быць свіннёю, што б табе за гэта ні абяцалі, а варта заўсёды плаціць людзям тым, чым яны табе: на дабро — дабром!

— Усё, — аб'явіла Сасноўская. — Як, Андрэй Адамавіч? Завуч замест адказу запляскаў у ладкі.

— Цудоўна! Выдатна проста! Ану, пан, падыдзі сюды!

Антон, сарамеючыся, падышоў бліжэй, за ім і астатнія ўдзельнікі.

— Дай пацісну тваю руку... Можа, я паціскаю руку будучага нашага Андэрсена! Скажы, Антон, гэта ж трэба было неяк прыдумаць? Як ты  прыдумаў?

— Як прыдумаў? Ведаеце, ёсць такі мультфільм...

Там пра дзяўчынку. Хто пахваліць яе лепш за ўсіх — атрымае вялікую смачную цукерку, памятаеце? Я глядзеў, і мне захацелася зрабіць наадварот: хто не пахваліць лепш за усіх...

Андрэй Адамавіч быў уражаны:

— Ты глядзі! Ну, малайчына. А я вось і два радкі ў рыфму напісаць не змагу, — ён зіркнуў на гадзіннік, заспяшаўся. — Што ж, можна будзе паказаць і гэтую сцэнку... Толькі адно, мне здаецца, — выхад на фальклор, на казачнасць — самы лёгкі і просты. Калі Антон, паглядзеўшы мультфільм, прыдумаў, дык чаму яшчэ нехта не зможа? І потым — усё ж гэта яўная стылізацыя: дарослыя героі, казачная мова... Абмежаваны час і месца дзеяння. Можа, паспрабаваць яшчэ штосьці? Час ёсць... у вас ёсць, у мяне ўжо, на жаль, няма! Словам, смялей эксперыментуйце,  выходзьце... ну...

— На сучаснасць выходзіць, Андрэй Адамавіч? — падказаў Антон.

— Вось-вось! Што-небудзь такое, ведаеце, — «Когда уйдешь со школьного двора», «Мальчик с девочкой дружил, дружбой этой дорожил», і ў такім родзе... Усё, пабег!

Завуч і сапраўды амаль подбегам выйшаў з актавай залы. Крыху разгубленыя дзеці разам з Сасноўскай паглядзелі яму ўслед.

— Ох, падазраю, што дагадзіць яму будзе нялёгка, — уздыхнула Аксана, пераматваючы на магнітафоне назад касету.

— Нічога страшнага! — бадзёра азвалася Сасноўская. — Помніце, у нас была якраз школьная, пра сяброўства, сцэнка? Давайце заўтра збяромся, запросім яго і пакажам.

## II

Назаўтра пасля ўрокаў удзельнікі драмгуртка на чале з Сасноўскай былі ў зборы ў пустой актавай зале.

Хутка на сцэне з'явіліся дэкарацыі: школьны клас — парты, стол, дошка... Аксана з Сасноўскай селі, як і ўчора, у першым радзе, Аксана ўключыла магнітафон, з якога ціхенька загучала песня — тая самая, «Когда уйдешь со школьного двора».

На сцэне тым часам Каця — у школьнай форме, з касічкамі на галаве, з партфелем у руцэ — нібыта збіралася выйсці з класа, а Антон, Мікола і Віця заступілі ёй дарогу.

*Каця.* Ах, што такое? Дайце прайсці!..

*Не даюць, пераміналюцца з нагі на нагу, падштурхоўваюць адзін аднаго.*

*Антон.* Каця, мы хочам пагаварыць з табою... Мы ўжо не дзеці. Хутка выпускныя экзамены. Потым шляхі нашы разыдуцца ў розныя бакі. Скажы, нарэшце, каго з нас траіх ты выбіраеш?

*Каця.* Ах, хлопчыкі, я вас усіх выбіраю! Усіх трох люблю аднолькава...

*У гэты час у актавую залу, махаючы рукамі, каб не звярталі на яго ўвагі, на дыбачках увайшоў завуч Андрэй Адамавіч.*

*Антон.* Мы былі самыя лепшыя у класе сябры. Нас дражнілі трыма мушкецёрамі. Заусёды мы былі разам, стаялі адзін за аднаго гарою... пакуль не з’явілася ты...

— Антон, што значыць «з’явілася»? — перабіла Сасноўская, гледзячы ў нейкія лісткі.

*Антон.* Ой, пакуль ты не перавялася да нас з іншай школы. Мы пісалі табе запіскі, ты адказвала на іх, хадзіла з намі ў кіно, танцавала на дыскатэках, падказвала нам урокі, давала спісваць... Мы не маглі падзяліць цябе. Трох лепшых сяброў ты зрабіла трыма ворагамі. Але мы не хочам больш варагаваць! Выберы аднаго з нас — так будзе лепш, і мы зноў станем сябрамі.

*Кацяя.* Ах, як гэта для мяне нечакана! *(Задумваецца.)* Добра. Калі так, я згодна. Я выберу з вас кагосьці... але не цяпер, а скажам, гады праз два. Калі за гэтыя два гады вы мяне не забудзеце, мы ўсе зноў збяромся разам, і я выберу з вас таго, хто за гэты час большага ў жыцці даб’ецца. Вось ты, Антон, добра пісаў сачыненні — пастарайся за гэты час стаць журналістам ці хоць бы паступі на журфак... Ты, Віця, заўсёды ўсё перапрадаеш — ад жвачак да шпаргалак, вядомы ўсёй школе фарцоўшчык, пастарайся стаць, напрыклад, бізнесменам... А ты, Мікола, любіш парадак, дысцыпліну, збіраешся вучыцца на афіцэра — вось і паглядзім, што з цябе праз два гады атрымаецца... Такая мая ўмова. Ці згодны?

*Каця працягвае далонь, і ўсе ўтрох у знак згоды кладуць свае далоні на яе.*

*Пад тую ж школьную музыку змяняюцца дэкарацыі. На сцэне — гратэскна-шыкоўны офіс: з камп’ютарамі, тэлефонамі дэкаратыўнымі пальмамі. Каця, загрыміраваная пад дарослую дзяўчыну, сядзіць за часопісным столікам, увесь час глядзіцца ў люстэрка.*

— Прайшло два гады! — прашаптала Сасноўская завучу, і той кіўнуў, што зразумеў.

*Каця-бізнесменша.* Як я хвалююся! Хто б мог падумаць, што яны мяне не разлюбяць!.. Вось-вось яны прыдуць, і я

вымушана буду адмовіць ім, сказаць, што за гэты час я пакахала зусім іншага чалавека... Як растлумачыць ім гэта? Як даказаць, што я зусім не жорсткая, не легкадумная?! Так, Антон цяпер піша артыкулы, друкуецца ў газетах. Віця ўдала робіць бізнес, Мікола вучыцца ў прэстыжным ваенным вучылішчы. Але ж яны нават не здагадваюцца, што ўсімі сваімі поспехамі яны абавязаны мне! Так, мне. Што ўладкоўваць іх памагаў мой дзядзька, які займае высокую пасаду, і пра існаванне якога яны нават не здагадваюцца... Я адплаціла ім за каханне і вернасць, папрасіла дзядзьку, каб памог ім. Але ці трэба гаварыць ім пра гэта? Прыніжаць іх самалюбства? Не, хай думаюць, што ўсяго дабіліся самі!..

*Перад дзвярыма ў офіс топчуцца Антон з фотаапаратам на шыі, Віця ў касцюме, у беленькай кашулі, Мікола ў ваеннай форме, у фуражцы.*

*Антон.* Не, я не магу! Хай нехта з вас зойдзе і ўсё растлумачыць...

*Віця.* А што тлумачыць?

*Антон.* Што ў нас ва ўсіх — нявесты! Дый так... Школьныя сяброўствы, клятвы, цацанкі-абяцанкі — гэта несур’ёзна. Прайшло столькі часу — мы ўжо не дзеці!

*Мікола.* Ды чаму мы ўвогуле павінны перад ёю адчытвацца?

*Антон.* Не забывайцеся! Ці не думаеце вы, што змаглі б нечага дабіцца ў жыцці без Кацінага дзядзькі? Вось так яно. А хто прыдумаў?

*Віця.* Ну, ты, ты...

*Антон.* Хто яшчэ ў школе пранюхаў пра яе дзядзьку? Хто, ведаючы, што ў яе добрая душа і што яна на усё пойдзе, каб аддзячыць нам за каханне, якога не было, прыдумаў усю тую камедыю з запісачкамі, калі мы хадзілі за ёю, як прывязаныя, запрашалі ў кіно, на дыскатэкі? «Ах, мы ўсе цябе кахаем!», «Ах, выберы з нас каго-небудзь аднаго!».

*Віця.* Ты, ты.

*Мікола.* А раз ты, дык і выкручвайся сам! Ідзі і жаніся з ёю!..

Андрэй Адамавіч запляскаў у ладкі, перапыняючы рэпетыцыю:

— Хлопцы, хлопцы, досыць! Падыдзіце сюды, калі ласка! Ну, хлопцы, закруцілі вы так, што галаву зломіш... Хто гэтую... гэта ўсё прыдумаў? А, забыўся — ну, вядома ж, Антон!

— Няўжо вам не спадабалася, Андрэй Адамавіч? — здзівілася Сасноўская. — Вы ж нават да канца не даглядзелі, а там канцоўка нечаканая: убачыўшы Кацю, яны закахаюцца ў яе, на гэты раз па-сапраўднаму!

— Не, канцоўка тут ні пры чым. Ты, Антон, я бачу выдумляльшчык добры, але не старайся, дружа, пераплюнуць самога сябе... Урэшце, мы школьнікі, і гледачамі нашымі будуць таксама школьнікі. У гэтай вось вашай, з дазволу сказаць, пастаноўцы дзіцячага сюсюкання, магчыма, і сапраўды няма, але няма і нічога таго, што можна было б паказваць дзецям. Чаго тут хапае, нават цераз край, дык цынізму, разліку, а таксама офісаў, бізнесаў і таму падобнае... Якраз тое, што цяпер менш за ўсё павінна цікавіць і дарослых і, тым больш, дзяцей. А ў вас уся сцэнка на гэтым акурат і закручаная. Давайце так думаць: а калі б Каця не стала бізнесменшаю? А калі б за гэтыя два гады грамадства памянялася, і гэты яе ўплывовы дзядзька — дарэчы, ці не стаіць за ім якаясь канкрэтная асоба? — гэты дзядзька паляцеў бы са свайго месца сторч галавою? Тут сам сюжэт дапускае варыянтнасць... Не, не. Я вам так скажу: няма нічога больш пераменлівага, чым тое, што нам здаецца вечным. Тут сёння можа быць офіс і бізнес, а заўтра...

— Цімураўцы з гальштукамі? — панура перабіў Антон.

— І вельмі проста. Разумны, шустры хлопчык! Вось бачыш, як ты сам усё разумееш... Я перакананы, што ты яшчэ прыдумаеш такую сцэнку, — ахнуць усе! Але не пра сучас-

насць. Цяпер ясна бачу. Дзе сучаснасць, там пераменлівасць, непастаянства... Можа...

— Можа, гісторыя? — падказала Сасноўская.

— Вось-вось! Я і сам пра гэта думаў. Да гісторыі цяжка падкапацца — была і прайшла... Толькі трэба што-небудзь такое, ведаеце, нацыянальнае, сівая даўніна, хлопчык з жалейкаю...

— Дык у нас ёсць акурат такая сцэнка! — узрадавалася Сасноўская. — Дзевятнаццатае стагоддзе, паўстанне Каліноўскага...

— У вас, я гляджу, чаго ні папытайся, усё ёсць, — заўважыў Андрэй Адамавіч. — І што, таксама Антон прыдумаў?

— Так, Антон. Ды мы вам зараз і пакажам! Хлопчыкі!

— Не, не! — спахапіўся завуч. — На сёння хопіць, мне бегчы трэба. Давайце хоць заўтра...

Ён зірнуў на гадзіннік і хуценька выйшаў.

— Што ж яму можа спадабацца? — разгублена абвёў усіх вачыма Антон.

— «Сівая даўніна без псеўдафальклору!» — перадражніла Аксана.

— «Каб цікава было і дарослым!» — перадражніў Віця.

— «Смялей эксперыментуйце!» — перадражніла Каця.

— Нічога страшнага, — сказала Сасноўская. — Я чамусьці ўпэўнена, што заўтра яму спадабаецца!

## III

І зноў, як і ў тыя разы, дзеці з Лізай Сасноўскай сабраліся ў зале пасля ўрокаў. Цяпер на сцэне была дэкарацыя вясковай хаты, печы; каля печы тупала Каця, якая павінна сёння выконваць ролю Маці.

Гэтым разам Андрэй Адамавіч быў, відаць, вальнейшы, таму прыйшоў яшчэ да пачатку рэпетыцыі. Ён сядзеў на сваім звыклым месцы ў першым радзе і ўважліва глядзеў на сцэну.

З Аксанінага магнітафона гучала шчымлівая мелодыя жалейкі.

— *Маці*. Божа, Божа, што за часы пайшлі?.. Што ў свеце робіцца? Як звесці канцы з канцамі? Усё лета крапівой ды шчаўем перабіваемся, і забяліць няма чым: апошнюю кароўку, Лысуху-карміцельку, забралі цівуны пана Патоцкага... І калі ж гэта мой сынок з лесу вернецца? Небяспечна цяпер у лесе, страляюць, паўстанне нейкае, кажуць, усчалі... І сам пан Патоцкі, кажуць, памагае тым паўстанцам... Ох, Бога не баіцца! Але адно добра, што з-за гэтага паўстання хоць людзей не так сталі ганяць, у лес схадзіць можна, грыба якога ўхапіць, у гаршчок укінуць, і то смачней... Вось і мой сынок пайшоў у грыбы… І ўсё няма і няма. Хаця каб не ўлез у якое ліха, каб хоць кашулі апошняй не парваў, бо не будзе ў чым бацьку на свята ў царкву схадзіць. Адна ў іх кашуля на дваіх, і ў святы, і ў будні…

*Улятае ў хату Антон, ён жа Сын.*

— *Маці*. Дзякуй Богу, жывы! А дзе грыбы, дзе кошык? А кашуля хоць цэлая? *(Абмацвае кашулю.)*

— *Сын*. Ды цэлая, цэлая. Мама, дай мой кавалачак хлеба, той, што на абед адкладзены!

— *Маці*. Нашто табе? Рана яшчэ есці.

— *Сын*. Дай.

— *Маці*. Не дам, пакуль не скажаш нашто. І дзе кошык з грыбамі?

— *Сын*. Добра, скажу... Толькі пабажыся, што будзеш маўчаць! Мама, я знайшоў у лесе параненага чалавека.

— *Маці*. Божа, прасвятая Багародзіца!.. Бандыта?!

— *Сын*. Які ён бандыт? Ён па-нашаму, па-беларуску мовіць. Прасіў, каб я прынёс яму паесці і каб нікому не казаў, дзе ён.

— *Маці*. Святы Мікола-заступнік... Гэта ж, мусіць, з тых, што заўчора з жандарамі білiся ў лесе... Ён жывы, кажаш?

— *Сын*. Вядома, жывы, раз гаворыць.

— *Маці (мармыча сама сабе).* Гэта добра, калі жывы...

— *Сын.* Давай хутчэй хлеб! Вось, толькі глянь, што ён мне даў... Во — рубель! І казаў, калі памагу, дасць яшчэ столькі, колькі пальцаў на абедзвюх руках!

— *Маці (спрабуе рубель на зуб).* Праўда, цэлы рубель! Вось шчасце ў хату! *(Кідаецца да стала, рэжа хлеб.)* На, вось табе, хлопчык мой... Нясі, нясі яму, сонейка маё... Дык дзе, ты кажаш, ён ляжыць?

— *Сын.* За Цімохавым логам, у Сухім ляску, як на Замошша ехаць.

— *Маці.* Ага, так, так... Нясі, саколік, толькі сам не з'еш па дарозе!

*Сын знікае.*

*Маці.* Ёсць жа Бог на небе! Вось і да беднага шчасце прыплыло. Жывы, добра кажа... А людзі расказваюць, што ў той паперцы, якую жандары на сцяну карчмы прычапілі, напісана, што за жывога ажно пяць рублёў даюць, а за мёртвага — толькі тры... Хоць, падумаўшы, дык яно і тры рублі грошы. Кароўку, Лысуху нашую, карміцельку выкупілі б, кашулю бацьку справілі б...

— Стоп, стоп, стоп! — пачуўся голас Андрэя Адамавіча. — Усе сюды! Гэта штосьці яшчэ больш не тое...

З-за кулісаў выйшлі Мікола з Віцем, са сцэны спусціліся Антон з Кацяю.

— Гэта што, раман ці гістарычная драма? Нам трэба паказаць элементарную дзіцячую сцэнку — разумееце, усяго толькі сцэнку! А ў вас?.. Вось калі б трэба было прыдумаць нейкую пародыю на гістарычны жанр, гэтае... вашае падышло б сама лепш. Ну, Антон!.. Выдумляльшчык ты, я ўжо бачу, таленавіты, але чаму цябе ўвесь час не ў той бок заносіць?.. Скажы, ты, праўда, друкаваўся ў тым... як яго... «Першацвеце»?

Антон моўчкі кіўнуў.

— Андрэй Адамавіч! — у дзвярах актавай залы з’явілася сакратарка. — Вас да тэлефона, з гарана!

— Адну хвілінку, — Андрэй Адамавіч выйшаў.

— Якой трасцы яму яшчэ трэба? — уздыхнула Каця, сядаючы.

— Можа, паспрабаваць фантастычны сюжэт? — прапанаваў Віця. — Змяшэнне часоў — сучасны школьнік пераносіцца ў гісторыю, удзельнічае ў паўстанні...

— Не, — перабіў Мікола, — лепш хлопчык з гісторы пераносіцца ў наш час, у сучасную школу...

— Антон, а можа, паспрабаваць сцэнку абсурду? — нясмела сказала Сасноўская. Дзяўчына была яўна разгубленая.

Антон раптам засмяяўся. Усе зірнулі на яго са здзіўленнем.

— Чакайце, здаецца, я яго раскусіў! Зараз мы зробім тое, што яму спадабаецца, — весела аб’явіў Антон.

Ён зрабіў знак, каб усе прысунуліся да яго бліжэй, і пачаў шэптам дзяліцца сваёй задумаю...

Неўзабаве вярнуўся Андрэй Адамавіч.

— Ну, вось, — паскардзіўся, падыходзячы. — Званілі з гарана, з камісіі: вырашана скараціць час на падрыхтоўку. Агляд ужо заўтра! А у нас нічога не гатова... Эх, Антон, Антон... Паспадзяваўся я на цябе. Давядзецца, мабыць, паказваць тую першую вашу казку, хоць гэта і не выйсце, вядома.

— Андрэй Адамавіч, паглядзіце яшчэ адну сцэнку, экспромт! — узмалілася Сасноўская. — Ну, калі ласка! Апошні раз, Андрэй Адамавіч!

— Хіба што апошні раз... — Андрэй Адамавіч прысеў.

— Хлопчыкі, дэкарацыі, хутчэй!

## IV

Тая самая хата, тая ж печ; гучыць з магнітафона тая самая шчымлівая музыка жалейкі. На печы ляжыць Антон —

Янка — і нібыта іграе на жалейцы, за сталом сядзіць Мікола — Разумны брат — пляце лапці.

*Сасноўская (выконваючы ролю Казачніцы).* Пра Янку, злога Цмока і Ганку! Жылі былі ў адным царстве два браты, разумны і дурны. Дурны ляжаў на печы і граў на жалейцы, а разумны працаваў. Усё было добра, але панадзіўся, як на тое ліха, лятаць у тую мясцовасць страшны, злы трохгаловы Цмок. І хапаў ён толькі самых прыгожых дзяўчат...

*Разумны брат (кідаючыся да акна).* Што гэта так пацямнела? Няўжо на дождж збіраецца?

*Янка.* Ды не, гэта зноў Цмок прыляцеў. *(Іграе далей на жалейцы.)*

*Разумны брат.* І праўда, Цмок! Во, назад ляціць, нячыстая сіла!.. Каго на гэты раз хапнуў?

*Чуецца голас Ганкі.*

*Ганка.* Браты мае мілыя, бывайце! Не бачыць мне вас больш, бо схапіў мяне люты Цмок!..

*Разумны брат.* Ай-яй, чуеш, Янка? Што ж нам рабіць? Трэба ж неяк ратаваць дзяўчыну!

*Сасноўская.* Пачаў Разумны брат збірацца на вайну з лютым Цмокам, у даспехі адзеўся, востры меч у рукі ўзяў. А Янка ляжыць на печы і на жалейцы сабе грае.

*Янка.* Ідзі-ідзі, але ведай: не перамагчы табе Цмока. Дарэмна сходзіш. Лепш бы ў полі што зрабіў ці тыя ж лапці даплёў... Цмока толькі я магу адужаць.

*Разумны брат.* Ляжы ўжо, дурань, на печы! Куды табе з Цмокам лютым ваяваць? Ён цябе ў пыл сатрэ, мокрага месца ад цябе не пакіне! *(Выходзіць.)*

*Янка ляжыць на печы.*

*Сасноўская.* Многа ці мала часу прайшло — але вяртаецца Разумны брат пабіты, кульгаючы, ні з чым.

*Разумны брат (стогне).* Ох, пабіў мяне пракляты Цмок трохгаловы!.. І да адной яго галавы не змог падступіцца. Мабыць, так і загіне Ганка на чужой зямельцы!

*Янка (пазяхаючы).* Што ж, давядзецца мне ісці.

*Разумны брат.* Куды табе ісці?! У цябе і мяча няма! І даспехаў...

*Янка.* Кашуля, што на мне, — вось мае даспехі. *(Лезе над печ, выцягвае таўкач для бульбы.)* А гэта чым не зброя? Сапраўдная булава!

*Разумны брат.* Дурань ён і ёсць дурань... Шкада мне цябе, усё ж не чужыя! Не хадзіў бы ты, браце, ні за што загінеш! Не перамагчы табе трохгаловага!

*Янка.* Ну, гэта мы яшчэ паглядзім! *(Махае таўкачом над галавою.)*

*Сасноўская.* Доўга ці коратка, але ішоў Янка ў царства злога Цмока тры дні і тры ночы...

*Пакуль Янка ідзе на адным месцы, Мікола — Разумны брат ставіць у канцы сцэны дэкарацыі ўладанняў Цмока: гэта усяго толькі клетка, склееная з кардону. У клетцы — Ганка-Кацяя.*

*Ганка.* Янка, любы, вызвалі мяне адсюль хутчэй!

*Янка.* Здаецца, я чую голас? Нехта заве на дапамогу! Варта паспяшацца!

*На сцэну выбягае трохгаловы Цмок-Віця.*

*Цмок.* А, вось чыім духам запахла! Што ж, давай сілаю мерацца!

*Янка.* Не хачу я з табой, гадзюкай трохгаловаю, злыднем паганым, лютым, нават і размаўляць! Адпусці лепш Ганку і ўцякай адсюль на ўсе чатыры бакі, бо астанешся без галоў!

*Цмок.* Не кажы гоп, пакуль не пераскочыш, не лезь паперод бацькі ў пекла, не хвалі сам сябе, пакуль людзі цябе не пахваляць...

— Віця, спыніўся! — не вытрымала Сасноўская. Яна увесь час закрывала далоняю рот, каб не разрагатацца.

*Цмок з Янкам пачынаюць біцца, наскокваюць адзін на аднаго.*

*Сасноўская.* Тры дні і тры ночы біліся яны. На трэці дзень узмахнуў Янка таўкачом — і ў Цмока адна галава з плячэй далоў. Другі раз узмахнуў таўкачом — і другая далоў. А з трэцяга разу — адляцела і трэцяя адразу! Узяў Янка Ганку за руку, вывеў з клеткі, прывёў дадому і сталі яны жыць-пажываць, дзяцей нараджаць, дабро нажываць, і ніхто іх больш не трывожыў!

*Антон, Каця, Мікола і Віця сталі ў рад побач з Сасноўскаю.*
*Адклаўшы магнітафон, да іх на сцэну паднялася Аксана.*
*Не спускаючы з завуча вачэй, дзеці па чарзе прадэкламавалі:*

*Антон.* Сябры — дарослыя і дзеці!
*Мікола.* Вось вам маральнасці ўрок!
*Віця.* Дабро перамагло, загінуў люты Цмок!
*Аксана (убок).* Хоць «нету повести банальнее на свете»...
*Сасноўская.* На ўсе часы, для ўсіх узростаў!
*Каця.* Бы пакаленням запавет!
*Антон.* Хоць, можа, прымітыўна ўсё і проста...
*Аксана (убок).* Затое ёсць «фальклор» і ёсць «сюжэт».

— Цудоўна! Выдатна! — завуч быў у захапленні. — Гэта акурат тое, што трэба! Я і не сумняваўся, што ўсё ў нас урэшце атрымаецца, — быць нам на першым месцы! Упэўнены — ніхто больш да такога не дадумаецца!..

Самадзейныя артысты ўздыхнулі, як па камандзе, і пачалі прыбіраць са сцэны дэкарацыі.

## Пытанні і заданні да твора

1. Літаратурныя творы можна аднесці да аднаго з трох родаў літаратуры: эпасу, які расказвае пра падзеі, аб’яднаныя у сюжэт; лірыкі якая выяўляе ўнутраны свет асобы праз перажыванне; драмы, якая вырашае канфліктную сітуацыю праз скразное дзеянне. Да якога літаратурнага роду, на вашу думку, можна аднесці твор А. Федарэнкі «Рэпетыцыя»? Абгрунтуйце свой адказ.

2. Якія асаблівасці сюжэтнай будовы твора? Што рухае сюжэт, ці можна назваць яго дынамічным? Заўважце, як выкарыстоўвае аўтар прыём вяртання да пачатку, што робіць больш завершаным і зразумелым аўтарскую задуму.

3. Якім вам уяўляецца старшакласнік Антон? Ці адпавядаюць партрэтныя характарыстыкі Антона і яго сяброў ідэі вобразаў? Якую з прыдуманых Антонам п'есак вы лічыце найбольш удалай? Чаму? Адзнакі якога жанру (сатырычнага, лірычнага, камедыя, гістарычная драма, трагедыя, фарс) маюць гэтыя творы?

***Творчае заданне.*** Паспрабуйце напісаць самі невялікую п'еску для школьнай самадзейнасці і інсцэніраваць яе на занятках факультатыва. Памятайце, што ў аснове п'есы абавязкова знаходзіцца канфлікт — сутыкненне, супярэчнасці паміж персанажамі, якія павінны быць выразна абмаляваны і несці пэўную аўтарскую задумку-ідэю.

# ЛІРЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

***Рыгор Барадулін***

## МАЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА

З суседзямі падзелішся скарынкаю.
Адно не ўмееш з торбаю прасіць.
Як ластаўка,
з падстрэшша рук Скарынавых
Тваё крыляла слова па Русі...

Ты бласлаўляла даланёй кляноваю
Сваіх сыноў.
Слязамі дабяла
Бяліла лён на світку Каліноўскаму
І ў сны Ўрублеўскага, ты Нёманам плыла...

Люблю цябе
у веснавых пратацінах,
У белай хустцы маладых снягоў.
Як на грыбы,
багата ты на таленты —
Пільней глядзі і нерушы знаходзь.

Радзі, зямля,
ты — шчодрая і сціплая.
Каб толькі маразоў не знала рунь!

Імя тваё нашчадкам
з нетраў выплыве —
Сівых стагоддзяў рэха:
— Бе-ла-русь!..

1. Якой паўстае з верша Беларусь?

2. Якое разгорнутае ўвасабленне ўжывае паэт, каб больш яскрава стварыць воблік Радзімы?

3. Што вы ведаеце пра слаўных сыноў Беларусі, імёны якіх называюцца ў вершы?

4. Якія словы са значэннем колеру нагадваюць у вершы пра назву нашай зямлі?

5. Як падрэслена ў вершы таленавітасць беларускага народа, яго годнае месца сярод іншых народаў? Якія радкі найлепш перадаюць надзею на будучае?

6. Чаму апошняе слова верша вылучана ў асобны радок і падзелена на склады?

7. Прачытайце гэты верш так, нібы вы знаходзіцеся на сцэне перад запоўненай святочнай залай. Ваш голас павінен гучаць узнёсла і ўрачыста, перадаючы гордасць за сваю Радзіму.

***Пятрусь Броўка***

## ЯК ЛІСТ ДУБОВЫ…

Не страшна мне
Ні твань, ні багна,
Ані віхуры гул і свіст —
Я за жыццё схапіўся прагна,
Як за галлё
Дубовы ліст.

Па восені,
Мядзяны, дужы,
Між хмурай стыні ён гарыць…

Трасуць яго вятры і сцюжы,
А ён адно ў адказ —
Звініць.

Калі зімой
Мятлюга грае
І злосна шчэрыцца мароз,
Ён, як далонню, прыкрывае
Галінку тую,
Дзе прарос.

І толькі ў ясны дзень
Вясновы,
Калі красуе ўсё вакол —
Перад лістком зялёным, новым
Ён ціха падае
На дол.

1. Чаму верш названы не «Ліст дубовы», а «Як ліст дубовы…»?

2. Знайдзіце ў вершы словы са значэннем колеру і гуку. Як яны дапамагаюць вам уявіць асноўныя вобразы верша, зразумець яго настрой?

3. Што дало падставу аўтару параўнаць жыццё лірычнага героя з лёсам дубовага лістка?

4. Параўнайце верш П. Броўкі «Як ліст дубовы…» і народную песню «Бяроза з лістом…».

**О́да** (грэч. *ōidē* — песня) — урачысты, паэтычны верш у гонар нейкай гістарычнай падзеі або выдатнай асобы. У старажытнай Грэцыі, дзе ўзнік гэты жанр, одай называлі любую лірычную песню, вясёлую ці сумную, якая выконвалася хорам падчас танцаў. Паступова оды набылі ўсхваленчы пафас: яны праслаўлялі багоў, герояў, пераможцаў алімпійскіх гуль-

няў. У сучаснай паэзіі аўтары рэдка ўжываюць слова «ода» для вызначэння жанру сваіх твораў, пазбягаючы высакапарнасці, якая часам звязваецца з гэтым словам, аднак многія ўзнёслыя вершы ў гонар Радзімы, напрыклад, выдатны твор У. Караткевіча «Беларуская песня», па сутнасці з’яўляецца одай. Да гэтага жанру адносіцца і верш Р. Барадуліна «Мая Бацькаўшчына».

### *Яўгенія Янішчыц*

* * *

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві —
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі
Там, дзе выбеглі ўдаль канавы.
Пачынаецца ўсё з любві —
Адчужэнне, і боль, і нянавісць.
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

1. Гэты верш паэтэса напісала калі яшчэ была школьніцай. Які сэнс яна ўкладвала ў слова «любоў»?
2. Якое значэнне, на вашу думку, мае для чалавека каханне?
3. Якую ролю ў вершы адыгрываюць паўторы?

### *Адам Русак*

## *ДЗЕ ТЫ, ЗОРКА МАЯ?*

Дзе ты, зорка мая прамяністая,
За якія ты хмары скацілася?
Дзе ты, радасць мая залацістая,
На якой ты сцяжынцы згубілася?

Я шукаю цябе, углядаюся
У нябесныя далі высокія.
Без цябе мне дарога не ясная,
Што ляжыць у прасторы далёкія.

Дзе ты, зорка мая непагасная,
За якімі ты скрыта аблокамі?
Узыдзі, засвяці, зорка ясная,
Шчасцем сэрцу майму адзінокаму.
Дзе ты?

1. Да якога віду лірыкі адносіцца верш паводле сваёй тэмы?

2. Чаму і ў назве, і ў пачатку, і ў самым канцы верша паўтараецца адно і тое ж пытанне? Што мае на ўвазе паэт, калі шукае, кліча сваю зорку? Ці можна назваць гэты вобраз сімвалічным?

3. Якое значэнне ў жыцці лірычнага героя мае каханне? Якія словы аб гэтым сведчаць?

4. Якія эпітэты адшукаў паэт, каб перадаць свае адносіны да каханай? Які кампазіцыйны прыём дапамагае нам вылучыць гэтыя словы, звярніце на іх асаблівую ўвагу?

5. Звярніце ўвагу на тое, якія словы рыфмуюцца ў вершы. Колькі складоў у словах, аб'яднаных рыфмай, гучаць аднолькава? Як такая глыбокая рыфма адбіваецца на гучанні верша, яго мелодыі?

6. Праслухайце песню на верш А. Русака «Дзе ты, зорка мая?». Як адпавядаюць у ёй музыка і словы?

7. Прывядзіце прыклады вядомых вам песень-рамансаў.

***Раманс*** — (іспан. *romance*, ад познелацінскага *romance* — па-раманску) — адзін з жанраў песні; невялікі лірычны верш (пераважна пра каханне) напеўнага характару.

***Творчае заданне.*** Дапішыце апошні радок верша Максіма Танка:

***Максім Танк***

* * *

Ты яшчэ толькі намёк на чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на маці;

Ты яшчэ — чвэрць чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на дружбу;

Ты толькі — паўчалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на любоў, —

І толькі тады становішся чалавекам,
. . . . . . . . . . . . . . .

Абавязкова знайдзіце гэты верш і параўнайце яго з вашымі спробамі.

# «ЦВЁРДЫЯ» СТРАФІЧНЫЯ ФОРМЫ

***Актава*** (ад лац. *octava* — восьмая) — васьмірадковы верш, радкі якога часцей за ўсё пішуцца пяцістопным або шасцістопным ямбам і рыфмуюцца па схеме абабабвв. Завяршаюць актаву два радкі, звязаныя сумежнай рыфмоўкай.

***Рандо*** (фр. *rondeau*, ад *rond* — круглы) — старафранцузскі верш з васьмі, трынаццаці або пятнаццаці радкоў, звязаных дзвюма скразнымі рыфмамі. Словы, якімі пачынаецца рандо, паўтараюцца ў сярэдзіне твора і заканчваюць яго.

***Санет*** (іт. *sonette*, ад *sonare* — гучаць, звінець) — форма лірычнага верша з 14 радкоў, у якім радкі звычайна рыфмуюцца ў пэўным парадку (абба абба ввг дгд). Санет дзеліцца на дзе часткі: у першых дзвюх строфах развіваецца тэма, у наступных — робіцца вывад. Санеты пішуцца ямбам.

***Танка*** (у японскай паэзіі) — манастрафічны пяцірадковы нерыфмаваны верш. У першым і трэцім радках па пяць складоў, у астатніх — па сем.

***Трыялет*** (фр. *triolet*, ад іт. *trio* — трое) — від васьмірадковага верша, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і чацвёрты радкі аднолькавыя. Першы радок паўтараецца тройчы (адсюль і назва). Трыялет мае дзве рыфмы.

***Хоку*** (у японскай паэзіі) — трохрадковы верш без рыфмы. У першым і трэцім радку павінна быць пяць складоў, у другім — сем. Звычайна хоку мае прыродаапісальны або філасофскі змест і намёк на пару года.

*Максім Танк*

## САНЕТ

У век наш рэвалюцыйны, штармавы,
Калі ідзе перабудова свету.
Калі імкнуцца ў космасе ракеты
На рэактыўных крылах агнявых, —

Пад ветразем лірычнай сінявы
Задумаў я, як даўнія паэты,
Адправіцца на караблі санета
На дальнія сузор'яў астравы.

Не верце, што я ажыццяўлю
Намер свой і вярнуся на зямлю,
Што вытрымаюць ветразі і ванты?

Наіўныя! Мой карабель-санет
Калісьці збудаваў вялікі Дантэ,
А сам Шэкспір на ім адкрыў сусвет.

1. Прачытайце санет М. Танка і адкажыце, чаму і сёння паэты вельмі часта выкарыстоўваюць гэтую класічную форму.

2. Праверце, ці адпавядае будова «карабля», на якім М. Танк адпраўляецца ў мора Паэзіі, класічным законам санета.

*Максім Танк*

## АНТЫСАНЕТ

Што сваёй Музе рупнай, працавітай
Я падару на схіле сваіх лет?
Мо з дрэва райскага прынесены ранет,
Пярсцёнак Палікрата срэбраліты?

Мо чару, поўную вясновага блакіту,
Ці нейкіх кветак палявых букет,
А мо гарэзу прыбяру ў санет —
У вопратку багіняў старажытных?

Як гэты вабны ўбор да твару ёй!
Чаму ж не радуешся, дарагая?
— Як мне ў ім дзіцянё карміць, не знаю,

Як працаваць і цешыцца з табой,
Калі санет твой грудзі і стан мой
Чатырнаццаццю клямрамі сціскае.

1. Музай старажытныя грэкі называлі німфу, якая дае натхненне паэту. Якой жа малюе паэт сваю Музу?

2. Чаму, на вашу думку, паэт гаворыць, што санет сціскае грудзі і стан Музы «чатырнаццаццю клямрамі»?

3. Растлумачце назву твора.

4. Дакажыце, што гэты твор адносіцца да сатырычна-пародыйных жанраў лірыкі

***Творчая работа.*** Напісанне трыялета па апорных радках, санета ці хоку.

***Янка Сіпакоў***

## *МАКСІМ, ЯЛТА І КІПАРЫСЫ*

1. Ён навучыў, здаецца, гаварыць
2. Па-беларуску нават кіпарысы.
3. ……………………………………
4. Ён навучыў, здаецца, гаварыць.
5. .............................................
6. ……………………………………
7. Ён навучыў, здаецца, гаварыць
8. Па-беларуску нават кіпарысы.

# ЭПІЧНЫЯ ЖАНРЫ

*Алесь Бадак*

## АДЗІНОКІ ВАСЬМІКЛАСНІК ХОЧА ПАЗНАЁМІЦЦА
*Аповесць*

### 1

Я стаяў на аўтобусным прыпынку, і злева ад мяне пахла вёскай, а справа — горадам. Злева стаялі драўляныя хаты з агародамі, на якіх ужо ўсё выбралі і цяпер палілі ссохлы бульбоўнік. Справа ціснуліся адзін да аднаго панэльныя і цагляныя дамы. Я думаў пра тое, што чалавек, які свае першыя сямнаццаць гадоў пражыў у маленькай вёсцы, а потым столькі ж часу — у сталіцы, наступныя сямнаццаць гадоў найбольш камфортна павінен адчуваць сябе ў такім вось невялікім гарадку, дзе ў роўнай ступені можна адначасова быць і гараджанінам, і вяскоўцам. Гэтая думка так захапіла мяне, што, здавалася, ужо не яна жыве ўва мне, а я ў ёй, не бачачы, што ў гэты момант адбываецца навокал.

Таму я нават не заўважыў, з якога боку яна падышла — з таго, адкуль пахла вёскай, ці з таго, адкуль пахла горадам. Я пазнаў яе адразу, хоць мінула ўжо дваццаць гадоў, як мы не бачыліся. Не скажу, што за гэты час яна зусім не змянілася, але я столькі разоў успамінаў яе, і ўсе гэтыя гады яна паступова старэла, таму што нашы думкі, як вядома, з часам таксама старэюць. Мы глядзелі адно аднаму ў вочы, і па яе вачах я зразумеў: яна таксама пазнала мяне, але гэта не прынесла ёй ніякай радасці.

— Добры дзень, — сказаў я і адчуў, як скура на маім твары расцягваецца ў блазенскай усмешцы. Мне заўсёды здаецца, што калі я, у прыступе хвалявання, альбо адчуваючы сваю віну, усміхаюся некаму, у мяне атрымліваецца блазенская ўсмешка. Цікава, ці такой жа ўспрыняла яе тая, каму я ўсміхаўся? — Вы мяне пазналі?

(Калі б я ведаў, што захачу гэты наш з ёю дыялог — слова ў слова — уключыць у сваю аповесць, то, несумненна, прыдумаў бы больш арыгінальнае пытанне).

— Пазнала, — сказала яна дастаткова суха, каб зразумець, што нават праз дваццаць гадоў не хоча рабіць выгляд, быццам ёй прыемна мяне бачыць.

— Відаць, вы на мяне тады моцна пакрыўдзіліся, і не можаце дараваць па сённяшні дзень...

— Я вас тады ўзненавідзела.

Здавалася, цэлых дваццаць гадоў яна чакала моманту, каб кінуць мне ў твар усяго чатыры словы. Але я крыху памыліўся, гэтага ёй было мала. Яна адвяла позірк і дадала:

— І думаю, з таго часу мала што змянілася ў маіх адносінах да вас.

Да прыпынку, на якім мы стаялі толькі ўдваіх, падышоў гарадскі аўтобус, «лазік» — адзіны на ўвесь райцэнтр.

Яна спакойна, з пачуццём уласнай годнасці ўвайшла ў аўтобус, відавочна, упэўненая, што я не зайду следам. Старэнькі «лазік» цяжка крануўся з месца, аддаляючы ад мяне маю школьную настаўніцу біялогіі, якую я не бачыў дваццаць гадоў. Як вядома, калі, вяртаючыся ў думках у сваё мінулае, усіх, з кім тады сутыкаліся, мы можам візуальна ўспомніць, то саміх сябе можам толькі ўявіць. Але паколькі нашы ўяўленні больш абапіраюцца на фантазіі, чым на рэальныя падзеі, то і даверу ім асаблівага няма. Не, я, напрыклад, не сумняваюся, што дваццаць адзін год таму менавіта Сяргея Васілевіча, вучня восьмага класа Федзюковіцкай сярэдняй школы, напачатку верасня тэхнічка злавіла ў гардэробе за

руку, калі гэтая рука была засунута ў кішэню паліто яго аднакласніцы Наташы Грынкевіч. Але мне з кожным годам усё цяжэй верыць, што тым Сяргеем Васілевічам быў я.

І калі я, перабіраючы фотаздымкі таго часу, гляджу — вочы ў вочы — на сябе самога, мне міжволі здаецца, што той Сяргей і зараз жыве там, у часе, які застаўся на фота. І мы нічога не ведаем пра цяперашняе жыццё адно аднаго, і, можа быць, у гэтыя хвіліны ён таксама ўспамінае сябе ранейшага, і, магчыма, якраз такім, якім я сябе ўжо не памятаю. Таму нават у сваіх успамінах мы з ім пражываем розныя жыцці, нібы зусім чужыя адно аднаму. Хоць каму, як не мне, да драбніц ведаць рысы яго характару, яго самыя інтымныя мары і жаданні. Каму, як не мне, ведаць, **што** дваццаць гадоў таму ён рабіў у школьным гардэробе, калі яго з рукой, засунутай у кішэню курткі Наташы Грынкевіч, убачыла тэхнічка, пра што да сённяшняга дня я нікому ніколі не расказваў, нават самой Наташы.

Віной усяму была яго ўлюблівасць — адна з праяў незвычайнай адчувальнасці да прыгажосці ўвогуле. І калі аднойчы на ўроку геаграфіі яго класная сказала яму: «Сярожа, ну хіба можна піхаць дзяўчынку? Ты паглядзі, якая яна прыгожая!», ён кінуў позірк на сваю суседку па парце, Наташу Грынкевіч, і пагадзіўся, што яна і праўда вельмі прыгожая. Праз тыдзень ён ужо бачыў яе не толькі ў школе, але і ў снах, а праз паўгода ён амаль што стаў яе ўласнасцю, нават не здагадваючыся пра гэта.

Ён сяк-так пражыў летнія канікулы без яе, а напачатку верасня адбылася тая непрыемная гісторыя ў гардэробе.

Пачатак верасня быў дажджлівым, і нават старшакласнікі хадзілі ў школу ў верхнім адзенні. Яна другі год насіла сінюю балоневую куртачку з капюшонам, некалі велікаватую, а цяпер, наадварот, кароткую ў рукавах. У восьмым класе ўжо кожны сам вырашаў, з кім яму сядзець за адной партай. Вядома, ён хацеў бы зноў сядзець з ёю і знарок зайшоў у клас апошнім з хлапцоў, спадзеючыся, што яны да гэтага часу разаб’юцца

па парах, але яго месца ўжо заняла Іра Скакун. Канечне, ён захацеў нерэальнага і дакараў сябе за тое, што, наадварот, не зайшоў у клас першым, каб хоць паспрабаваць заняць месца на суседняй парце: цяпер і гэта было немагчыма.

Калі ён праходзіў міма, іх позіркі сустрэліся, яна яму ўсміхнулася, ад чаго на сэрцы стала хораша, але адначасова і яшчэ больш сумна. У яго кішэні была жменька карамелек. Спачатку ён думаў проста пачаставаць яе, але, пакуль цягнуўся ўрок, яму ў галаву прыйшла ідэя: ён непрыкметна пакладзе цукеркі ў яе куртку. Яна знойдзе іх па дарозе дадому і, вядома ж, здагадаецца, хто іх туды паклаў, і назаўтра пры сустрэчы яны зноў усміхнуцца адно аднаму, толькі больш загадкава, бо цяпер паміж імі будзе адна маленькая таямніца. І тады ён зноў пакладзе ей у кішэню цукеркі, а лепей, штонебудзь іншае, таксама смачнае, ці проста прыемнае, каб гэта зноў стала для яе нечаканасцю. Толькі што? І дзе яго ўзяць, калі пра іх сям'ю гаварылі, што яны ў сне больш наядаюцца, чым вечарам за сталом.

На перапынку ён збег з трэцяга паверха ўніз, у гардэроб і, узрадаваны, што там нікога не было, знайшоў яе сінюю балоневую куртку і сыпануў у кішэню ўсе свае карамелькі. І толькі пасля гэтага падумаў, што адна карамелька была без абгорткі, што ад яе можа зліпнуцца кішэня. Ён хутчэй засунуў руку назад, каб дастаць яе, але... цукерак там не аказалася. У кішэні была досыць вялікая дзірка, якая імгненна праглынула іх, не зважаючы на тое, у абгортках яны ці без. Ён сунуў руку ў гэтую нябачную пашчу: вось адна цукерка, другая, трэцяя... Колькі іх было ўсяго? І тут ён пачуў за спіной голас тэхнічкі:

— Ты што гэта па чужых кішэнях лазіш?!

Ён цярпець не мог тэхнічку, настолькі маленькую, што яе бруднай анучы для мыцця падлогі не баяліся нават першакласнікі, і, разумеючы, што нізавошта не скажа ёй праўду, быў прыніжаны тым, што менавіта яна ўбачыла яго тут і лічыць

злодзеем. Самае страшнае, калі яна ведае, чыя гэта куртка, і зараз усё раскажа Наташы. Але тэхнічка сказала:

— А ну, пайшлі да дырэктаркі!

Ён адчуў палёгку. Дырэктарка наўрад ці паверыць, што ён злодзей, хоць і ёй сказаць усю праўду ў яго не хопіць смеласці.

## 2

Робячы чалавеку зло, мы вінаватыя перад ім да таго часу, пакуль ён пра гэта памятае, але адчуваем сябе вінаватымі, пакуль памятаем пра гэты ўчынак самі. Зло — грэх, але калі перад Богам мы замольваем свае грахі малітвамі, то на зямным судзе памяць — адзіны суддзя, і яна ж — адзіная мера віны. Прычыніце чалавеку боль, а потым двойчы зрабіце яму дабро: ён даруе вам, але пакуль будзе памятаць пра прычынены боль, вы будзеце перад ім вінаватыя.

Вядома, думаў я, стоячы на аўтобусным прыпынку, усё яшчэ аглушаны апошнімі словамі маёй былой настаўніцы, толькі той, хто крыўдзіць, бачыць розніцу паміж крыўдай, прычыненай ад кахання, і крыўдай, прычыненай ад нянавісці. Але няўжо тое кепскае, што я зрабіў Танечцы, за дваццаць гадоў не толькі не забылася, а ўсё яшчэ прымушае яе ненавідзець мяне? Кожнай віне ёсць свая цана, але нянавісць — цана занадта вялікая.

І тут мне ў галаву прыйшла ўратавальная думка: унутрана, недзе нават падсвядома, я лічыў, што Танечка мусіць мне ўсё даравацт таму, што я, яе вучань, стаў даволі вядомым чалавекам, якім настаўнікі павінны ганарыцца. Але аказалася наадварот: чым большай была мая вядомасць, тым больш яе гэта раздражняла. Мы не бачыліся дваццаць гадоў, і ўсе гэтыя дваццаць гадоў я заставаўся тым, хоць і закаханым, але непаслухмяным і часта даволі нахабным у сваіх паводзінах перад ёю вучнем.

Сёння я прыехаў у горад, каб знайсці свайго аднакласніка, які запрасіў мяне выступіць у школе, дзе ён працаваў настаўнікам. Мне хацелася папярэдне абгаварыць з ім нюансы гэтага выступлення, якое было не зусім звычайным: у яго класе здарыўся надзвычайны выпадак, і замест таго, каб гэтым займалася калі не міліцыя, то якая-небудзь камісія па справах непаўналетніх, павінен буду займацца я. Смешна, хоць і прыемна, што недзе яшчэ разлічваюць на тое, што пісьменніцкае слова можа мець нейкую вагу і нешта вырашаць. Тыдзень таму я выступаў у адной з мінскіх школ і расказваў васьмі... — проста містыка нейкая! — васьмікласнікам пра добрае, чыстае, вечнае, а пасля, ужо на школьным ганку, дзяўчынка, якая паўгадзіны таму, седзячы за пярэдняй партай, уважліва слухала мае вершы, падышла да мяне і папрасіла закурыць. Не ведаю, можа, сёння васьмікласнікі просяць закурыць і ў настаўнікаў, і наадварот — настаўнікі ў васьмікласнікаў. Я не ведаю сучасную школу, асабліва старэйшыя класы, таму не люблю перад імі выступаць. Нават крыху баюся іх, бо не ўяўляю, як перад імі трымацца, што ім гаварыць. І зусім не ведаю, што буду гаварыць заўтра...

Я думаў так, стоячы на аўтобусным прыпынку, і ад гэтых думак нават пачаў крыху раздражняцца, разумеючы, што віною таму — Танечка.

Я вырашыў не ісці ў горад, а пехатой вярнуцца дадому, у сваю вёску, да якой было чатыры кіламетры. Я баяўся, што ў горадзе выпадкова магу зноў сустрэцца з Танечкай, чаго б мне цяпер больш за ўсё не хацелася. Я ведаў, што ўжо ніколі не буду ўспамінаць пра сваё каханне да яе з той пяшчотай, як гэта было заўсёды. А значыць, сёння яна дамаглася куды большага, чым, напэўна, хацела.

Я падумаў пра васьмікласніка, якога павінен быў заўтра, падчас свайго выступлення, асудзіць, і мне раптам стала шкада яго, хоць мы былі зусім незнаёмыя.

— Тут адзін васьмікласнік хацеў настаўніцу з дапамогай інтэрнэта шантажыраваць, — сказаў мой былы адна-

класнік па тэлефоне, запрашаючы мяне прыехаць выступіць у школе.

— Ого, — засмяяўся я, — шантаж з выкарыстаннем найноўшых тэхналогій! Відаць, здольны хлопчык. Можа, ён, калі вырасце, стане знакамітым праграмістам?!

— Усё не так проста. Настаўніца напісала заяву на звальненне.

Я ішоў дадому па ўзбочыне дарогі, па якой у дзяцінстве хадзіў так часта, што цяпер непазбежна патрапляў у свае сляды.

Я думаў пра хлапчука, якому заўтра павінен буду нешта гаварыць пра мараль і добрыя паводзіны ў школе.

У сваім уяўленні я маляваў яго партрэт, які, у выніку, чамусьці аказаўся копіяй майго школьнага партрэта, вядомага мне па старых фотаздымках. Русыя, крыху непаслухмяныя валасы, за якімі амаль не відаць вушэй, нос крыху кірпаты, вялікія вочы. Толькі ён, вядома, у адрозненне ад мяне, заўсёды пры грашах, раз у восьмым класе мае мабільнік з фотакамерай.

Я паспрабаваў уявіць, як гэта ўсё адбылося.

Сёлетні верасень быў цёплы, і яна прыйшла ў школу, апранутая даволі лёгка. Ёй дваццаць тры гады, і яна пакуль ніяк не можа прывыкнуць да строгіх касцюмаў, хоць дырэктар аднойчы ўжо, магчыма, і зрабіў ёй заўвагу. Зрэшты, дырэктар таксама мужчына, і яшчэ не стары — яму толькі крыху за сорак.

Яна зайшла ў клас, абвяла васьмікласнікаў уважлівым, крыху напружаным ад хвалявання позіркам, якое старалася схаваць ад класа за сваёй усмешкай.

— Добры дзень.

Усе ўсталі, апроч яго.

— Ого, — разглядваючы яе з ног да галавы, сказаў ён дастаткова гучна, каб яна пачула.

Магчыма, гэта было па-дзіцячы выказанае захапленне, якое яна прыняла за фамільярнасць.

Ён сядзеў, крыху адкінуўшыся на спінку парты, і яна адразу зразумела, што з ім будзе цяжэй, чым з кім, асабліва калі яна не паставіць яго на месца адразу, з першага урока.

— На жаль, мяне не папярэдзілі, што ў восьмым класе ёсць калека, які не можа падняцца, калі заходзіць настаўнік.

Напэўна, трэба было адрэагаваць на яго ўчынак неяк па-іншаму, падумала яна. Вось так: «Спадзяюся, гэтаму маладому чалавеку гэтак жа не будзе хацецца ўставаць з-за парты, калі празвініць званок на перапынак!» А можа, на першы раз увогуле трэба было зрабіць выгляд, што яна нічога не заўважыла.

— А яго ў радзільным доме выпусцілі з рук!

Яшчэ адзін паяц, падумала яна, адшукаўшы вачыма на «галёрцы» яго сябрука: у кожнага «героя» ёсць такія «зброяносцы», якім яны дазваляюць так выказвацца пра іх узамен за верную службу. З імі якраз даволі проста, яны падсвядома адчуваюць свае другасныя ролі не толькі на вуліцы, але і на ўроку ў адносінах з настаўнікамі.

— Сядайце, — сказала ўсяму класу і тут жа звярнулася да яго: — А вас, малады чалавек, я ўсё ж прашу ўстаць і выйсці. Да дошкі.

— А што мне там рабіць? Нам жа яшчэ нічога не задавалі, — здзівіўся ён.

— Паверце, я знайду для вас работу.

Ён выходзіў упэўнена. Двойку яна яму ўсё роўна не паставіць, гэта факт — яны яшчэ не праходзілі ніводнай тэмы, а больш яму баяцца няма чаго.

— Скажы, калі ласка, якія творы беларускай літаратуры ты прачытаў за лета?

— А нам нічога не задавалі.

— Ну, ты не спяшайся адказваць за ўсіх. Табе не задавалі, а ўсім астатнім, можа, якраз і задалі.

— Тады ў іх і пытайце.

— Я спытаю. Але мне хацелася б ведаць, наколькі ты цікавішся літаратурай, што чытаеш, ці запісаны ў гарадскую бібліятэку.

— Я чытаю ў інтэрнэце. Кніга ўвогуле хутка сваё аджыве.

— Вось як. Ну, і што ж ты чытаеш у інтэрнэце?

— А ён не чытае, а карцінкі ўсялякія глядзіць!

Зноў голас таго кірпатага. Яна ўжо вызначыла гэта, не паварочваючы ў той бок галавы.

— А ў інтэрнэце няма беларускай літаратуры.

— Няўжо? Нават Купалы і Коласа?

Ён адразу не знайшоўся, што адказаць, бо, сапраўды, ніколі не трапляў на сайты, прысвечаныя беларускай літаратуры, але, з іншага боку, ён не раз чуў, што ў інтэрнэце ёсць усё.

Яна не магла не скарыстаць гэтаю паўзу.

— Запомні: для таго, хто хоча мысліць, хто хоча стаць больш разумным, інтэрнэт незаменны памочнік, а гультаям ён толькі шкодзіць. Сядай! — І, не чакаючы, пакуль ён сядзе: — Ну, хто з класа ўсёткі знайшоў летам час, каб узяць у рукі кнігу?

Яна закранула яго самалюбства. Калі б ёй было сорак ці пяцьдзесят, ён усё гэта ўспрыняў бы як належнае, але ёй было дваццаць тры, па ўзросту яна магла б быць яго старэйшай сястрой, а старэйшых сясцёр у восьмым класе ўжо не хочацца слухацца. Да таго ж, яна была прыгожая, ён яшчэ не ўсведамляў, што менавіта гэта прымушае яго больш за ўсё раздражняцца.

Яго ўжо не цікавіў урок. Ён не слухаў сваю аднакласніцу, якая, выйшаўшы да дошкі, бойка расказвала, што чытала летам, і было падобна на тое, што яна прачытала ўсю сусветную класіку, можа, нават да канца не разумеючы, якую вялікую паслугу ў гэты момант робіць новай настаўніцы. Тая з цікавасцю яе слухала, унутрана ўжо гатовая да таго, што дзяўчынка зараз пачне на памяць чытаць ёй вершы Купалы, якія яны будуць праходзіць яшчэ праз некалькі месяцаў. Яна

павярнулася ў крэсле да яе ўсім корпусам, не ўсведамляючы, што цяпер яе калені, не прыкрытыя кароткай спаднічкай, глядзелі ў яго бок, і ён ва ўсе вочы глядзеў на іх з першага ад дзвярэй рада, а пасля, непрыкметна для яе, дастаў з кішэні мабільнік.

У гэты момант я таксама глядзеў на яе — але і твар, і валасы, і грудзі, і рукі, і калені ў яе былі Танеччынымі. Яна быццам вырашыла пераследаваць мяне паўсюль, пачаўшы з таго, што прымала вобраз жанчын, якіх я маляваў у сваім уяўленні, але пагражаючы з часам замяніць сабою жанчын рэальных.

Хоць, па-шчырасці, яна пераследуе мяне з таго часу, як....

## 3

…з таго часу, як, адчуваючы, што ў яго гараць шчокі, прычым, чамусьці правая пякла больш, а левая менш, быццам па правай якая-небудзь дзяўчына наводмаш ударыла далонню, а ў левую пацалавала, Сяргей Васілевіч падымаўся на другі паверх, у кабінет дырэктаркі, а следам за ім ішла тэхнічка.

Дырэктарка сядзела за сталом, а побач з ей стаяла незнаёмая яму дзяўчына. Спыніўшыся ў дзвярах, ён, забыўшыся на тое, што пяць хвілін назад здарылася ў гардэробе, заварожана глядзеў на яе, глядзеў, і разам з тым не бачыў, таму што хацеў ахапіць позіркам за раз яе ўсю — ад залацістых валасоў, што ледзь краналіся плячэй, да ног, вышэй каленяў схаваных пад белай спаднічкай. У кабінеце стаяў пах духоў, якога ў іх школе раней ніколі не было, іначай ён бы яго абавязкова запомніў

— Міхайлаўна, прабачце, вось прывяла злодзея. У гардэробе лазіў па чужых кішэнях.

Яму трэба было нешта гаварыць, апраўдвацца, але нехта нябачны схапіў яго за горла так моцна, што стала цяжка дыхаць. Апускаючы вочы, каб не сустрэцца з ёй позіркам, ён

усё ж паспеў убачыць на яе твары здзіўленне і нават, як яму здалося, пагарду. Ён маўчаў, спадзеючыся, што дырэктарка скажа: «Гэтага не можа быць!», і тады ён з палёгкай уздыхне і, можа нават усміхнуўшыся, пацвердзіць: «Гэта няпраўда. Я ніколі ні ў кога нічога не краў».

Але дырэктарка сказала:

— Добра, мы потым пра гэта пагаворым. Ідзіце, пара ўжо званіць на ўрок.

— Ой, божачкі, і праўда! — усклікнула тэхнічка і выбегла з кабінета. Пра пачатак і канец урока яна абвяшчала, становячыся на зэдлік, які кожны раз прыносіла са свайго пакойчыка, і націскаючы на кнопку званка, што тырчэла ў сцяне калідора на першым паверсе, паміж вялікімі карцінамі мясцовага мастака і настаўніка малявання Івана Раманавіча Шакуры. Яго карціны віселі на ўсіх паверхах. Гэта былі пейзажы, на якіх навакольныя палеткі, лясы і вёскі ўгадваліся з цяжкасцю, у пэўнай ступені застрахоўваючы аўтара ад самапаўтораў у мастацтве. Ён спрабаваў пісаць партрэты знакамітых пісьменнікаў, але пасля таго як нават настаўніца беларускай літаратуры не адразу прызнала на яго партрэце Янку Купалу Івану Раманавічу (за вочы — проста Раманавічу) давялося задавольвацца маляваннем адных пейзажаў.

Празвінеў званок. Другім урокам у восьмым класе была біялогія.

— У нас новая біялагіца, маладая, — сказала Ларыса Шацько, якая ведала ўсё пра ўсіх настаўнікаў, таму што яе маці ў Федзюковіцкай школе вяла пачатковыя класы.

Пра тое, што Алачка, папярэдняя настаўніца біялогіі, летам у свае трыццаць нарэшце выйшла замуж і пераехала да мужа ў Баранавічы, ведалі многія. Яе ўсе вучні любілі — у тым ліку і за тое, што на кантрольных давала магчымасць спісваць, што не ставіла двойкі за нязробленае дамашняе заданне — замест яе ставіла ў класным журнале кропачку, і гэта азначала, што яна абавязкова выкліча на наступным уроку.

Зразумела, з-за гэтага яе прадмет у многіх у школе быў запушчаны, таму цяпер усе з трывогай чакалі, як павядзе з імі новая настаўніца.

Хвіліны праз дзве пасля званка дзверы класа расчыніліся, і паступова кабінет пачаў напаўняцца пахам духоў, які дагэтуль тут нікому не быў знаёмы.

— Добры дзень, — сказала дырэктарка, і клас устаў дружна, за выключэннем аднаго вучня, які падняўся не адразу і вельмі неахвотна.

— З гэтага года ў вас будзе новая настаўніца біялогіі. Завуць яе Таццяна Антонаўна.

— Добры дзень. — У новай настаўніцы быў хоць і ціхі, але дастаткова ўпэўнены голас.

Калі дырэктарка выйшла, яна накіравалася да стала, узяла ў рукі класны журнал і сказала:

— Ну што, будзем знаёміцца. Антановіч Света... Пятым па спісе быў Сяргей Васілевіч.

— Здаецца, мы ўжо сёння бачыліся.

Магчыма, у яе голасе і не было ніякай прыхаванай насмешкі, але ён успрыняў гэтыя словы менавіта так.

Яму хацелася як мага хутчэй даказаць ёй, што ён не такі, як яна пра яго думае. На кожны яе ўрок ён прыходзіў старанна падрыхтаваным, але за месяц яна ні разу яго не выклікала. І калі ў адным з кастрычніцкіх нумароў газеты «Піянер Беларусі» надрукавалі цэлую падборку яго вершаў, ён ухапіўся за іх, як за выратавальную саломінку. Ледзь толькі пачаўся ўрок біялогіі, ён разгарнуў газету, усяляк стараючыся прыцягнуць да сябе Танеччыну ўвагу. Нарэшце яна зрабіла яму заўвагу, але праз хвіліну ён зноў стаў шамацець старонкамі, чакаючы, што на гэты раз Танечка загадае пакласці газету на яе стол. І ён зробіць гэта з таемнай радасцю, і пакладзе газету так, каб Танечка, кінуўшы на яе свой позірк, адразу ўбачыла яго прозвішча. Аднак настаўніца, быццам баючыся перадумаць, хутка накіравалася да яго, выхапіла з рук газету і са злосцю парвала яе на шматкі...

## 4

Нягледзячы на тое, што некалі я вырашыў больш нічога не забіраць з вёскі сюды, у Мінск, з таго, што звязана з маім дзяцінствам, у свой апошні прыезд я паклаў у дарожную сумку сшытак па біялогіі для восьмага класа — той самы, у якім некалькі старонак спісаны Танеччынай аўтаручкай, і якой я цяпер пішу гэтыя радкі. Я адвязу сшытак назад, як толькі закончу аповесць: там ён мне больш патрэбны, чым тут. Проста, і ў мастацкім творы рэальныя даты і факты я заўсёды пераправяраю, і калі пішу, што ў кастрычніку ў восьмым класе мы праходзілі па біялогіі тэму «Будова і функцыі галаўнога мозгу», то так яно і павінна было быць насамрэч. Камусьці з чытачоў гэта падасца драбязой, непатрэбшчынай, але абавязкова знойдзецца і той, хто захоча пераправерыць які-небудзь факт, прыведзены ў творы. Можа нават пераправерыць, калі папраўдзе праходзілі тэму «Будова і функцыі галаўнога мозгу» ў восьмым класе ў 1985 годзе. Я павінен думаць і пра гэтага чытача. Дарэчы, якраз гэтую тэму мы праходзілі на ўроку, на якім Танечка на вачах усяго класа парвала газету з вершамі, пад якімі стаяла імя аўтара: Сяргей Васілевіч і назва школы: Федзюковіцкая СШ. Ці можна асуджаць юнага аўтара за тое, што, адчуўшы, як у душы ў яго ўсё закіпае, ён падумаў, што ніколі не даруе ёй гэтага?..

## 6

Гісторыя з газетай здарылася ў пятніцу, а ў нядзелю раніцай ён зайшоў да сваёй аднакласніцы Ларысы Шацько, прыхапіўшы з сабой сшытак па алгебры з рэшанымі на панядзелак задачамі. Ларыса жыла ў былой пачатковай школе, усярэдзіне настолькі перарobленай, што цяпер цяжка было здагадацца, дзе ў ёй раней былі класы, а дзе настаўніцкая. У Ларысы ўжо сядзеў Валік Пранчук — са сваім сшыткам па алгебры. Пакуль яны спісвалі задачы, Сяргей гартаў тэлефонны давед-

нік, шукаючы побач з хатнімі нумарамі і адрасамі знаёмыя прозвішчы: Александровіч, Антановіч, Атрашкевіч... Байкоў, Барадзіна, Барэйша... Гурыновіч, Гурыновіч, Гурэвіч... Варатынец, Васілеўская... Далей тройчы паўтаралася прозвішча Высоцкі, і ў яго на сэрцы нібы пасяліліся адразу тры радасці, бо ў тры разы выраслі шансы на тое, што побач з адным з гэтых прозвішчаў указаны тэлефон Танечкі. Але які?

— Першы, — сказала Ларыса. — А ты што, хочаш пазваніць ёй? Пазваніць? І што ён ёй скажа? Нічога не скажа — проста паслухае яе голас. Ён зняў трубку і адчуў, як хваляванне паступова пагружае яго ў бязважкасць.

Ларыса і Валік перасталі спісваць, яны глядзелі на яго так, быццам ён збіраўся даць нырца з высокага моста ў раку: варта яму перадумаць, і кожны палічыць яго баязліўцам.

Пасля чатырох ці пяці доўгіх гудкоў на тым канцы пачулася кароткае:

— Алё!

За нейкае імгненне ён паспеў падумаць, што дома ў яе зусім не такі голас, як на ўроку, і ў яго было адчуванне, што гэтым голасам яна не гаварыла ў трубку, а шаптала яму на вушка.

Сам не разумеючы, што з ім адбываецца, ён спытаў, крыху тэатральна, панізіўшы голас:

— Гэта Таня?

— Таня, — пасля кароткай паўзы сказала яна. — А з кім я гавару?

— Таня, я хачу з табой пазнаёміцца! Таму што я больш не магу без цябе, не магу кожны дзень бачыць цябе на вуліцы, не знаходзячы прычыны, каб падысці і загаварыць з табой! Мне адзінока без цябе!

Ён гаварыў і баяўся спыніцца, баяўся, што яна чакае паўзы, каб грозна (здзеклівa, раздражнёна — як заўгодна!) сказаць: «Васілевіч, заўтра мы разам пойдзем да дырэктара, і там ты паўторыш тое, што толькі што сказаў мне».

— Можаш гаварыць мне што хочаш, толькі не кладзі трубку. Я і так не рашаўся пазваніць табе цэлы месяц.

Ён не ведаў, што яшчэ гаварыць ёй, і з жахам чакаў яе грознага прысуду. Але яна засмяялася і сказала:

— Малады чалавек, я, між іншым, замужам.

— Тады... тады я ўкраду цябе! — амаль закрычаў ён, ахмялелы ад магчымасці *так* размаўляць са сваёй настаўніцай, і тут жа пачуў праз трубку незадаволены далёкі мужчынскі голас.

— З кім ты гаворыш?

— Не ведаю, напэўна, нехта памыліўся нумарам.

Голас яе таксама аддаліўся, і пасля гэтых слоў у трубцы пачуліся кароткія гудкі.

— Ты што, праўда з Танечкай гаварыў? — недаверліва спытаў Валік. — Афігець. Прыкінь, што было б, калі б яна пазнала твой голас.

Але цяпер, калі ў трубцы чуліся кароткія гудкі, яму раптам так захацелася, каб яна ведала, што гэта ён ёй званіў...

Ён не мог дачакацца яе ўрока. Ён прагна лавіў яе позірк, каб прачытаць у ім хоць маленькі намёк на тое, што яна здагадалася, хто гаварыў з ёй па тэлефоне. Але ў яе позірку чыталася толькі ранейшая гордая абыякавасць.

Ён сядзеў на перадапошняй парце, за яго спіной паміж радамі на перапынку Танечка прынесла і паставіла дыяпраектар. У другой палавіне ўрока яна сказала, што яны будуць глядзець дыяфільм па новай тэме: «Будова сэрца». На класную дошку павесілі белы цыратовы экран, вокны завесілі чорнымі шторамі. Святло дыяпраектара рынулася на экран. Праз шчыліны для цыркуляцыі паветра яно біла ва ўсе бакі, блішчэла маленькімі лужынкамі па бліжэйшых партах. Танечка нягучна каменціравала малюнкі дыяфільма, і голас яе быў вельмі падобны на той, у тэлефоннай трубцы. Яму было цяжка яго слухаць, цяжка было вытрымліваць побач з сабой у прыцемку яе блізкую прысутнасць, калі кожны рух яе суправаджаўся шамаценнем залацістай парчовай сукенкі.

Не зусім усведамляючы, што робіць, ён аўтаручкай вялікімі лічбамі напісаў на левай далоні нумар яе хатняга тэлефона і паклаў руку даланёй угору ў лужынку святла на сваёй парце. Ён не мог бачыць, ці звярнула Танечка ўвагу на яго далонь, ён спрабаваў зразумець гэта па яе голасе, але голас па-ранейшаму быў роўны і спакойны.

— Пранцук, развесь вокны, — сказала Танечка, як толькі закончыўся прагляд дыяфільма, а праходзячы міма яго, дадала такім жа загадным тонам: — А табе, Васілевіч, раю памыць рукі, усё-ткі ты вучышся ў восьмым класе, трэба ўжо ўмець сачыць за сабой.

## 7

Дома, у бацькоўскай хаце, мне не сядзелася. Я ўсё думаў пра Танечку, разумеючы, што не супакоюся, пакуль не буду ведаць прычыну яе нянавісці да мяне.

Пад вечар я пайшоў у суседнюю вёску, куды некалі хадзіў у школу. Неўзабаве пасля таго, як школу пабудавалі (вялікую, у тры паверхі), побач з ёй вырас шматкватэрны дом для настаўнікаў. Не забыліся і пра хлеўчукі ды месца для агародчыкаў. Праходзячы міма, мы, школьнікі, часта бачылі сваіх настаўнікаў у рабочым адзенні, то з вядром у руках, калі ішлі карміць сваю жыўнасць, то з матыкай ці лапатай, калі корпаліся на сваім агародчыку. Не думаю, што толькі ў маёй свядомасці гэтая карціна разбурала вобраз настаўніка, у якім было больш узвышанага, чым зямнога. Хто ведае, можа і маё каханне да Танечкі не было б на мяжы вар'яцтва, калі б я часта бачыў яе не толькі школе — у прыгожым, модным адзенні, але і каля гэтага настаўніцкага дома — у гумовых ботах, у старой спадніцы з хусткай, завязанай вузлом на патыліцы. Але Танечка была не такая, як астатнія мае настаўнікі: жыла ў горадзе, адкуль да школы трэба было дабірацца на прыгарадным аўтобусе, а пасля з кіламетр ісці пешшу, якраз паўз нашу вёску, і не мела сваёй гаспадаркі.

Я націснуў кнопку званка крайняй кватэры. Тут жыла мая школьная дырэктарка, мілая, бяскрыўдная Вольга Міхайлаўна Максімчык. Цяпер яна ўжо была на пенсіі, што рабіла мой візіт да яе не такім бесцырымонным. Па-першае, вечарам ёй не трэба было рыхтавацца да школы, а па-другое, выходзячы на пенсію, людзі пачынаюць жыць больш мінулым, чым цяперашнім, а якраз мінулае ў гэтым доме я і шукаў.

Яна сустрэла мяне з гасціннасцю адзінокага чалавека, паставіўшы на пліту закіпаць чайнік, нават не спытаўшы, ці буду я піць чай. Муж яе некалькі гадоў як памёр, дзеці, двое сыноў, з'ехалі: адзін — у Мінск, другі — у Віцебск. Зрэдку яны наведвалі яе, што ў выніку толькі абвастрала яе пачуццё адзіноты.

— Цябе не пазнаць, — сказала яна, а я ўспомніў, што ўчора нехта гаварыў мне якраз адваротнае. І пэўна што кожны з іх меў рацыю. Але ў адказ я не мог сказаць ёй пра яе самую ні тое, ні другое, таму што і тое, і другое было б няпраўдай, і яна гэта ведала.

Таму я сказаў:

— У вас тут так прыгожа — нібы ў гарадской кватэры.

— На жаль, гэта гаворыць толькі пра тое, што цяпер у мяне шмат лішняга часу. А час не павінен быць лішнім — ён робіць жыццё бессэнсоўным. Ну, а як ты жывеш? Пішаш?

— Пішу. Вось збіраюся напісаць невялікую аўтабіяграфічную аповесць пра школу.

— О, мы тут усе з задавальненнем яе пачытаем.

— Ведаеце, пакуль што я збіраюся пісаць гэтую аповесць толькі для аднаго чытача — для самога сябе. А для аднаго пісаць у шмат разоў цяжэй, чым для тысячы, таму я яшчэ не ўпэўнены, што ў мяне нешта атрымаецца.

— Чаму толькі для самога сябе?

— Мой бацька пабудаваў для іншых шмат дамоў, але больш за ўсё любові і натхнення ўклаў у сваю хату, пабудаваную для сябе самога. Хату, у якую заўсёды хочацца вярнуцца,

як толькі выходзіш на вуліцу і зачыняеш за сабой весніцы. Я таксама хачу напісаць аповесць, якую б, а не чужыя кнігі, мне хацелася ўвесь час трымаць на сваім рабочым стале. Мне шмат хто казаў, што па некалькі разоў перачытваў мае кнігі. Але сам я ніколі да канца не дачытаў ніводнай з іх — я іх памятаю толькі па рукапісах. Гэта як у той прымаўцы пра абутніка, які ходзіць босы.

— А калі аповесць атрымаецца: табе не шкада, што яе не прачытаюць іншыя? У хату, якую пабудаваў твой бацька, таксама заходзяць чужыя людзі.

— Але каб зайсці ў кнігу, яе спачатку трэба набыць, зрабіць так, каб яна стала тваёй уласнасцю. Я ведаю, што калі б мой бацька прадаў сваю хату, ён ужо ніколі б не зайшоў у яе, таму што яна для яго стала б чужой. Як жанчына, з якой расстаешся, і яна дастаецца іншаму. Хто ведае, — засмяяўся я, — калі-небудзь, можа, і я прадам каму гэтую сваю аповесць, каб напісаць лепшую. І ў яе з'явіцца іншы гаспадар, які будзе лічыць яе сваёй.

На кухні засвісцеў чайнік, і мы перапынілі нашу размову.

— Я на днях бачыла Наташу, — сказала Вольга Міхайлаўна, ставячы перада мной на часопісны столік перад канапай колеру марскога пяску паднос з двума кубачкамі чаю і цукерніцай. У нашым класе былі тры Наташы, але я ведаў, якую з іх мае на ўвазе былая дырэктарка.

— Я чуў, у яе нейкія праблемы былі на працы.

— Ну якія праблемы ў бізнесменкі — грошы. Многія нашы вучні займаюцца бізнесам. Вось бачыш, як атрымліваецца: мы іх гэтаму на ўроках не вучылі, універсітэтаў яны ніякіх не заканчвалі, нярэдка таму, што не змаглі паступіць. Але яны сёння зарабляюць у некалькі разоў больш, чым іх настаўнікі... А яна пра цябе часта ўспамінае.

— Я пра яе таксама. Помніце, як тэхнічка прывяла мяне да вас у кабінет і сказала, што я лажу ў гардэробе па чужых кішэнях?

— Помню, а як жа.

— Тады вы сказалі, што потым пагаворыце пра гэта са мной, але так і не пагаварылі.

— Навошта? Я даведалася, чыя куртка табе спатрэбілася, і мне ўсё стала ясна. Ведаеш, у той дзень мы з табой здзейснілі аднолькавае злачынства. Я таксама залезла ў кішэню Наташынай курткі. Праўда, я думала, што знайду там тваю запіску, а знайшла цукеркі. Я пераклала іх у іншую кішэню — без дзіркі. Праўда, у адрозненне ад цябе, я рабіла гэта ў прысутнасці сведкі.

— Тэхнічкі?

— Не, Наташы. Толькі я папрасіла, каб яна ніколі табе пра гэта не гаварыла. Дарэчы, яна стрымала сваё слова?

— Яна мне ніколі нават не намякнула пра гэта.

— Можа, яна і хацела калі табе намякнуць, але ты быў ужо закаханы ў іншую. Я тады яшчэ падумала, што ў табе залішне шмат кахання, якое ты можаш даць жанчыне. Нават больш, чым ёй звычайна трэба. І ў цябе яго заўсёды хоць крышку будзе заставацца для іншых. А ў школьным узросце людзі такога складу характару асабліва шчодрыя на каханне. Таму тады ў маім кабінеце мяне больш хвалявала не тое, што здарылася ў гардэробе — я не сумнявалася, што не здольны на такі ўчынак, — а тое, якімі вачыма ты глядзеў на сваю новую настаўніцу біялогіі.

Мы наблізіліся да самага галоўнага.

— Я кахаў яе вачыма, а не сэрцам, таму змог ацаніць яе знешнюю прыгажосць, але не здолеў убачыць тое, што творыцца ў яе ўсярэдзіне. Магчыма, яна па сённяшні дзень думае, што я злодзей.

— Ну чаму, потым я ёй сказала, што тэхнічка памылілася. Павер, без лішніх падрабязнасцей.

— Але ад гэтага яна не стала ставіцца да мяне лепш. Наадварот, цяпер мне здаецца, яна часам шкадавала, што я не аказаўся злодзеем.

Мне не хацелася расказваць маёй былой дырэктарцы пра сустрэчу з Танечкай на аўтобусным прыпынку, і я не стаў тлумачыць, чаму менавіта так мне цяпер здаецца.

— Тваё каханне да яе было вельмі агрэсіўным. Яна была зусім яшчэ маладая і не ведала, як гэтай агрэсіі супрацьстаяць. На жаль, гэтаму нельга навучыцца ва ўніверсітэце, таму што на кожны канкрэтны выпадак мусіць быць свой падручнік. А пасля, яна была ўжо ў тым становішчы, калі спакой для жанчыны не прывілегія, а неабходнасць. Дарэчы, яна павяла сябе вельмі годна, калі пасля ўсяго, што з ёю здарылася, не ўчыніла ніякага скандалу, не паскардзілася ў райана, а проста перавялася ў іншую школу. Зрэшты, калі б яна была ўпэўнена, што *гэта* зрабілі менавіта вы, хто ведае, як яна сябе павяла б.

— А што з ёй здарылася? — недаўменна спытаў я, адчуваючы, як словы пяском захрасаюць на языку.

— Ты хіба не ведаеш? Яна была на пятым месяцы, калі вечарам вы яе так напалохалі, што ад стрэсу яна ў выніку страціла дзіця.

**8**

Мы расстаёмся з дзяцінствам не тады, калі становімся паўналеткамі, а тады, калі перастаём разумець сэнс учынкаў, якія рабілі ў дзяцінстве. У трыццаць гадоў цягаць дзяўчынак за косы не тое што брыдка (у трыццаць мы часта робім рэчы куды больш брыдкія), проста перастаеш бачыць у гэтым дзеянні ўсялякі сэнс.

З пазіцыі сённяшняга дня тое, што здарылася сакавіцкім вечарам 1985 года, было бессэнсоўным, але хіба яно здарылася б, калі б дваццаць гадоў таму так лічыў васьмікласнік Сяргей Васілевіч? Я разумею, што гэта не служыць яму апраўданнем, але паколькі цяпер у адносінах да яго я з’яўляюся адначасова і суддзёй, і адвакатам, мне гэтак жа цяжка аб-

вінавачваць яго, як і апраўдваць. А калі і абвінавачваць, то разам з ім і яго сябрамі-аднакласнікамі — Валікам Пранчуком і Віцьком Жытко, якія ў той злашчасны вечар былі побач, — на лаву падсудных павінна было б сесці вельмі шмат людзей, як жывых, так і памерлых, калі б іх для гэтай падзеі можна было ўваскрасіць. Вядома, ступень віны пераважнай большасці з іх у выніку была б прызнана мізэрнай, але трэба ўлічыць, што многія з гэтай большасці маглі б праходзіць у якасці падсудных у вельмі многіх падобных справах. А яшчэ невядома, што горш: быць крышку вінаватым тысячу разоў, ці вельмі — адзін раз.

Як і многія яго равеснікі, ён захапляўся фільмам «Д'Артаньян і тры мушкецёры», імкнучыся ва ўсім браць прыклад з чацвёркі галоўных герояў, не разумеючы, што тое, што ў кіно лічыцца геройствам, у рэальным жыцці можа кваліфікавацца як звычайнае злачынства, на якое многія прыгодніцкія фільмы, кнігі і правакуюць падлеткаў, што слепа імітуюць прыдуманых высакародных герояў.

Ён ужо не раз прымяраў на сабе ўяўную мушкецёрскую форму, браў у рукі ўяўную шпагу і перамагаў уяўных ворагаў. Яму дастаткова было ўяўнага геройства, пакуль не з'явілася Танечка — рэальная, а не экранная Канстанцыя Буанасье, якой сваё геройства трэба было даказваць рэальнымі справамі.

І неўзабаве ён паспрабаваў зрабіць гэта.

У шасцідзесятыя гады на ўскрайку Туровічаў, на месцы, дзе ў вайну немцы расстралялі дзевяць вясковых жыхароў, паставілі помнік, побач з якім разбілі невялікі скверык. За дваццаць гадоў дрэвы выраслі, і пасля школы альбо ў выхадныя дзятва часта збіралася там пагуляць у пікара ці валейбол.

У той вечар ён разам з Віцькам Жытко пайшоў у скверык паглядзець, як Валік Пранчук будзе выпрабоўваць свой самапал. Баёк, зроблены з тонкага цвічка, пры ўдары ніяк не хацеў запальваць серку. Яны правалэндаліся з самапалам пакуль не

стала зусім цёмна, можна было разыходзіцца па хатах, але заўтра пачыналіся канікулы, і дадому ісці не хацелася.

Гадзін у дзевяць вечара на дарозе з’явілася Танечка. Ён пазнаў яе здалёк. Ён пазнаў бы яе з тысячы — па хадзе, і з заплюшчанымі вачыма — па гуку абцасікаў. Хлапчукі прыціхлі, калі яна праходзіла міма, а потым ён прапанаваў:

— Можа, прагуляемся з ёю?

У гэты момант ён адчуваў сябе тым самым д’Артаньянам, які хоча паказаць сябе героем перад сваёй Канстанцыяй, але гэтаму д’Артаньяну было ўсяго пятнаццаць, і за яго спіной не стаяў Дзюма, каб падказаць, як сябе паводзіць.

— Ага, правядзём да кустоў, — заіржаў Валік.

Дарога, па якой ішла Танечка, праз кіламетр упіралася ў другую, да якой з абодвух бакоў падступалі зараснікі.

— Цішэй ты! — незадаволена шыкнуў ён на Валіка.

Яны дружна ўсхапіліся. Некалькі дзесяткаў метраў ішлі воддаль настаўніцы, тым не менш адлегласць паміж імі і ёю паступова змяншалася. Баючыся, што калі яны параўняюцца з Танечкай, Валік можа нагаварыць ёй усялякага глупства, ён ціха сказаў:

— Давайце абгонім яе.

— У-у-у! — голасна, па-воўчы завыў Валік і, нацягнуўшы на галаву куртку, каб Танечка яго не пазнала, кінуўся наперад. За ім, гэтак жа па-воўчы выючы, з нацягнутымі на галаву курткамі пабеглі яны з Віцьком.

Калі Танечка засталася далёка ззаду, яны спыніліся. Раптам Валік падняў угору свой самапал і націснуў на курок. Нечакана для ўсіх прагучаў аглушальны стрэл.

— Балда! — выдыхнуў Сяргей.

Яны разумелі, што зрабілі нешта непатрэбнае, лішняе, пераступілі мяжу, за якой цячэ іншае жыццё па іншых законах. Хацелася вярнуцца назад, у скверык, але яны баяліся, што калі зноў параўняюцца з Танечкай, яна іх пазнае. Калі павярнуць з дарогі направа, да вёскі, Танечка таксама здагадаецца,

што яны адсюль, з Туровічаў, а значыць, здагадаецца хто яны. Злева ад дарогі быў калгасны палетак, снег толькі што растаў, і на палетку цяпер было гразка. Заставалася ісці наперад, у бок прыпынку, каб дзе-небудзь у зарасніках кустоў перачакаць, калі Танечку падбярэ прыгарадны аўтобус...

## 9

Ідучы на выступление, я не ўяўляў, што буду гаварыць. Я знарок выйшаў рана, каб да горада ісці пешкі. Многія лічаць, што думкі ўвесь час жывуць недзе ў нас. Насамрэч, яны трапляюць да нас праз наш зрок — і не важна, ці мы пры гэтым глядзім на дарогу, на чалавека, ці зазіраем у сваё мінулае. Ёсць думкі, якія круцяцца вакол нас як мухі. А ёсць капрызныя, нібы пчолы, што дзесяць разоў падумаюць, перш чым заляцяць да цябе. Але якраз такія думкі мне былі патрэбныя, а каб злавіць іх, патрэбен быў дарожны спакой, а не аўтобусная піхатня.

У горадзе, хоць да пачатку выступления была яшчэ амаль гадзіна, я адразу накіраваўся ў школу, зайшоў у настаўніцкую, дзе за сталом сядзеў мой аднакласнік Андрэй Несцяровіч, той самы, што арганізаваў тут сустрэчу са мной, і гартаў класны журнал. У мяне яшчэ цеплілася надзея, што да гэтага часу канфлікт паміж незнаёмым мне хлапчуком і настаўніцай уладжаны, і я магу пагаварыць са школьнікамі, не засяроджваючы на ім увагі.

Але Андрэй сустрэў мяне пытаннем:

— Ну што, падумаў, як будзеш выхоўваць юнага папарацы? Я нявесела ўсміхнуўся:

— За папарацы будучыня. Сёння гэта аорта шоў-бізнесу, заўтра — палітыкі, а паслязаўтра... а пра паслязаўтра ў такім кантэксце лепш не думаць.

— Ну-ну, толькі не ўздумай гэта сказаць нашаму герою, а то маладыя настаўніцы будуць баяцца хадзіць на ўрокі. Дарэчы, ты ведаеш, чый ён сын?

«О Божа, — падумаў я, — толькі гэтага мне не хапала. Хутчэй за ўсё, сын якога-небудзь мясцовага чыноўніка. Цяпер зразумела, чаму ім займаецца не міліцыя, а няшчасны пісьменнік».

— Гэта сын Танечкі. Ну, памятаеш нашу біялагіцу ў восьмым класе? Яна папрацавала толькі год, а пасля звольнілася.

Кожнае яго слова ўва мне адзывалася рэхам, быццам у маёй душы ў гэтую хвіліну было зусім пуста.

Я ведаў, што які б настрой у мяне не быў перад выступленнем, нават зусім паскудны, што выклікае апатыю і паралізуе ўсялякае мысленне, у самы апошні момант я змагу сканцэнтравацца і сказаць нешта важнае — важнае для мяне, тое, што я хацеў бы, каб пачулі мае слухачы. Не важна, як яны гэта ўспрымуць адразу — магчыма, да іх гэта дойдзе праз дзень, праз месяц, праз год, праз дзесяць гадоў. Не важна. Будаўнік, пабудаваўшы шматкватэрны дом, ніколі не зойдзе паглядзець, як жывуць у ім людзі. Для яго важна не гэта, а тое, што ён зрабіў усё, *залежнае ад яго,* каб ім жылося там утульна.

Перш-наперш трэба было знайсці вачыма таго хлапчука, з-за якога яны тут сабраліся. І ён знайшоў яго. Не мог не знайсці, бо тварам той быў вельмі падобны на сваю маці — на Танечку. Звычайны хлапчук. Па ўсім відаць, крыху ганарлівы і самаўпэўнены, але сёння без гэтага вельмі цяжка ў жыцці.

— Я хачу пагаварыць з вамі пра каханне. Часам можна пачуць, што дарослым з васьмікласнікамі пра гэта гаварыць рана. А мне здаецца, наадварот — позна. Чым больш жыве чалавек, тым больш яго ўяўленне пра каханне скажаецца, і дарослае каханне ніколі не бывае настолькі чыстым, бескарысным, як каханне школьнае. У восьмым класе я быў закаханы ў сваю настаўніцу. Ёй было ўсяго дваццаць два гады, і яна была вельмі прыгожая. Я часта ўспамінаю яе, кожны раз малюючы ў сваім уяўленні яе партрэт. І, на жаль, кожны раз ён атрымліваецца ўсё больш далёкім ад арыгінала. І я ўсё больш адчуваю сябе ў гэты момант не мастаком, а рэстаў-

ратарам, разумеючы, што кожная новая рэстаўрацыя толькі аддаляе мяне ад маёй настаўніцы, а значыць, і ад майго дзяцінства. На жаль, у мяне няма яе фотакарткі, і ніколі не будзе: фота дапамагае стрымліваць час і нават паварочваць яго назад. Я чуў, што ў вашай школе настаўніца падала заяву на звальненне, калі яе сфатаграфавалі на ўроку. Сфатаграфавалі так, як яна гэтага не хацела б. Мне здаецца, што калі не цяпер, то потым яна пашкадуе, што напісала заяву. Яна таксама вельмі прыгожая, і ёй няма чаго саромецца. Дзяўчынкі ёй могуць толькі зайздросціць, а хлапчукі ёй могуць толькі захапляцца. Але і той, хто фатаграфаваў яе, я думаю, ужо сёння шкадуе, што цяпер пра гэта ведае ўся школа і што з-за гэтага ён можа ніколі больш не ўбачыць сваю настаўніцу. Што яму больш не давядзецца так хвалявацца, ідучы да дошкі на ўроку беларускай літаратуры. Хвалявацца не таму, што як след не падрыхтаваўся да урока, а таму, што яго выклікала ***яна.***

Я гаварыў ім пра іх настаўніцу так, быццам добра ведаў яе. Хоць насамрэч ніколі не бачыў, нават на фотаздымку. Але ў гэты момант яна сапраўды стаяла перада мной, у маім уяўленні. Як дзве кроплі вады падобная на Танечку...

## Пытанні і заданні да твора

1. Коратка перакажыце сюжэт твора, вылучыўшы асноўныя яго эпізоды.

2. Вы заўважылі, што аповесць мае складаную кампазіцыю: аўтар то гаворыць пра далёкія часы свайго юнацтва, то пераносіць нас у сённяшні час, вяртаецца назад, «забягае» наперад, размяркоўвае час у «шахматным» парадку, падае нейкія падзеі толькі праз намёк ці адрывачныя ўспаміны. Пра нешта мы можам толькі здагадвацца, асобныя моманты трымаюць нас у напружанай загадцы да канца твора (напрыклад тое, што сучасны васьмікласнік, з якім у сталыя часы сустракаецца і спрачаецца пісьменнік з’яўляецца, сынам яго настаўніцы Танечкі). Гэта прыёмы актывізацыі ўвагі чытача. Ці сустракаліся вы з такой складанай будовай твора раней, ці дапамагае яна зацікаўленаму чытанню?

3. Ахарактарызуйце галоўных герояў твора, звярніце ўвагу на супярэчлівы характар юнага паэта Сяргея Васілевіча. Якія персанажы можна назваць другараднымі, дадатковымі, выпадковымі? Якую ролю ў характарыстыцы герояў адыгрывае партрэт і мастацкая дэталь?

4. Якім пісьменнікам, на вашу думку, стаў Сяргей Васілевіч у сталасці? Ці зразумелыя вам яго развагі, ці сучасны гэта чалавек, ці разумее ён  моладзь і сённяшняе жыццё ўвогуле?

5. Сучасны васьмікласнік ў творы — ці пазнаяце вы сябе?

***Валерый Гапееў***

## ЛЁШКАВА КАХАННЕ, АБО ВІРТУАЛЬНАЕ ДРЭВА РЭАЛЬНАСЦІ

***Аповесць***

*Тлумачэнні для бацькоў, настаўнікаў ды іншых дарослых:*

*Браўзер* — праграма для прагляду Інтэрнэт-рэсурсаў.

*Форум* — рэсурс у Інтэрнэце (сайт, частка сайта), дзе адбываецца абмен думкамі, адкрыты для ўсіх карыстальнікаў.

*Адмін* — адміністратар, кіраўнік сайта, форуму.

*Нік* — прыдуманае імя на форуме.

*Аватар* — невялікі малюнак побач з нікам юзера або фотакартка яго.

*Зарэгістравацца* на форуме *(рэгіцца, рэгіць)* — выбраць сабе нік і задаць пароль для ўваходу, каб усе адказы юзера пазначаліся гэтым нікам.

*Аўтарызавацца* — зайсці на форум, увёўшы нік і пароль.

*Лазіць* па форуме — праглядваць тэмы.

*Пост* — адзін адказ, *пасціць* — адказваць, *пасціць тэму* — пачынаць тэму для абмеркавання.

*Топік* — усе разам адказы на адну тэму, сама тэма.

*Топікстартар* — той, хто пачынае топік, тэму.

*Флудзіць* — пасціць не па тэме, несці лухту; вольная размова на вольную тэму.

*Курылка* — асобны раздзел на спецыялізаваных форумах, дзе можна флудзіць.

*Асабістая пошта, асобка* — функцыя на форуме для абмену кароткімі тэкстамі з адным наведвальнікам.

*Юзер* — наведвальнік, карыстальнік, *юзаць* — карыстацца.

*Яндэкс* — пошукавая сістэма.

*Дэлфі, С++* — мовы праграміравання.

*Скрыпт* — праграма ў формулах і кодах.

*Кантэнт* — тэксты на сайце.

*Дыз* — дызайн, знешні выгляд старонкі ў Інтэрнэце.

*Смайлы* — невялічкія фігуркі (ці сімвалы) у тэксце для выказвання сваіх эмоцый. ☺ і ☹ — усмешка і незадаволенасць, ;) — падміргванне.

*Аська* — праграма для дыялога дваіх, закрытага ад усіх астатніх.

*Стукаць* у аську — запрашаць да размовы.

*Вінт, дыск, вінчэсцер, флэшка* — носьбіты інфармацыі ў камп'ютары.

*Аператыўка* — аператыўная памяць камп'ютара.

*Комп* — камп'ютар.

*Інет, Сетка* — Інтэрнэт.

*Дыялап* — мадэмнае злучэнне.

*Вай-флай* — хуткаснае злучэнне з Інтэрнэтам.

*Трабл* — нейкая непрыемнасць.

*Фішка* — нечаканы ход, знаходка, нешта цэнтральнае, прыемнае, дадатнае.

*Глючыць* — дрэнна працаваць, *глюкнуць* — сапсавацца.

*Павесціся* — паверыць падману.

*ВМЗ* — электронныя грошы, у дадзеным выпадку долары ЗША.

*Кашалёк* — віртуальны кашалёк у сістэме электронных грошай.

*Кіпер* — праграма для атрымання і пераводу электронных грошай.

*Мэйл* — электронная пошта, сам адрас.

*Спам* — нежаданыя пісьмы рэкламнага характару.

*Паштавік* — праграма для атрымання і адпраўкі электроннай пошты.

*Профіль* — дадзеныя аб юзеры, уводзяцца ім самім.

Трафік — пэўны аб'ём атрыманай-перададзенай інфармацыі.

*Паліць трафік* — атрымліваць непатрэбную інфармацыю.

Заўвага: *калі што дарослым застанецца незразумелым, варта папытаць аб тым у дзяцей.*

## 1

— Ты можаш мяне пакінуць у спакоі хоць на гадзіну? — Лёшка не адвёў позірк ад манітора ў бок маці, якая прыпынілася ля яго, сказаў спакойна, але з нейкім металічным прысмакам, якога маці раней не чула. І таму яна ўтрапёна глядзела на сына, ніяк не чакаючы такога тону.

— Ну, чаго ты маўчыш? — Лёшка рэзка крутнуўся разам са стулам.

Гэты стул, як і новы сапраўдны камп'ютарны стол, зроблены майстрамі па чарцяжах самога Лёшкі, з'явіліся ў яго пакоі толькі месяц таму, якраз перад пачаткам заняткаў. Лёшка на гэта зарабіў сам — напісаў некалькі праграм па заказах, некалькі адладзіў.

— Што гэта ты так размаўляеш? — нясмела пачала маці. Куды цішэй спытала, чым толькі што прагучаўшае: «Колькі ты будзеш сядзець за сваім камп'ютарам?!»

— А як мне з вамі размаўляць? — напорыста загаварыў Лёшка. — Ну, скажы — як? Я сяджу дома, у цябе перад вачыма, не лажу ў Інтэрнэце ў пошуках парнаграфіі, ніколі не хаваю ад цябе і ад бацькі манітора. Вы можаце бачыць і не адзін раз бачылі, чым я займаюся. Я працую! Я зарабляю грошы, якіх нам вечна не хапае. Дык чаго ты не даеш мне спакойна гэта рабіць?! — закончыў ён ужо з істэрычнымі ноткамі ў голасе.

— А Божачка, сыночак, што ты крычыш, — відавочна напужалася маці. — Я ж думаю, што вунь як на вуліцы цёпла, сябры твае гуляюць, то пайшоў бы з імі...

— А я не хачу! — ужо закрычаў уголас Лёшка. — Не хачу бадзяцца па вуліцах! Я хачу сядзець тут! Што ў гэтым дрэннага, скажы?

— Ды нічога, нічога дрэннага, — адступіла на крок маці. — Працуй, я ж думала, мо б пагуляў, а то адзін ды адзін...

— Мне хапае сустрэч у школе, мяне дасталі дурныя размовы ў класе, — Лёшка крутнуўся назад, да камп'ютара. — Не перашкаджай, калі ласка, — папрасіў ціха, супакоіўшыся. — Мне трэба скласці праграму для тэсціравання...

— Працуй, працуй, не буду, — маці паспяшалася да дзвярэй. — Толькі не трэба так нервавацца. Зусім ты стаў... не крануць цябе.

Маці пайшла, ціхенька прычыніла дзверы.

Лёшка ў дзясяты раз праглядваў напісаныя радкі, але памылкі не знаходзіў. Ён увогуле раптам згубіў здольнасць разумець ім самім напісанае. Маці вінаватая, перапыніла? Не... Дарэмна ён на маці...

Лёшка спрабаваў запусціць скрыпт, але ўспыхвала памылка. Ён бяздумна ціскаў і ціскаў кнопку мышы. Ні халеры не паспее... За месяц трэба напісаць праграму. Так добра, здаецца, ведае Дэлфі, а на табе, спатыкнуўся на такім простым дрэве.

Здаўся — набраў злучэнне з Інтэрнэтам, потым зайшоў на форум.

Тут, на гэтым форуме праграмістаў, Лёшка адно і адчуваў сябе вольна і спакойна. Яшчэ як толькі пачаў займацца праграміраваннем, адшукаў гэты рэсурс. Добрая ў іх тут кампанія. Адны хлопцы, ніякіх лішніх размоў. Толькі па справе. А флудзіць хочацца — калі ласка, курылка ёсць. Заходзь — і пішы аб чым хочаш.

Лёшка ў курылку рэдка заглядвае, хіба як тэма цікавая з'явіцца. А па вясне дык і не заходзіў — што ні тэма, то пра дзяўчат.

Лёшка стварыў тэму ў асноўным раздзеле «Не атрымліваецца дрэва. Дзе я напартачыў?», выклаў у топіку код. Статыстыка паказвала, што на форуме былі Вожык, Лексус, Рапід — добрыя сябры. Ім Лёшка на форуме пад нікам Тайлер не раз дапамагаў, і яму дапамагалі, разам іншым навічкам паказвалі на памылкі ці спрачаліся з-за чаго ў курылцы.

Адгукнуліся адразу.

Лексус: — Што гэта ты такую лухту сёння пішаш? У цябе ж не тое што дрэва, куста не атрымаецца!

Дрэва — так завецца малюнак, на якім на лінію нанізаны папкі, кожная з якіх па шчаўчку мышы адкрываецца і паказвае, што ў ёй хаваецца. Як сапраўднае дрэва: ад ствала некалькі галін, ад кожнай вялікай галіны — яшчэ галіны, ад тых — галінкі, а на іх — лісточкі.

Тайлер: — А што тут у мяне?

Лексус: — Сінтаксіс не правераны. Радок вываду прапушчаны... Гэта ты сам пісаў?

Тайлер: — Сам.

Лексус: — Не паверыў бы ніколі. Добра, трымай, паправіў. Пасля слоў Лексуса ішоў знаёмы код з асобнымі знакамі іншага колеру — Лексус і памылкі паказаў. Вожык адгукнуўся.

Вожык: — Я ведаю, у чым трабл. Тайлер закахаўся.

Лексус: — Ні халеры. У Дэлфі няма такой функцыі.

Вожык: — Функцыі няма, а каханне ёсць. Тайлер, выкладзі фота новай функцыі, памазгуем, падбяром код.

Лексус: — Баюся, вінта не хопіць на код.

Тайлер: — Пайшлі прэч. Тэма закрыта.

Лексус: — Ну-ну, пабачу праз месяц. Восень, лісточкі падаюць пад ногі... рамантыка...

Вожык: — Лісточкі падаюць пад ногі ссохлымі марамі і звялымі надзеямі аб шчаслівым каханні...

Тайлер: — Вожык, збірай гэтыя лісточкі сабе на калючкі і пайшоў у спячку. Табе пара. Усё, дзякуй, я працую.

...Але правераны код (цяпер дакладна будзе спраўны) нешта не абудзіў жаданне працаваць над праграмай далей. Лёшка зазірнуў у курылку — новая тэма: «Як сказаць дзяўчыне, што яна мне нецікавая?»

«Цьфу, дурні», — усміхнуўся сам сабе Лёшка. У яго дакладна такіх праблем не будзе. Бо і дзяўчыны няма. Ды і ці будзе. За 10 гадоў у школе ні з кім і не гуляў ніколі. Чаму? Ды не хацелася.

Не, не трэба брахаць самому сабе. Было, было ў пятым класе, калі ўспыхнула нейкае такое незразумелае пачуццё, такое ўсеабдымнае, што і цяпер помніцца. Цэлы тыдзень хадзіў тады Лёшка ачмурэлы. І выпрасіў быў у маці грошы на дарагі падарунак. І прыйшоў да Яе на дзень нараджэння.

Там палова класа была. І яшчэ многа незнаёмых.

А Лёшка ішоў да гэтага дома пешкі. Вось захацелася яму так: не прывезці, а прынесці ёй гэты падарунак. Што там было ў тым пакунку? Ды якая розніца? Не трэба было ісці пехатой. Больш за паўтары гадзіны ішоў Лёшка. А дзень быў спякотны, паліла сонца.

Толькі ў той момант, калі ён нахіліўся ў пярэдняй, каб развязаць шнуркі на красоўках, у Лёшкі мільганула думка, што так і не памыў свае красоўкі ўнутры перад гэтым візітам — а значыць, новыя яго шкарпэткі будуць пасля такога маршу па горадзе пахнуць непрыемна. Калі б ён ведаў...

Калі б ён ведаў, што скажа Яна, чакаючы яго ў пярэдняй разам з яшчэ некалькімі дзяўчынкамі, якім ужо карцела хутчэй зазірнуць у прынесеную Лёшкам каробку...

Лёшку б мо адвярнуцца трэба было ў кут, калі красоўкі здымаў, а так Яна прама перад ім стаяла.

— Вой, які ты смярдзючы! — здзіўлена выгукнула Яна і ажно пальчыкамі нос заціснула. — З такімі шкарпэткамі за стол не пушчу!

Ці сур'ёзна яна казала, ці жартавала, але...

Першы раз за сваё жыццё Лёшка зведаў такі сорам. Страшны і чорны, які літаральна раздушыў яго, і Лёшкі не стала, толькі гэтыя праклятыя красоўкі і смярдзючыя шкарпэткі.

Лёшка і сам не зразумеў, як у адно імгненне, не разгінаючыся, ён нацягнуў красоўкі на ногі і кінуўся з кватэры. І пачуў ззаду смех.

Ён неяк выжыў гэты месяц: месяц здзеклівых кпінаў, двухсэнсоўных поглядаў, смешачак за спінай. Вядома, тое светлае пачуццё знікла. Замест яго быў сорам. І ён цягнуўся і цягнуўся за Лёшкам, як той каметны хвост: ядром быў той дзень нараджэння, а хвастом — яго сорам. З гадамі, чым далей ад ядра, хвост меншаў, ды ніяк не знікаў.

І Лёшка быў упэўнены, што з аднакласнікаў ніхто не забыў нічога, што і цяпер да яго прынюхваюцца, хоць Лёшка душ прымае штодзень, штодзень мяняе бялізну, а пра шкарпэткі і казаць няма чаго. Дэзадаранты і добрая парфума ў яго з восьмага класа.

Лёшка цяпер добра ведае, наколькі важна для атачэння твайго, чым ты пахнеш...

Трэнькнуў уваходны званок. Маці пайшла адчыняць, пачуўся знаёмы голас — Юрыс прыпёрся. Зноў будзе цягнуць вечарам бадзяцца. Падабаецца яму выглядаць дасціпным, калі побач такі маўчун, як Лёшка.

— Здароў! — Юрыс уваліўся ў пакой, схапіў стул, падсунуўся бліжэй да Лёшкі. — Ну што, атрымліваецца прога? Слухай, забі туды якую фішку, каб адказаў на пытанні, ціснуў — і адказы ўсе правільныя. Можна?

— А табе пароль адміна не даць?

— Дай!

— Захацеў... Пароль адміна задаецца ім самім, і можа мяняцца.

— Што, хочаш сказаць, нельга нейкі такі пароль прыдумаць, што над усімі адмінамі будзе адмінам?

— Можна.

— Дык зрабі!

— Пайшоў ты к чорту, нічога я рабіць не буду. Не бачу сэнсу. Мая задача — зрабіць прогу.

— От, дурань ты, Лёшка, і вушы ў цябе халодныя! Цябе б увесь клас на руках насіў.

— Не трэба мяне насіць, я сам хаджу, — адказаў Лёшка ўжо сур’ёзна.

— Ну хадзі сабе, — працягнуў Юрыс і адразу пераключыўся на іншае. — У цябе Інэт падрублены цяпер?

— Ага, я сабе Бай-флай падключыў.

— Крута! І бацькі грошы далі?

— Сам зарабляю.

— Добра табе. А я во ні халеры не ўмею. А дай палазіць! А то з маім дыялапам...

— Куды ты хочаш?

— Давай наш гарадскі форум.

Лёшка пераключыўся на Оперу. Юрыс глянуў на адкрыты форум праграмістаў, выдаў тут жа:

— Цю, які шэры...

— А тут для справы людзі збіраюцца. Нам ды з кветачкамі не трэба. І трафіку менш паліцца.

— Ты тут тусуешся?

— Мы тут працуем. Дапамагаем адно аднаму. Грошы зарабляем...

Юрыс ведаў, як можа зарабляць Лёшка ў Інтэрнэце, і за гэта шчыра яго паважаў: «Я б ніколі не змог з тваімі формуламі капейку зарабіць». Ды Лёшка і не скнара — часам кідаў Юрысу колькі рублёў на мабільнік.

— А твой нік які? — спытаў Юрыс.

— Тайлер.

— А што гэта значыць?

— Ну, не ведаю. Так, прыдумаў...

— Добра, набірай адрас, дай я тут у пары тэмаў запашчуся...

На гарадскім форуме Лёшка быў не раз, але нават і не рэгістраваўся. Яму нецікава: адны і тыя ж тэмы, усё пра каханне ды пра адносіны. Фільмы розныя, музыка...

— О, зараз я яму выдам! — Юрыс адшукаў патрэбную тэму на форуме, стаў набіраць адказ. — Уяўляеш, улез адзін тып у нашу тэму хіп-хопу, хоча нешта даказаць... Не цяміць нічога, а туды ж... А ты чаму не заходзіш, Лёшка? Тут палова класа іншы раз па вечарах тусуецца. Цікава бывае...

— Мне не асабліва цікава, — адгукнуўся Лёшка. — Ды і справу рабіць трэба.

— І сёння сядзець будзеш? Слухай, кінь тры рублі на мабільнік, аддам, як разбагацею. Маці зарплату пакуль не далі, а я на SMS-кі раскідаў.

— Кіну, давай зараз...

Лёшка забраў мышку ў Юрыса, хутка зайшоў на патрэбны сайт.

— Усё.

— О, дзякуй, — шчыра адказаў Юрыс. — Значыць, я цябе нікуды не выцягну сёння?

— Не, не выцягнеш.

— Шкада. Ну, працуй... Слухай, а колькі табе за прогу заплацяць? Калі не сакрэт?

— Не ведаю. То ж для школы. Якія ў нас грошы! Колькі заплацяць. А мне практыка.

— Ну, я пабег. Бывай...

Юрыс пайшоў Лёшка прыняўся за работу. Баламут Юрыс, але што ён шчыра да Лёшкі адносіцца — то праўда. І яшчэ як пульсуе энергіяй, з табой пабудзе — нешта рабіць хочацца. Вось і цяпер настрой самы рабочы. І лёгка пайшло ўсё, атрымалася патрэбнае дрэва. І яшчэ паспеў базу распісаць, адладзіў увод-вывад.

Маці паклікала вячэраць. Калі перахапіў трохі, вярнуўся да камп’ютара, адчуў, што стаміўся. Зайшоў на свой форум — нікога з сяброў не было. І пайшоў на гарадскі форум.

Зірнуў на апошнія тэмы, адна прывабіла ўвагу: «Колькі грошай сёння ў вас у кішэні». Пасміхаўся, чытаючы разважанні аб тым, што «бацькі шкадуюць грошы на мабільнік», «выпрошваю ўсякі раз на дыскатэку». Па аватарках-здымках пазнаў траіх аднакласнікаў — Віктар са сваім лірызмам, Юрка Хаванскі з філасафічнымі развагамі аб тым, што лішнія грошы псуюць маладую псіхіку. І Юрыс нядаўна адказваў, нават нік яго тут такі ж, як і завуць, — Юрыс.

Нешта штурхнула (мо падсвядома ўспомнілася запрашэнне Юрыса), і Лёшка хутка прайшоў рэгістрацыю.

Тайлер: — Не разумею тых, хто тут плачацца. Ва ўзросце ад 16 можна элементарна зарабіць самому і не прыніжацца выпрошваннем.

Пачакаў, перагрузіў браўзер.

Юрка (нік — Філосаф): — О, новенькі прыйшоў, і такія заяўкі. Ну, падзяліся...

Пума (невядомы нік): — Зараз цябе, Філосаф, адправяць мыць аўто ці ў Макдональдс.

Філосаф: — Я не супраць мыцця аўто. І ў Макдональдсе працаваў летам. Але, здаецца, наш юны сябар нешта хацеў цікавейшае прапанаваць.

Пума: — Стрыптыз арганізаваць. У Сетцы.

Тайлер: — У Сетцы хапае і стрыптызу, і сексу, і парнаграфіі без усякіх кошак. Не атрымаецца.

Філосаф: — А чаго не хапае?

Тайлер: — Разумных людзей.

Пума: — Тайлер, а ты такі разумны? То падкажы дурным кошкам...

Тайлер: — Я — разумны. І зарабляю сваім розумам.

Філосаф: — Тады навучы нас...

Тайлер: — Тут, бачу, толькі размовы, а не вучэнне. Хто шукае — шукае ў іншых месцах. Юзайце Яндэкс па тэме «выдаленая работа». І ўсе справы.

Пума: — Авоечкі, што тут робіць такі разумненькі...

Цімоха: — Ціха! Тайлер завітаў сюды, каб ашчасlівіць нас!

Пума: — Ой, я — уся ўвага! Тайлер, не цягні. Зрабі мяне шчаслівай!

Філосаф: — Глядзі, Пума, не хопіць месца на дыску пад падоранае шчасце.

Лёшка адчуў, як псуецца настрой. Стала прыкра. Ён не чакаў нейкай асаблівай увагі да сябе, але чаму аўтары пастоў не прынялі яго словы ўсур'ёз? Псіхануў.

Тайлер: — Ат, яшчэ раз пераканаўся, што наш гарадскі форум — балота. Адно балбатаць умеюць. Шчасліва кіснуць!

Пераключыўся на другі сайт — на свой форум праграмістаў...

Гэта толькі здаецца, што віртуальныя зносіны — простыя і бяскрыўдныя. Маўляў, выключыў старонку — і ўсё прапала. Ага! Якая розніца, дзе адрэагавалі на твае словы і хто адрэагаваў? Галоўнае ж для цябе зусім іншае — як адрэагавалі. І нікольki не ратуе тое, што цябе ніхто не ведае. Ты ж сам сябе ведаеш. Ты пісаў — ты атрымаў адказ. І менавіта гэта для цябе галоўнае. Зрэшты, і ў жыцці тое ж. Вунь пісьменнік напісаў кнігу, яе прачытаў чытач, выказаў сваё меркаванне. Ну і што, ёсць розніца для пісьменніка: ведае ён гэтага чытача асабіста ці не?

Лёшка даўно ўпэўніўся, што так званыя віртуальныя адносіны — зусім не віртуальныя. Самыя рэальныя. Калі так да іх падыходзіць, з той віртуальнасцю, то і тэлефанаванні — віртуальныя. І пісьмы, што людзі раней пісалі, — таксама віртуальныя. Людзі ж існуюць, людзі жывыя, і думкі ты агучваеш свае, і рэакцыя на гэтыя думкі застаецца на старонках форумаў...

## 2

Юрыс усеўся за свой камп'ютар пасля апоўначы — так меней плаціць за Інтэрнэт, а то маці дае ўзбучку штомесяц: «Зноў амаль 25 тысяч за тэлефон! А Божачкі, дзе вам на ўсё набрацца!»

Вам — гэта яму, Юрысу, і бацьку. Бо бацька таксама часам раз садзіцца за камп'ютар. Праўда, у яго іншыя прычыны: ён шукае змены ў настройках спадарожнікавых антэн.

...Юрыс зайшоў на форум — і вачам не паверыў: сярод новых зарэгістраваных значыўся Тайлер.

«А, Лёшка не ўтрымаўся!»

Юрыса аж азарт ахапіў: ну што там Лёшка, сама сарамлівасць і ціхасць 11-га класа, напісаў?

Знайшоў тэму, пачытаў. Ну так і ёсць, гэта дакладна Лёшка. Былі сумненні наконт ніка, цяпер няма. Ды і аватара няма. Юрыс заўважыў, што і на сваім форуме Лёшка быў без аватара.

Пасябраваў Юрыс з Лёшкам два гады таму. Хутчэй і не пасябраваў — проста паважаць пачаў. Тады таўкліся на перапынку, Юрыс і таўхануў у коле хлопцаў Лёшку. Той спінай уляцеў проста ў вітрыну. Добра, што там не шкло было, а пластык. Вітрына паляцела, і пластык (вялізны, халера, два на метр) раскалоўся. Што б Юрысу было — ён і не ведае. Аднак тады Лёшка спакойна сказаў намесніку дырэктара, што ён сам вінаваты і гэтак жа спакойна спытаў, колькі трэба грошай.

І грошы назаўтра прынёс. Юрыс хоць палову, ды неяк сабраў, аддаў Лёшку. Спытаў:

— А ў цябе адкуль грошы? Маці дае?

— Я сам зарабляю. У Інтэрнеце.

І, мабыць, каб больш не распытвалі, дадаў:

— Праграмы складаю на Дэлфі. Нехта сайты робіць, ды ці мала чаго каму трэба.

— А калі ты навучыўся?

— А што мне яшчэ рабіць? Купіў кніжку, зацікавіўся.

Так, не дзіўна, што Лёшка тое праграміраванне асіліў. Заўсёды ўбаку ад класа, ціхі, непрыкметны. З дзяўчатамі — ніколі і нідзе. На дыскатэкі школьныя не хадзіў. І калі мусова было ісці, то ўбаку дзе і прастойваў увесь вечар.

— Ты чаму дзяўчат баішся? — спытаў неяк Юрыс. — Хлопец ты як быццам нармальны, адно што ростам не надта выйшаў...

— Мне без іх добра, — адказаў тады Лёшка рэзкавата і замоўк, не стаў працягваць размову.

У мінулым годзе яны зблізіліся больш — Юрысу купілі камп'ютар, новы, то Лёшка іншы раз праседжваў у яго днямі. Бо яго камп'ютар, на які грошы збіраў год, быў слабы, апаратыўка малая, працэсар хіба што ў вордзе друкаваць, не больш.

Юрыс усюды імкнуўся пацягнуць за сабой Лёшку, іншы раз гэта і ўдавалася. Адчуваў Юрыс, што Лёшка і хацеў бы быць разам з усімі, але ці то саромеецца сам сябе, ці то смеласці не хапае, баіцца, што неяк не так зразумеюць яго словы ці дзеянні.

А так сябар ён быў добры — з такім і маўчаць можна. І Юрыс адчуваў нейкі абавязак перад Лёшкам. Нават маці аднаго разу заўважыла:

— Добры хлопец Лёшка. Падзяліць бы тваю кіпучасць на вас дваіх. А то ў цябе праз край, а ў сябра — няма.

І вось цяпер, гледзячы на нік свайго сябра, у Юрыса проста свярбелі рукі. Праз хвіліну ён ужо зарэгістраваўся на форуме пад другім нікам. Не доўга думаючы, назваўся Ксенкай. А што, цікавы нік. Не такі, як усе гэтыя Мэры, Сонейкі, Кветкі... Знайшоў у сваёй папцы некалі скачаных карцінак, адшукаў ці то робата-дзяўчыну, ці то дзяўчыну-робата. Вырашыў, што такі аватар будзе сімпатычны для Лёшкі — як-ніяк робат мае нейкае дачыненне да праграміравання.

Запасціў на форуме ў той самай тэме.

Ксенка: — Тайлер, будзь ласкаў, раскажы, што трэба ўмець, якія веды запатрабаваны ў сетцы? Я ў такой сітуацыі, што мне проста неабходна мець свае грошы ў кішэні. Вельмі прашу.

Ну вось, добрае зрабіў. Зазірне Лёшка — яму будзе прыемна, што запыталіся на поўным сур'ёзе ды і дапамагчы хоць

словам другому прыемна... А там, глядзіш, прывыкне да размоў з дзяўчатамі. То можна будзе перайначыць хлопца!

## 3

Лёшкава свядомасць змагалася з падсвядомасцю: ён не хацеў больш заходзіць у тое месца, дзе яго не прынялі, пакрыўдзілі, і адначасова цягнула — ну што яны там адказалі на яго апошні выклік? Можна ж проста зазірнуць, крадком, нават не аўтарызавацца...

І зайшоў. Была амаль гадзіна ночы. Стаў чытаць пасты.

Пума: — Тайлер, гуляй, разумнік, сюды не клікалі.

Філосаф: — Ну, вось, чаго крыўдаваць, можна ж было б і падзяліцца сакрэтам заробкаў.

І раптам... Лёшка, здаецца, нават пачырванеў ад ахапіўшага невядомага пачуцця.

Ксенка: — Тайлер, будзь ласкаў, раскажы, што трэба ўмець, якія веды запатрабаваны ў сетцы? Я ў такой сітуацыі, што мне проста неабходна мець свае грошы ў кішэні. Вельмі прашу.

Пума: — Чакай, чакай, ён ужо змыўся... Бачылі мы тут такіх...

Лёшка з невядомай раней асалодай, што вось зараз ён можа здзівіць, можа паказаць сябе зусім нечаканым, можа рэальна дапамагчы, пачаў набіраць адказ у топік.

Доўга пісаў, потым сцёр напісанае. Не, так нельга. Па-іншаму трэба... Потым яшчэ пісаў...

Тайлер: — Ксенка, калі ласка! Я напісаў табе праз асабістую пошту — там ёсць пытанні. Калі на нешта можаш адказаць «так», то пішы, а лепш на мэйл. У профілі ёсць. Астатнім: не варта судзіць усіх толькі па сабе і сваіх знаёмых.

Перагрузіў браўзер, зірнуў яшчэ на профіль Ксенкі: бач ты, які цікавы аватар... Нешта механічнае... Дзяўчына, можа, валодае C++? Ну, таксама можна знайсці заданне. Пад нікам

дзяўчыны высвечвалася зялёная лямпачка — значыць, яна ў гэты час на форуме. Што ж, пачакаем адказу.

...Юрыс аж уздрыгнуў, калі пабачыў у асобцы надпіс: «новых паведамленняў — 1».

«Ксенка, вітаю! Я не ведаю, што ты канкрэтна ўмееш рабіць. Давай так: я напішу табе, якімі спосабамі можна зарабляць у Інтэрнэце. А ты напішаш, што з гэтага можаш добра рабіць. Калі такое будзе — то зарабіць рэальна. Значыць, запатрабаваныя:

дызайн

вёрстка

праграміраванне

аптымізацыя

стварэнне сайтаў

напісанне тэкстаў (капірайтынг)

Калі з усяго можаш пісаць тэксты (як з сачыненнямі?), то хай і з цяжкасцямі, але зарабіць можна. Дапамагу, чым здолею».

Юрыс разгублена лыпаў вачыма. Блін, не думаў, што справа да асобкі дойдзе. Хай бы патлумачыў у пасце, ды і ўсё... бач, сакрэты тут робіць. Ну і што адказаць? Нічога не ўмею? Дык які тады сэнс было пасціць у топіку? Якое дачыненне мае слова «дызайн» да Інтэрнэту і як ён робіцца, нічога невядома. А вось тэксты — гэта прасцей. Адправім адказ:

«Тайлер, дзякуй! Я ўмею пісаць — сачыненні на «выдатна», апавяданні пісала, вершы. Думаю, атрымаецца. А што трэба пісаць?»

«Ксенка, гэта выдатна! Калі ёсць час, давай я табе тое-сёе раскажу. Ёсць?»

«Ёсць».

«Тады заходзь на Серч — гэта такі рэсурс, вось яго адрас... Адшукай «Работа для вэб-майстроў», раздзел «Капірайтынг». Пачытай там тэмы, усё зразумееш. Але зарэгіструйся і напішы мне сюды свой нік».

Юрыс узмакрэў. Уляпаўся... Але і цікава было паглядзець, як гэта Лёшка будзе вучыць зарабляць і што там за Серч.

Зайшоў па адрасе і ахнуў — больш за 1000 наведвальнікаў адразу. Ого! Колькі людзей хоча зарабіць... Зарэгістраваўся пад тым жа нікам, стаў чытаць тэмы... О, нехта піша па 7 у. а. за тысячу знакаў... стой, гэта ж менш за старонку тэксту! Во, а тут ужо і за 2 у. а. прапаноўваюць — канкурэнцыя... Лёшка вярнуўся на гарадскі форум — у асобцы зноў чакала пісьмо.

«Ксенка, я цябе пазнаў. Так, той жа нік? Вось цяпер табе трэба пачаць тэму. Ну, аналагічную тым, як там пачынаюць. Прызначай кошт каля 4—5 у. а. за капірайтынг і 2—3 у. а. за рэрайт. Рэрайт — гэта перапісванне чужога тэксту, але сваімі словамі. Першыя работы трэба будзе зрабіць за водгук. Бясплатна, значыць, але заказчык павінен чэсна напісаць аб выкананай рабоце, падрабязна. Але не перажывай, я там зарэгістраваны пад двума нікамі, і пастоў у мяне дастаткова, і рэпутацыя ёсць. Так што гэта быццам я табе закажу работы — закажуць Тайлер і Leha-07. Будуць іншыя пісаць, але ты ім адмаўляй. Калі закажуць работы ўжо за грошы, то пашукай у інтэрнэце падобныя тэмы, пачытай і пішы. Складанага няма нічога, галоўнае — дакладна ведаць тэму, каб не ляпнуць глупства, кшталту “вада падала імклівым дамкратам”».

Юрыс чытаў, перачытваў і не ведаў, што рабіць. А потым хэкнуў — цікава ж пачалося: зараз навучыцца грошы зарабляць! І запасціў тэму на Серчы.

Нягледзячы на позні час, на форуме жыццё віравала: тут жа з’явіліся тры пасты: Тайлер, Leha-07 і яшчэ нейкі Шукач. Як і казаў Лёшка, Юрыс напісаў, што быццам бы згодны выканаць два першыя заданні за водгук. Трэцяму адмовіў.

Выйшаў з Інтэрнэту, падуладны нейкаму шчымліваму адчуванню, што робіць непатрэбнае... не, патрэбнае, але нячэснае, нячыстае, што нельга так, што ён улез за гэтыя паўгадзіны ў самім жа распачатую непрыстойную гульню.

Камп’ютар выключыў, уклаўся спаць і, засынаючы, супакоіўшыся, думаў аб тым, што зрабіў усё ж правільна — цяпер Лёшка будзе думаць, што дапамагае незнаёмцы, яму ж прыемна адчуць, што некаму робіць добрае. Тым больш — дзяўчыне...

Лёшку і на самай справе было добра. Лёгка на душы, светла...

Зазірнуў на свой форум, ведаў, што і тут іншы раз хтоніхто пытаўся пра добры кантэнт для сайтаў. Палазіў па тэмах — так і ёсць, нядаўна вось пыталіся... Звярнуўся праз асобку да топікстартара, спытаў: ці актуальная яго заяўка?

Той адказаў адразу — быў на форуме. Актуальная, бо яшчэ заказ з’явіўся, трэба тэкст пра турыстычныя туры на Мальдывы. Тэрмін — тры дні. Рэрайт, тэксту на 20 тысяч знакаў, па 2 у. а. за тысячу.

«Бяру. Калі што не задаволіць — перапробім. За два дні зробім».

Тэкст прыйшоў на мэйл, і ён, толькі перагарнуўшы колькі старонак, тут жа адправіў яго на адрас Ксенкі.

«Ксенка, вітаю! Вось дык пашанцавала! Гэты тэкст трэба перапісаць, рэрайт, значыць. Пастарайся зрабіць гэта адмыслова. Тут 20 тысяч знакаў. Атрымаеш 40 у. а. Не падвядзі мяне — праз два дні работа павінна быць здадзена. Поспехаў. Тэкст — у файле».

Лёшка клаўся спаць з такім пачуццём, быццам за адзін вечар зрабіў дваццаць праграм для тэсціравання, і ўсе яны запрацавалі адразу ж і правільна. Сон ніяк не ішоў, яшчэ нешта хацелася зрабіць...

## 4

У класе Юрыс адразу заўважыў: Лёшка не такі. Ён выглядаў як чалавек, які раптоўна рашыў задачу, у якой даўно адчаяўся нават зразумець заданне.

І гэта заўважылі дзяўчынкі! На яго паглядвалі і раз, і другі, і трэці і ўрэшце ў Юрыса (усё ж сядзяць разам за партай) спыталі:

— Лёшка наш не закахаўся?

— Ага, закахаўся — у новую формулу. Такая яна гнуткая, а знакі там — што вашы 90х60х90!

Начных сумненняў не засталося — Юрыс быў упэўнены цяпер, што зрабіў правільна. Вунь як сябар ажыў!

Дзень прайшоў — звычайны, падобны на іншыя. Дома Юрыс праверыў пошту і няўцямна лыпаў вачыма. Ён чытаў пісьмо Лёшкі да неіснуючай Ксенкі, гартаў старонкі тэксту...

І што рабіць? Сказаць, што не магу, захварэла Ксенка, паехала ў вёску, памерла ў яе бабуля, яна перадумала, яна не перапіша такі тэкст, у яе зламаўся камп’ютар? Што рабіць? Патэлефанаваць Лёшку ды прызнацца, што гэта ніякая не Ксенка, што яго развялі, як лоха...

І атрымаецца — хацеў як лепш, а ў выніку што?

Спакойна, спакойна... трэба нешта рабіць. Калі Лёшка даведаецца, што грошы зароблены, справа можа закончыцца... Трэба зарабіць тыя грошы...

Блін, а чаго адмаўляцца ад грошай? Рэальна ж зарабіць!

Юрыс хуценька скачаў тэкст на флэшку, адначасова і раздрукаваў. План імгненна ўзнік у галаве, аформіўся канчаткова.

— Танюшка? Прывітанне! Зайка, выручай! Аддзячу, каб мне не памерці! Тут тэксту тры старонкі, трэба яго перапісаць, ну, зрабіць кшталту пераказу сваімі словамі. Ну, трэба мне вельмі... Ага, тэкст у мяне, зараз прынясу...

Юрыс патэлефанаваў яшчэ траім дзяўчатам. А потым пабег па адрасах, бо толькі ў дзвюх былі падключэнні да інтэрнэту, і ім Юрыс кавалкі тэксту скінуў па пошце.

Вечарам збіраў часткі ад дзяўчат. Усё нармальна атрымалася... Можна адаслаць ды на ўсё забыцца.

Не, стоп... столькі тэксту за адзін вечар не атрымаецца аднаму чалавеку зрабіць. Заўтра...

«Вітаю, Ксенка!

Ну, як табе заданне? Калі што незразумела, стукні мне ў аську, я патлумачу. На Серч зазірні, можа, там заказ ёсць у асобцы. Я ў сетцы яшчэ з гадзіны дзве буду. Як працуецца?»

Юрыс заёрзаў. Што рабіць? Трэба рэгіць новую аську. На гэтую Ксенку...

Лёшка ўздрыгнуў, хоць і чакаў гэтага знаёмага гуку аські, калі хто пастукае — «О-о!». Ксенка... Усміхнуўся, адразу ж пачаў пісаць адказ, нават не закончыўшы радок скрыпта, над якім працаваў.

Тайлер: Вітаю! ☺ Ну, расказвай!

Ксенка: Выдатна. ☺ Тэкст не такі цяжкі. Заўтра закончу.

Тайлер: Вось бачыш — я ж казаў, што, маючы галаву можна грошы зарабляць.

Ксенка: Я таксама так лічу.

Тайлер: Так, у цябе ж кашалёк ёсць?

Ксенка: Няма. ☹

Тайлер: Трэба заводзіць... А ...грошы табе тэрмінова трэба?

Ксенка: Так.

Тайлер: Тады я прапаную такое: няхай пераводзяць на мой кашалёк, я змагу перавесці ВМЗ у нашы грошы і абнаўлю. Потым перадам табе. Давяраеш? ☺

Ксенка: Вядома. ☺

Тайлер: Выдатна. Тэкст скінеш мне на мэйл. А на Серчы было што-небудзь?

Ксенка: Ага... Я яшчэ не адказвала. Там заданне для мяне незразумелае: «Аптымізацыя тэкстам». 3000 знакаў. Абяцаюць 4 у. а. за тысячу. І яшчэ «Пошукавая аптымізацыя», таксама 3000 тысячы. Трэба пісаць...

Тайлер: О, гэта не вокны ПВХ. Тут пакуль у тэму ўедзеш...

Ксенка: ☹

Тайлер: Не перажывай. Заўтра будзе дзень... А спытаць цябе можна?

Ксенка: Пра што?

Тайлер: Грошы навошта так спатрэбіліся?

Ксенка: Ну... Ты не смейся. Але гэта асабістыя... скажам так, дзявоча-жаночыя праблемы.

Тайлер: Не буду смяяцца. Калі праблемы, трэба рашаць. Ты лепш пра сябе раскажы: ты адкуль?

Ксенка: А я цябе ведаю ;)

Тайлер: Не зразумеў... Як ты мяне можаш ведаць?

Ксенка: Потым раскажу. Але ведаю. І бачу цябе іншы раз...

Тайлер: Ну, ты мяне азадачыла... Не можа быць!

Ксенка: Можа. ☺ Потым скажу. Усё, выбачай, мне ж пісаць трэба.

Тайлер: Чакай, па заказе «аптымізацыя» прымай заданні. Я дапамагу.

Ксенка: Добра. Да сустрэчы.

Тайлер: Да сустрэчы. Заўтра ў гэты ж час? Мне прыемна было размаўляць з табой.

Ксенка: І мне...

Юрыс выключыў аську і некалькі хвілін сядзеў, як чумны. Ну, яго панесла! З якога ляку ён ляпнуў пра «ведаю»? Што цяпер прыдумаць? Ат, потым прыдумае, як вывернуцца. Затое цяпер Лёшка будзе хадзіць на заняткі, ведаючы, што за ім нехта, можа, і цікуе.

Чорт... яшчэ ж грошы... Як іх забраць у Лёшкі? Так, ужо дзве праблемы... Нічога, чым болын праблем, тым прасцей яны рашаюцца адным удалым спосабам! Галін на дрэве многа, а перасячы ствол — і ўсе пападаюць.

А Лёшка і на самой справе, укладваючыся спаць, зазірнуў у шафу: якую кашулю заўтра апрануць. І трэба пагаліцца — непрыемны пух пад носам толькі псуе твар...

Юрыс скоса пазіраў на Лёшку і дзівіўся: няўжо гэта яго прыдуманая Ксенка так змагла перайначыць Лёшку? Ну, далібог, нейкі ён аж свеціцца знутры. Вочы... шчаслівыя. Дзяўчаты зіркаюць, перашэптваюцца, а Лёшка да гэтага не тое што раўнадушны — ён быццам задаволены, што на яго

ўвагу звяртаюць! Такое адчуванне, што падыдзі, спытай — знутры проста вырвецца радасць. Загадка для ўсяго класа! Гэ, весела б было, каб назваў Юрыс разгадку. Ды, можа, і назаве яшчэ, разам з Лёшкам пасмяюцца.

А Лёшку і на самой справе пачувалася добра. Лёгкім, прыемным і простым здавалася ўсё вакол. Як, аказваецца, важна мець нейкі клопат аб некім...

Паспяшаўся адразу за камп’ютар — так, ад Ксенкі прыйшоў тэкст. Перачытаў — няблага. Адправіў заказчыку. Праз паўгадзіны прыйшоў адказ: тэкст прыняты, грошы пераслалы. Уключыў кіпер, пачуўся звон манет — прыйшлі 40 у. а. Тут жа перавёў іх праз абменнік, яшчэ колькі хвілін — усё, грошы можна здымаць з карткі!

Але пачакаем, трэба закончыць другі тэкст па аптымізацыі — адзін тэкст Лёшка яшчэ ў школе накідаў...

Папрацаваў дзве гадзіны. Маці паклікала вячэраць. Адмовіўся, адно папрасіў чаю.

Закончыў тэксты, адправіў Ксенцы ліст.

«Ксенка, прывітанне. Адправіў тэксты табе. Скінь іх заказчыку, скажы нумар майго кашалька — унізе пісьма будзе. Выходзь у аську, чакаю, як дамовіліся. ☺»

Засеў за сваё — трэба было набіваць базу дадзенымі. Нудная работа, чыста механічная, але сёння рабілася з лёгкасцю. Паглядваў на гадзіннік. Хацелася як мага больш зрабіць, пакуль надыдзе час сустрэчы...

«О-о!» Ксенка!

Тайлер: Прывітанне! Як справы?

Ксенка: ☺ Вітаю, Лёшка!

Тайлер: Ого! Цяпер я веру, што ты мяне ведаеш... Так, пакуль не раскажаш, я табе ні капейкі грошай не дам. ☺

Ксенка: Э, так не дамаўляліся! І чаму я не магу мець сваю маленькую тайну? Ты ж маеш выдатнае лагічнае мысленне — падумай. ☺

Тайлер: Добра, не буду дапытвацца. Прыйдзе час, сама раскажаш. Як справы?

Ксенка: Выдатна! Заказчык ухваліў тэксты і сказаў, што будзе яшчэ заказ. Казаў, што пераве́ў грошы.

Тайлер: Зараз зірнём... Ага, пераве́ў, Ксенка! Так, на тваім рахунку ужо 64 у. а.!

Ксенка: ☺ Авоечкі, ніяк не чакала. Ты мяне літаральна ратуеш, дзякуй. Так проста атрымалася!

Тайлер: Навічкам заўсёды шанцуе. ☺ Але так рэдка бывае. Іншы раз і за месяц на Серчы нельга столькі зарабіць. Жадаючых многа. Як табе перадаць грошы?

Ксенка: Калі я цябе папрашу пакласці іх у канверт і аднесці на пошту — не станеш крыўдаваць?

Тайлер: ☹ Аднясу. Але чаму так?

Ксенка: Не крыўдуй. Потым... Потым усё патлумачу. Вось, а на канверце зробіш надпіс — уладальніку пашпарта. Нумар я ніжэй напішу. Толькі ты не цікуй там, добра ☺?

Тайлер: Не буду. ☺. Але грошы аднашу ўсё адно з адной умовай: як толькі на свой мэйл атрымаю твой здымак. Усё, я купляю твой здымак за 64 у. а. Неблагі кошт?

Ксенка: Так нячэсна! Ты такі шчыры быў, а цяпер умовы ставіш.

Тайлер: Э-е, я табе сам два тэксты напісаў, заданне знайшоў... Я лічу, што гэтым зарабіў хоць на якую спагаду. Хіба не? ☹

Ксенка: Зарабіў. ☺

Тайлер: Тады я чакаю. А ты... дзе вучышся?

Ксенка: У школе.

Тайлер: Не разам са мной?

Ксенка: Не скажу. Слухай, а чаму ты не бываеш на гарадскім форуме? І ўвогуле цябе так мала дзе відаць...

Тайлер: Я надта не люблю кампаній.

Ксенка: І з дзяўчынкамі не гуляеш? ☺

Тайлер: Не. ☹

Ксенка: Чаму? ☹

Тайлер: Даўняя гісторыя. Неяк так атрымалася, што нацярпеўся сораму. Вось і ...

Ксенка: Што, комплекс? ☺

Тайлер: Ды лічы, што так. ☺ Я асабліва да нікога не лезу, мяне не чапаюць... Потым, мяне праграміраванне толькі цікавіць. У гульні не гуляю, музыка не ў кайф, абы фон быў, фільмы мяне не цікавяць. Пра што са мной размаўляць? ☺

Ксенка: Разумею... Я сама амаль такая. ☺ Таксама не люблю кампаній. Ты выбачай, буду адключацца. Напалю на тэлефон, бацька зазлуе...

Тайлер: Ён у цябе строгі?

Ксенка: Не тое, што строгі. Іншы раз і за папругу хопіцца.

Тайлер: Як — хопіцца? ☹ Табе колькі гадоў?

Ксенка: А так хопіцца, як п’яны — і па азадку, па нагах. Таму я ў джынсах заўсёды. А са школы ў джынсах гоняць. І мне тэрмінова трэба штаны. Вось такая проза. ☹

Тайлер: А табе хопіць?

Ксенка: Хопіць. Дзякуй табе! Да заўтра. ☺

Тайлер: І табе дзякуй. Да заўтра... Я заўтра аднясу канверт на пошту. Запакую, каб не здагадаліся пра грошы...

Юрыса апанавалі пачуцці. З аднаго боку — на яго галаву звалілася з неба гэтулькі грошай! З другога боку — якія яны яго? Ён жа абдурыў усіх: Лёшку, дзяўчат... ну, добра, кіне ён дзяўчатам па 10 рублёў на мабільнікі. А з Лёшкам як? 48 тысяч — грошы ж усё-такі яго. Трэба вяртаць. От, навошта згаджаўся браць тыя яшчэ, трэба ж было адмовіцца! А з іншага боку, Лёшка тыя тэксты за колькі хвілін напісаў левай рукой, для яго гэта не работа, гульня...

Ды няхай паляжаць тыя грошы, што з імі зробіцца. Нешта прыдумаецца. Тут вось здымак шукаць трэба... Са школы якую дзяўчыну сфатаграфаваць? Трэба папытаць фотаапарат у Юркі — у яго лічбавы. Ат, а як сустрэне Лёшка тую дзяўчыну? Будзе камедзі-клаб... Во, трэба пашурудзіць у альбомах сястры. У яе сябровак процьма, фотаздымкаў пяць альбомаў. Выбраць якую... сексапільную, у купальнічку! Гэх, будзе Лёшка сліну пускаць!

Юрыс не ўтрымаўся і, хоць быў позні час, прайшоў у залу, дастаў, не ўключаючы святло, кіпу фотаальбомаў, аднёс да сябе і стаў перабіраць здымкі.

Знайшоў. Прыгожы, аж сам загледзеўся. Дзяўчына ў купальніку, скура гладкая, ружовая, стаіць каля ствала нейкага дрэва — шурпатага, чорнага. Гэтак падкрэслівае старая грубасць дрэва яе зграбненькі стан... Узіраўся ў твар доўга — не, гэта дакладна сяброўка далёкая, у гасцях яе Юрыс не бачыў.

Фота ён адсканіраваў. Вырашыў адправіць адразу ж — каб Лёшка нічога не западозрыў. І, кладучыся спаць, міжволі пасміхаўся сам з сябе: як ён выдатна ўжыўся ў ролю дзяўчыны. На хаду імправізаваў, а Лёшка павёўся, так лёгка павёўся...

## 5

Лёшка прыйшоў, павітаўся з Юрысам і, прысеўшы за стол, па-змоўніцку працягнуў свой мабільнік.

— Глядзі...

А сам проста ззяў.

На застаўцы мабільніка Юрыс пабачыў твар той самай дзяўчыны, фотакартку якой позна ўвечары скінуў Лёшку. Доўга ж працаваў Лёшка ў фаташопе: фон змяніў, колеры падкарэкціраваў... мілы такі тварык атрымаўся...

— Гэта хто? — нечакана для сябе хрыпла выдавіў Юрыс, ледзь утрымаўшыся, каб не сказаць: «Ды ведаю я яе, Лёшка! Гэта ж я табе мазгі палашчу! Развёў я цябе!»

Але не сказаў — глянуў на Лёшку, на шчаслівы, з загадкавай усмешкай твар яго, на святло ў вачах — і не сказаў. Адно падумаў: «Трэба заканчваць. Сёння ж».

Вось толькі як заканчваць, Юрыс не ведаў...

Думаў над гэтым да канца заняткаў. А Лёшка... Лёшкаў мабільнік ляжаў на стале ўсе ўрокі, і ён раз-пораз ціскаў кнопку, каб зноў і зноў успыхваў на дысплеі асвечаны блакітам тварык дзяўчыны.

— У Інэце пазнаёміліся. З нашага горада. Уяўляеш, яна мяне ведае, а я яе — не! Так, дапамог крыху, цікава з ёй у асьцы. Праўда, прыгожая?

— Ага, — ціха адказаў Юрыс. — Прыгожая...

Так нічога ён і не прыдумаў. Дадому прыйшоў, еў не спяшаючыся, паляжаў на канапе. Зразумеў раптам, што не хоча ўключаць камп'ютар. Але ўсё ж уключыў, рашуча, вось зараз жа гатовы нешта сур'ёзнае напісаць. Потым прыдумае што. Адно вось пачытае ліст ад Лёшкі, які ён адправіў (ну, вядома ж, ужо адправіў!) Ксенцы, і напіша адразу ўсю праўду.

Але... пісьма не было. Юрыс разгублена яшчэ раз праверыў пошту — акрамя двух лістоў спаму — нічога. Зайшоў на форум — не, Лёшка не заходзіў. Нейкі час Юрыс сядзеў перад маніторам без усякіх думак. Ён нічога не мог зразумець...

Зазірнула маці.

— Што сябра не сустракаеш? Заходзь, заходзь, — павярнулася яна і прапусціла ў пакой ... Лёшку.

Той быў запыханы, расчырванелы. І вочы — разгубленыя.

— Ты чаго, — спуджана прагаварыў Юрыс. Ён на самой справе напужаўся невядома чаго.

— Ды, халера, комп заглючыў! Ну, уяўляеш, гэтае жалеза падводзіць у самы патрэбны момант! Дай я з твайго ліст адпраўлю Ксенцы...

— Ксенцы? — Юрыс акругліў вочы.

— Яе Ксенка завуць, — як аб нечым надзвычайна важным сказаў Лёшка, дастаючы мабільнік.

Юрыс узмакрэў.

— Ага, зараз... ты.. .ты прынясі мне вады... І скажы маці, хай там паставіць чайнік, кавы пап'ём.

Лёшка паслухмяна крутнуўся з пакоя, а Юрыс ліхаманкава адкрыў паштавік і выдаліў усе лісты адным махам — абы толькі Лёшка не пабачыў сярод іншых свае — якія пісаў да Ксенкі.

Лёшка вярнуўся, Юрыс якраз падключыўся да Інтэрнэту.

— А я не буду праз паштавік, — сказаў Лёшка. — Зараз прама на сайт выйду, там праз пошту...

Ён адправіў пісьмо хутка, і Юрыс цяпер праклінаў сябе, што ўключыў паштавік; вось зараз возьме і прыйдзе імгненна гэтае пісьмо прама на вочы Лёшку.

— Усё, я выключаю, цяпер тарыф самы дарагі, — заспяшаўся Юрыс. — Пайшлі каву піць...

Але ад кавы Лёшка адмовіўся, пайшоў, не — паскакаў праз дзве прыступкі ўніз, не стаў чакаць ліфт...

Юрыс не мог патлумачыць сам сабе, чаму ён вось цяпер, вось тут не сказаў праўду. Можа, таму, што Лёшка быў такі шчаслівы? Сказаць — што абакрасці яго. Забраць, ды не проста забраць, а высмеяць яго шчасце...

Пісьмо прыйшло.

«Ксенка, вітаю! Дзякуй табе вялікі за здымак. Ты не ўяўляеш, як мне прыемна было яго атрымаць. Спяшаюся сказаць: грошы можаш сёння забраць — я іх пакінуў адразу пасля абеду на пошце, запакаваў у такі тоўсты канверт. Думаю, не здагадаюцца там, што ўнутры грошы. Але на ўсякі выпадак паспяшайся забраць.

Адпраўляю ліст з чужога компа — у мяне сістэма глюкнула, дай Божа, каб не давялося вінт фармаціраваць, там столькі ўсяго... таму вельмі цябе прашу — як толькі атрымаеш грошы, патэлефануй. Бо спаць не буду, пакуль не даведаюся, што грошы ў цябе. Не ведаю, калі запушчу свой комп. То патэлефануй абавязкова. Буду чакаць. ☺»

Ніжэй быў нумар тэлефона.

Юрыс доўга глядзеў на даўно знаёмыя яму лічбы.

Нічога, трэба напачатку пайсці і атрымаць той пакет ад Лёшкі, у якім грошы. Потым... потым ён прыдумае. Усё прыдумае так, каб нікога не пакрыўдзіць. Ён заўсёды быў здольны на выдумкі.

Дрыжалі рукі, калі па пашпарце ён атрымаў пакет «да запатрабавання». Пералічыў грошы. Такая вялікая сумма... тут

жа, на пошце, паклаў траім дзяўчатам, што перапісвалі тэксты, па 15 тысяч на мабільныя. У нейкі міг пранеслася думка — усе астатнія пакласці на Лёшкаў рахунак. Але тое было б ударам для Лёшкі...

І нічога не прыдумалася. Купіць картку і папрасіць якую дзяўчыну патэлефанаваць Лёшку і сказаць адно — грошы атрымала? Не, гэта не выйсце. Бо што далей? Ат, заўтра проста трэба ўсё расказаць. І так добра — вунь як паверыў у сябе Лёшка! Пасмяюцца разам. А на грошы можна няблага ў бары патусавацца...

Лёшкі не было на першым уроку. Юрыс не ведаў, што і думаць. Здаецца, падрыхтаваўся да размовы, абдумаў свае словы, каб не былі яны надта крыўднымі, а Лёшкі няма. Юрыс не паспеў патэлефанаваць на перапынку — Лёшка прыйшоў сам. Разгублены, плечы паніклыя.

— Здарылася што? — ціха спытаў Юрыс.

— Потым... потым... — ціха адказаў Лёшка і да канца заняткаў не ўзняўся з-за стала — як сеў, так і прасядзеў: і ўрокі, і перапынкі. На хлопца аглядваліся, немагчыма было не заўважыць адбітак сапраўднага гора на яго твары. І нават у класе на перапынках неяк пацішэла...

Лёшка не выпускаў з рукі мабільнік. Трымаў, пазіраў на яго, быццам можна было позіркам сваім прымусіць той мабільнік зазваніць.

Юрыс маўчаў — ён не мог, бачачы стан Лёшкі, нешта сказаць. Лёшка загаварыў сам, калі выйшлі са школы.

— Яна абяцала мне патэлефанаваць. І не патэлефанавала...

— Ну чаго ты ўжо так маркоцішся? — са штучнай бадзёрасцю адказаў Юрыс. — Жанчыны, яны... непрадказальныя. Ды і ці мала што там магло здарыцца...

— Я баюся, што і на самой справе нешта здарылася, — раптам адчайна загаварыў Лёшка. — Разумееш, я ад цябе паслаў ёй ліст, што яна можа атрымаць грошы на пошце, якія... ну, карацей, яна іх зарабіла, а я атрымаў і перадаў, вось яна

павінна была ўчора атрымаць іх і патэлефанаваць! Але не патэлефанавала!

— То што тут страшнага, — нясмела адказаў Юрыс.

— Як што! — ускрыкнуў Лёшка. — То ж грошы! Маглі сволачы якія прасачыць, як яна атрымала канверт, а яна мо і адкрыла яго там...

— Не было яе там.

Юрыс і сам не чакаў, што вымавіць гэтыя словы. Як стрэліла нешта.

— Як... не было? Чакай, адкуль ты ведаеш? — Лёшка ўважліва глядзеў на Юрыса, лоб наморшчыўся, адчувалася, якая напружаная праца ішла ў яго галаве ў гэты момант. — Дык вось адкуль яна ведае маё імя... — сумна ўсміхнуўся ён. — Ты ведаеш Ксенку, ты ёй і напісаў, што мяне завуць Лёшка, дзе я вучуся... Што, ты сам грошы атрымаў і ёй перадаў? Але... чаму яна не патэлефанавала? Ці хоць бы ліст прыслала, я б заскочыў у сэрвісны цэнтр, атрымаў... Навошта яна так? Я ж шчыра ёй дапамагаў...

— Я грошы атрымаў, — вінавата, але цвёрда адказаў Юрыс. — Няма ніякай Ксенкі. Ксенка — гэта я.

— Што ты гоніш?.. Я не разумею толькі: і фотакартку яна прыслала...

— Кажу табе: няма ніякай Ксенкі! Я яе прыдумаў Каб ты навучыўся з дзяўчатамі базары весці, — яшчэ раз паўтарыў Лёшка ўжо з болыпай упэўненасцю.

Лёшка спыніўся, глядзеў на Юрыса з нейкай незразумелай шкадобай у вачах.

— Ты ў мяне адзін сябар, Юрыс. Але не трэба, я не павядуся. Мне проста крыўдна, што яна так са мной...

— Ды няма, няма ніякай Ксенкі! Няма! — закрычаў Юрыс. — Можаш ты гэта зразумець сваімі запраграміраванымі мазгамі!?

— Я знайду яе... знайду і спытаю... А табе я не веру. Больш не веру, — ціха і цвёрда адказаў Лёшка, рэзка развярнуўся і пайшоў прэч.

Юрыс спыніўся ў адчаі на месцы, глядзеў на спіну Лёшкі, якая праз хвіліну згубілася ў прорве падземнага перахода.

Першы раз за сваё жыццё Юрыс не ведаў, што рабіць, куды ісці. Дадому прыйшоў чыста механічна. Упаў на канапу і так ляжаў. Доўга, аж пакуль не заверашчаў мабільнік. Нехта незнаёмы...

— Юрачка, гэта ты? Гэта мама Аляксея. Ты прабач, я хвалююся, вы не разам з Лёшай? Нешта яго дома да гэтай пары няма, і мабільнік не адказвае...

— Не, цёць Таня, у мяне Лёшкі няма... мы... гэта, у школе разышліся. Ён... там застаўся з праграмай нешта круціць. А мабільнік... казаў, што батарэя села...

— Добра, Юрачка, выбачай...

Юрыс падхапіўся з канапы, набраў Лёшку. У адказ пачулася механічнае: «Апарат абанента выключаны альбо знаходзіцца не ў зоне дзеяння сеткі». Юрыс кінуўся ў пярэднюю, насунуў красоўкі на ногі, схапіў куртку, на ўстрывожаны позірк маці кінуў «Я хутка» і вылецеў з кватэры. Ён імчаў уніз з той хуткасцю, быццам дакладна ведаў куды бегчы і што рабіць. І толькі калі выскачыў з пад’езда ў пацямнелы двор, раптоўна спыніўся разгублены, бездапаможны: куды, у які бок?!

Дзе цябе шукаць, Лёшка?

**Пытанні і заданні да твора**

1. У чым, на вашу думку, сучаснасць і актуальнасць аповесці В. Гапеева «Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці»?

2. Чым адрозніваецца сюжэт твора, ці многа ў ім падзей?

3. Якія персанажы складаюць вобразную сістэму твора?

4. Ахарактарызуйце вобразную сістэму твора і яго галоўных герояў — Лёшку і Юрыса.

5. Сфармулюйце праблематыку аповесці.

6. У чым адметнасць мовы твора?

7. Вызначце асноўныя жанравыя адрозненні гэтага твора ад ужо прачытаных вамі эпічных твораў.

8. Як, на вашу думку, уплывае інтэрнэт на беларускую літаратуру?

*Раіса Баравікова*

# ЛЁН-ЛЯНОК, АБО КАМПАКТ-ДЫСК АД ЗЯЛЁНАГА ДРЭЙКА

## *Пастка для зямлян*

Доктар Савіч затрымліваўся, і я пачаў нервавацца. Ён павінен быў заехаць па мяне хвілін дваццаць таму назад. Можа, здарылася штосьці непрадбачанае. А што магло здарыцца? Даўно ўжо мог звязацца са мной па мабільнай сувязі. Я сам спрабаваў гэта зрабіць, але яго тэлефон быў адключаны. І мне заставалася толькі чакаць. Да старту ў нас яшчэ было гадзін шэсць, у любым выпадку мы не спазняліся. А ляцець мы павінны былі на Месяц, куды тэрмінова быў адпраўлены ўжо не адзін зоркалёт з Зямлі. Туды спяшаліся французы, рускія, амерыканцы...

Справа ў тым, што некалькі дзён таму назад на Месяцы пацярпеў катастрофу невядомы касмічны аб’ект. І, калі верыць інфармацыі, якую мы атрымалі ў Міжнароднай асацыяцыі зоркавых палётаў, гэта быў своеасаблівы мінігорад. Праўда, як гэта ні дзіўна, без гуманоідаў. Там былі толькі прадстаўнікі незямной фаўны і флоры. І хоць яшчэ не прайшло і тыдня, як мы вярнуліся з даволі працяглага падарожжа ў сузор’е Рака, на Месяц вырашылі ляцець неадкладна. Я яшчэ раз паспрабаваў звязацца з доктарам Савічам, і ў гэты момант пазванілі ў дзверы. Пайшоў адчыняць, думаючы, што, нарэшце, з’явіўся доктар. Але гэта быў Арцём, той самы падлетак, які аднойчы разам з намі наведаў Зямлю-2 у сузор’і Дзевы. З ім былі яго сябры: Алік і Натка, з якімі я ўжо меў магчымасць пазнаёміцца раней. І хоць іх прыход быў нечаканым, я быў шчыра ўзрадаваны.

— Ну вось бачыце, дзядзька Сымон ужо вярнуўся, — сказаў Арцём сябрам і тут жа звярнуўся да мяне. — Раскажыце пра палёт, як там у вас усё было? Я лічыў дні і вось вылічыў... Вы — дома!

— Я ўжо амаль тыдзень на Зямлі, — адказаў я. — Праходзьце... І трэба сказаць, што міжволі адчуваў сябе вінаватым. Перад адлётам у сузор'е Рака я запрашаў Арцёма да сябе, маўляў, як толькі вярнуся, абавязкова прыходзь з сябрамі, каб пачуць, якую ж інфармацыю мы адтуль прывезлі, на якой планеце былі і што бачылі? І вось Арцём прыйшоў, а я ўжо гатовы адправіцца ў новае падарожжа.

— Вы зноў некуды сабраліся ляцець? — запытала Ната, як толькі мы прайшлі ў гасцёўню. — У вас напагатове рэчы.

— На жаль, адлятаю, — вымушаны быў сказаць я. — Непрадбачаны палёт на Месяц. Вы ўжо, напэўна, ведаеце, там пацярпеў катастрофу касмічны карабель незямнога паходжання. Вось-вось заедзе па мяне доктар Савіч.

Я бачыў, што мае словы засмуцілі Арцёма.

— Што нам тая катастрофа?! У мяне мама на некалькі дзён з'ехала пад Гомель, — сказаў ён. — На касмадроме за Раўбічамі мне ўжо стала нецікава. Думаў, пабуду тут з вамі.

Я лёгенька паляпаў яго па плячы.

— У нас яшчэ будзе шмат часу, Арцём, а цяпер ведаеш што? Я прывёз з сузор'я Рака цікавую рэч. Мяркую, там павінна быць штосьці нязвыклае для нас, зямлян!

Той рэччу, пра якую я ўспомніў, быў кампакт-дыск. У мяне не было часу расказваць, пры якіх абставінах ён да мяне трапіў, таму, як толькі я знайшоў яго на паліцы, заваленай касмічным хламам, абмежаваўся некалькімі фразамі:

— Вось, трымай! Яго мне даў самотны жыхар незвычайна змрочнай планеты. Наўкол быў толькі адзін шэры колер. Бясконца шэрая прастора. Праўда, дзе-нідзе горы яшчэ былі там, і чалавек... Усяго адзін! На ўсёй гэтай прасторы.

— Чалавек? — перапытаў Алік.

— Не ведаю, — і я на момант задумаўся. — Для мяне ён быў чалавекам. Увогуле, надта сумным было тое наша падарожжа.

— Дык раскажыце, — папрасіла Натка.

— Не-не, у двух словах пра яго не раскажаш. З хвіліны на хвіліну павінен з’явіцца доктар Савіч.

Я бачыў, як уважліва Арцём разглядвае з усіх бакоў дыск, і дадаў:

— Яго мне пасля вернеце, а калі на ім штосьці надзвычай цікавае, пакажыце яшчэ каму-небудзь з сяброў. І як толькі я вярнуся з Месяца, абавязкова заходзьце.

Падлеткі ўспрынялі мае словы як знак, што ім ужо трэба ісці. А, можа, карцела хутчэй паглядзець, што ж на тым дыску? Яны пачалі развітвацца, і я іх не затрымліваў. Зачыніў за імі дзверы і яшчэ раз паспрабаваў набраць нумар доктара Савіча. На гэты раз ён адгукнуўся:

— Вінаваты, Сымон. Затрымалі ў Асацыяцыі. Табе хіба не патэлефанавалі? Камандзір у трансе. Наш палёт адмяняецца! І не толькі наш. Усе рэйсы на Месяц адменены.

І далей доктар Савіч паведаміў мне, што над тым караблём на Месяцы з’явілася талерачка, якая, напэўна, радыёпультам падняла карабель. І калі ён завіс дзесьці за кіламетр ад паверхні, пайшла на стыкоўку з ім.

— Ты разумееш, што адбылося? — усхвалявана пытаўся ў мяне доктар Савіч. — Гэта пастка! Там жа паспелі папрацаваць дэзінфектары. Службы кантролю разбілі карабель на сектары, запусцілі туды астрафізікаў і іншых даследчыкаў. Там і механікі, і інжынеры, і батанікі... Хто адважыцца цяпер збіваць карабель з такою колькасцю зямлян?!

Я стаяў, як аглушаны. У глыбокім космасе здаралася сустракацца з караблямі незямнога паходжання. Але тыя, хто знаходзіўся ў іх, як быццам і не бачылі нас. На нашы караблі не звярталі аніякай увагі. Мы тлумачылі гэта па-свойму, маўляў, няма ніякіх прычын дзяліць Галактыку. Пры яе памерах месца хопіць усім. І раптам такі гвалтоўны захоп зямлян на паверхні нашага ўласнага спадарожніка! Цяпер ужо відавочна, што гэта не катастрофа. Іншапланецяне пасадзілі свой карабель на Месяцы, пачакалі, пакуль запоўняць яго зямляне, і

паднялі. Потым стыкаваліся. Там ужо, напэўна, поўна гуманоідаў. Самая сапраўдная пастка, праўду сказаў Савіч. Але доктару я адказаў зусім іншае:

— Не будзем думаць пра горшае, калі застаецца толькі адно, чакаць, як там будуць разгортвацца падзеі.

— Ніякіх новых звестак адтуль няма. Уключай тэлевізар, — сказаў Савіч. — Па ім праз кожныя пятнаццаць хвілін ідзе трансляцыя з Месяца. Пазней сазвонімся. У мяне даўно на сёння быў запланаваны сеанс з Мымам. І калі мы ўжо не ляцім, давядзецца папрацаваць. Потым, можа, заеду да цябе.

Доктар Савіч развітаўся, і я пазайздросціў яго цярплівасці. Ён усё яшчэ працаваў з Мымам, іншымі словамі, праводзіў сеансы псіхатэрапіі, і я не верыў у станоўчы вынік гэтай яго працы. Справа ў тым, што Мыма падабраў на нейкім далёкім астэроідзе падчас аднаго са сваіх палётаў у космас саксонец Ганс Мюлер, які, здаралася, вылятаў разам з намі. «Спецыяльны экземпляр незямнога жыцця для доктара Савіча», — помніцца, сказаў тады саксонец. І калі мы пазнаёміліся з тым экземплярам, дык проста жахнуліся. Гэта было чалавекападобнае стварэнне, якое прамаўляла толькі два гукі: «М-ы, м-ы»... Давялося адразу ж і назваць яго Мымам. Але, пазнаёміўшыся аднойчы, сустракацца больш з Мымам не хацелася. Ён меў два аблічча. З аднаго боку галавы ў яго быў мілы, сімпатычны твар, з якога не сыходзіла прыязная ўсмешка. І немагчыма было гэтак жа прыязна не пасміхнуцца ў адказ. Але варта было толькі Мыму павярнуцца, як тут жа даводзілася сустрэцца з позіркам, у якім было столькі агрэсіі і нянавісці, што міжволі дрыжыкі прабягалі па скуры. Гэта было другое Мымава аблічча, на якім нічога, акрамя звярынай раз’юшанасці, не было, інакш і не скажаш. Павернуты гэтым сваім бокам, Мым спрабаваў кідацца на людзей, таму яго і трымалі за кратамі. І праз краты доктар Савіч праводзіў свае сеансы, сэнс якіх зводзіўся да аднаго: зняць агрэсію з другога аблічча Мыма. І зрабіць гэта пакуль яму ніяк не ўдавалася.

Раптам зазваніў тэлефон:

— Дзядзька Сымон?! Як добра, што вы яшчэ дома! Гэта Алік, Арцёмаў сябра! У нас!.. У нас!.. — ён хваляваўся незвычайна і нарэшце вымавіў. — Адбылося штосьці страшнае, самы сапраўдны кашмар! Той, хто вам даў гэты кампакт-дыск у сузор'і Рака... Ён... Ён...

— Што ён? Я ж сказаў вам... Для мяне ён быў чалавекам. Мы яго звалі зялёным Дрэйкам. Скура ў яго была зялёная.

— І шланг!.. Шланг таксама быў зялёны!

— Які шланг? — запытаўся я, нічога не разумеючы.

І толькі калі даслухаў Аліка да канца, я зразумеў, што сапраўды здарылася страшная бяда, якая, не выключана, можа стаць непапраўнай.

— Чакайце мяне, я хутка буду ў вас, — сказаў я Аліку, паклаў трубку і адразу ж выйшаў з кватэры. Мяне гняла думка: «Як жа я мог?! Як мог, не праверыўшы, не паглядзеўшы, што там, аддаць Арцёму кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка?» Я быў не ў сабе. Не хацелася верыць у пачутае. Праз хвілін дваццаць я падыходзіў ужо да дома, у якім жыў Арцём.

## *Абласакар[1] у невядомасць*

Дзверы ў кватэру мне адчыніў Алік і адразу ж правёў у Арцёмаў пакой, дзе, прытуліўшыся да сцяны, стаяла перапуджаная Ната. Пабачыўшы мяне, кінулася насустрач:

— Дзядзечка Сымон, я баялася паварухнуцца! А раптам гэта зноў паўторыцца?! Бедны Арцём! Усё было так страшна! Шланг намерваўся схапіць мяне. Я і цяпер баюся, — позіркам паказала на стол, дзе стаяў камп'ютар. — Ён сам адключыўся.

— Нічога не трэба баяцца, паспрабуем разабрацца, што да чаго, — сказаў я, азіраючы пакой, і ў нейкі момант нават па-

[1] З мовы зялёнага Дрэйка на бел. — тэлепартацыя

сміхнуўся. На падваконні пабачыў гаршчок, у якім рос Ням-Ням, — дзівосная расліна, якую я падарыў Арцёму пасля нашага падарожжа на Зямлю-2. Лісце Ням-Няма трапятала. Ён, відаць, таксама быў перапуджаны.

Ната і Алік тым часам селі на канапу. Да іх падсеў і я. У мяне ўсё яшчэ не было поўнай карціны таго, што адбылося ў гэтым пакоі, і я папрасіў:

— Ну, што ж? Давайце, расказвайце, толькі ўсё падрабязна, з самага пачатку... Я вам даў кампакт-дыск, вы прыйшлі з ім сюды.

— Я спачатку зайшла на кухню, — удакладніла Ната. — Там у халадзільніку былі бутэрброды. Потым мяне гукнуў Арцём, — яна паглядзела на Аліка.

— Ага-а, — пацвердзіў Алік. — Ён крыкнуў табе: «Ідзі глядзець, кіно пачалося!» А я засмяяўся... Арцём ужо ўключыў камп’ютар, паставіў дыск, і на экране замільгалі кадры...

— Якія? Згадайце ўсё да драбніц. Любая дэталь можа быць важнай.

— Нічога там асаблівага не было, — адказаў Алік. — Пячора была, самая сапраўдная, з вялікаю дзіркаю ў столі. Праз дзірку пранікала святло. Нейкі хлопец стаяў ля ўваходу ў пячору. Прыблізна наш аднагодак. Каля яго, размахваючы рукамі, бегала дзіўная жанчына.

— Яна была такая ваяўнічая, што як толькі я ўвайшла ў пакой і зірнула на экран камп’ютара, — перапыніла Аліка Ната, — я адразу ж ускрыкнула: «Амазонка!» А Арцём засмяяўся: «Ну, якая ж гэта амазонка! Яна хутчэй нагадвае ведзьму!»

— Скура ў іх была зялёная? — запытаўся я.

— Не, такая, як і ў нас, белая.

— Чакай, Алік, чакай! Мы забыліся пра галоўнае. На іх было не адзенне, а матляліся нейкія шкуркі. Хлопец увогуле да пояса быў голы. І валасы ў яго былі вельмі доўгія.

— А ў жанчыны шкура была перакінута цераз плячо і падперазаная нейкім матузом, — дадаў Алік. Паглядзеў на мяне і

працягнуў. — Потым у пячоры з'явіліся дзяўчына і барадаты дзядзька. Яны таксама былі ў шкурах. Дзяўчына ўкленчыла перад жанчынай.

— Тут і пачуўся нейкі трэск, — сказала Ната. — І ўсё на экране знікла. «Кіно скончылася!» — весела выгукнуў Арцём. І ў гэты момант на экране з'явіўся скручаны зялёны шланг.

— Як ён выглядаў?

— Звычайна! — адказаў Алік. — Як ад пыласоса.

— Вось-вось, я тады падумала пра пыласос, — сказала Ната. — Але тут усё і пачалося. Шланг вытыркнуўся з дысплея і пачаў хутка раскручвацца, як рулетка. Я закрычала...

— Не-е, ты дзіка заверашчала, — пасміхнуўся Алік. — А я ўскочыў з канапы. Шланг хістаўся з боку ў бок, бы гадзюка. Ён паімкнуўся да Наткі, але яна замахала рукамі і шпурнула ў яго бутэрброд, які не паспела даесці. Шланг праглынуў яго і павярнуўся да Арцёма...

— Ён уцягнуў яго ў сябе, як уцягвае пыласос штосьці дробнае, — прамовіла Ната. — Усё адбылося імгненна. Арцём не паспеў нават крыкнуць. І адразу ж шланг знік, быццам нехта хутка ўцягнуў яго назад у дысплей, — яна запытальна паглядзела на мяне. — Паміж тым зялёным Дрэйкам, пра якога вы нам расказалі, і гэтым дыскам, напэўна, існуе нейкая сувязь.

Я маўчаў, добра разумеючы, што адбылося. Арцём перамясціўся з адной прасторы ў другую. Аказваецца, зялёны Дрэйк меў тое, над вынаходніцтвам чаго чалавецтва ўжо б'ецца не адно стагоддзе, і ніяк не можа вынайсці. І я міжволі згадаў высокую худую постаць у чорным плашчы сярод шэрай бясконцай маўклівасці. Мы ўжо збіраліся пакінуць непрыветлівую, нікім не абжытую, змрочную планету, мяркуючы, што больш не пабачым яе адзінага жыхара, але ён спусціўся з гары і шпарка ішоў да нашага зоркалёта. «Сыдзі на паверхню, развітайся з ім, — сказаў мне Антон, камандзір нашага карабля. — Прапануй, можа, ён пагодзіцца ляцець з намі».

Але Дрэйк ад гэтай прапановы адмовіўся, і я не настойваў. Ён абраў для сябе адзіноту, а, магчыма, у ім усё яшчэ жыло спадзяванне, што ён сустрэнецца з кімсьці са сваіх блізкіх. У апошнім я памыляўся, таму што Дрэйк, як толькі падышоў да мяне, адразу ж дастаў з кішэні дыск, і я пачуў ад яго словы, якія толькі цяпер сталі мне зразумелымі. Тады ж, я не ўдаваўся ў іх сэнс, палічыў іх нейкай бязглуздзіцай.

— Хм-м, Ната, сувязь... — я паглядзеў на яе, потым перавёў позірк на Аліка. Яны напружана чакалі, каб я растлумачыў ім тое, што адбылося. І я паўтарыў словы Дрэйка. — Ведаеце, я дакладна ўсё зараз успомніў: «Мне гэтая рэч ужо непатрэбная, вазьмі сабе. Але калі здарыцца абласакар, толькі з таго месца, куды прыбудзеш, вернешся назад». Гэтак мне сказаў зялёны Дрэйк, калі аддаваў дыск. Цяпер я разумею, што абласакар па-нашаму — тэлепартацыя. Значыцца, каб вярнуцца назад, Арцёму трэба быць абавязкова на тым самым месцы, дзе ён апынуўся, калі перамясціўся ў іншую прастору. Вярнуць яго назад, як я разумею, мы зможам з дапамогай дыска, — адказаў я.

— Можа, Арцём цяпер на той планеце, дзе застаўся зялёны Дрэйк?

— Якая розніца, — прамовіла з адчаем Ната. — Дзе б цяпер ён ні быў, мы нічога не зможам зрабіць, — і яна паглядзела на мяне з недаверам. — А як вы зразумелі, што вам сказаў той зялёны чалавек, перадаючы дыск? Хіба вы ведаеце яго мову?

— Не, не ведаю, але ён збольшага валодаў нашай, беларускай мовай. Паўтараю, збольшага. Мы не заўсёды добра яго разумелі, таму я і не надаў ніякага значэння тым яго словам.

— Я вам не веру! — тут жа выгукнуў Алік. — З-за вас здарыўся з Арцёмам гэты... Ну, як вы сказалі, «абласакар»! І вы цяпер, каб неяк апраўдацца, прыдумляеце неверагодныя рэчы. Зялёны Дрэйк не мог ведаць нашай мовы.

— Чаму? — запытаўся я, і мне давялося ім расказаць, што даволі даўно да зоркі Паўночны Асёл, якая знаходзіцца ў суседстве з сузор'ем Рака была паслана экспедыцыя. Той карабель да гэтага часу не вярнуўся на Зямлю. Але, як высветлілася падчас нашага падарожжа, на ім здарылася аварыя. І члены той экспедыцыі мусілі яго пасадзіць на бліжэйшую ад іх планету, на якой ім давялося затрымацца вельмі і вельмі доўга, пакуль яны не адрамантавалі свой карабель. Гэта ўсё мы пачулі ад зялёнага Дрэйка. Ён жыў на той планеце і разам са сваімі сынамі дапамагаў рабіць рамонт карабля. Там былі сур'ёзныя непаладкі з рухавікамі, і, вядома ж, кантактуючы з беларусамі, Дрэйк меў магчымасць авалодаць нашай мовай. Мне хацелася сказаць, што адным з членаў той экспедыцыі быў якраз і Арцёмаў бацька, але я не стаў гэтага рабіць. Цяпер трэба было нейкім чынам вяртаць з поўнай невядомасці Арцёма.

— А куды падзеліся сыны зялёнага Дрэйка, і як там можна было ліквідаваць аварыю на караблі, калі вы самі сказалі, што планета была не абжытая? — запыталася Ната.

— А што потым сталася з тым караблём? — у Аліка ўзнікла сваё пытанне.

— Як толькі яго адрамантавалі, члены экспедыцыі паляцелі далей, да Паўночнага Асла, — адказаў я. — І што з імі там здарылася, ніхто не ведае. Ніякай сувязі з імі няма да гэтага часу. А на планеце зялёнага Дрэйка адбылася глабальная катастрофа. Мы сустрэліся з ім на іншай планеце, дзе я і атрымаў ад яго гэты кампакт-дыск.

— А можа, ён вам яшчэ нешта сказаў, — задумліва прамовіў Алік, — калі перадаваў яго? Можа, вы забыліся і вам яшчэ раз трэба ўсё вельмі добра ўспомніць, каб знайсці падказку, як мы цяпер можам звязацца з Арцёмам?

— Вы сказалі пра глабальную катастрофу, а ці давялося вам пабыць на той планеце, дзе раней жыў зялёны Дрэйк? — і Ната дадала прыцішаным голасам. — Разумееце, вельмі мно-

га ў нас узнікла пытанняў, дык, можа, вы раскажаце пра той свой палёт у сузор'е Рака? Паспрабуйце аднавіць у памяці, як усё адбывалася і, магчыма, сапраўды, як кажа Алік, мы разам зможам знайсці адказ, дзе цяпер Арцём і як з ім звязацца?

Я быў няўпэўнены, што адказ знойдзецца, бо паспеў ужо аднавіць у памяці многае і многае з таго свайго палёту, але не стаў адмаўляцца і, можна сказаць, яшчэ раз перажыў тое наша няпростае падарожжа.

### *Катастрофа на планеце Гусляр*

Мы ляцелі ў сузор'е Рака, але само сузор'е нас мала цікавіла. У ім, як вядома, няма вялікіх яркіх зорак. Але, калі глядзець у зямныя тэлескопы, дык можна заўважыць у ім ледзь бачную зіхатлівую пляму, якая складаецца з агромністай колькасці самых розных зорак, і якую даўно, у глыбокай старажытнасці назвалі адным словам: Яслі. Туды, да гэтых Ясляў мы і ляцелі са спадзяваннем, што адкрыем там шмат новых планет, дзе мы, беларусы, будзем першапраходцамі.

— Камандзір мяркуе зрабіць кароткую пасадку на планеце, дзе ёсць вада, сказаў доктар. — Яе ўжо можна пабачыць на экране. Антон занёс яе ў нашы карты і пазначыў пад назвай Гусляр.

— Чаму Гусляр?

— А ты ўключы экран і паглядзі. Там два мацерыкі, абкружаныя, трэба думаць, акіянам. Адзін з гэтых мацерыкоў мае форму чалавечага цела, а другі, значна меншы, нагадвае самыя сапраўдныя гуслі. Тут я і падказаў яму, маўляў, дык давай і назавём гэтую планету Гусляр. Ён пагадзіўся. Ты ж помніш, як мы аднойчы адзін астэроід у сузор'і Валапаса назвалі Дранікам?

Тым часам я ўключыў экран знешняга назірання, доктар Савіч папрасіў павялічыць відарыс нейкай пэўнай мацерыковай часткі. Калі б не ведалі, што знаходзімся ў глыбокім кос-

масе, на адлегласці мільёнаў і мільёнаў кіламетраў ад Зямлі, можна было б падумаць, што перад намі густанаселены квартал зямнога горада.

— Вельмі развітая цывілізацыя, — нарэшце першым парушыў маўчанне доктар Савіч. — Але чаму такія непамерна шырокія вуліцы? На іх жа няма ніводнага аўтамабіля!

— Затое ёсць талерачкі, — я ўжо здагадаўся, што гэтыя шырокія вуліцы, нішто іншае, як аэрадромы ці нават касмадромы. — Глядзі, ледзь не ля кожнай вежы стаіць нейкі лятальны апарат.

— Павяліч відарыс яшчэ трошкі, — і доктар Савіч незвычайна ажывіўся, як толькі я гэта зрабіў. — Ну вось, нарэшце мы можам бачыць і тых, хто насяляе гэтыя мацерыкі.

— І ўсё ж мы, зямляне, уяўлялі іх страшыдламі, а яны ў сваёй большасці, у чым мы пераконваліся неаднойчы, маюць з намі аднолькавую прыроду. Мы з невялікімі адхіленнямі — аднатыповыя. Ну вось яны, перад намі...

— Сымон, табе не здаецца, што там нешта пачало адбывацца? Штосьці накшталт панікі.

Я не паспеў адказаць доктару, таму што ў гэты момант пачуўся голас Антона, камандзіра нашага карабля: «Увага! Уключаем абарончыя сістэмы і ўваходзім у атмасферу аб’екта пад умоўнай назвай Гусляр… Жадаючых запрашаю да галоўнага ілюмінатара!».

Мы бачылі, як на экране ў тым далёкім і чужым для нас свеце ўсё прыйшло ў неймаверны рух. У паветра адзін за адным падымаліся лятальныя апараты самай рознай геаметрычнай формы.

— Можа, яны рыхтуюцца атакаваць нас? Нездарма ж Антон сказаў, што ўключаюцца абарончыя сістэмы? — цяпер ужо я запытальна паглядзеў на доктара Савіча.

— Не думаю. Наш карабель не мог выклікаць у іх такі перапуд. Ты паглядзі, яны ўсе ахопленыя самым сапраўдным жахам. Так паводзяць сябе толькі перад вялікай бядой, не

ведаючы, як уратавацца. Лятальныя апараты не могуць умясціць усіх жадаючых. Хм-м, цікава! Яны паднімаюцца, як і мы, без разгону. Збаў павелічэнне, давай зірнём на панараму ўсёй паверхні.

І як толькі гэтая панарама адкрылася нам, мы міжволі жахнуліся, прыўзняліся са сваіх месцаў, падаліся бліжэй да экрана, быццам не верылі таму, што бачылі. Было ўражанне, што ўся мацерыковая паверхня ўсмоктваецца, укручваецца ў агромністы вір, утвораны высозным валам вады, што бушаваў наўкол. Акіян, які акружаў мацерыкі, уздыбіўся, стаяў вакол іх сцяною і мацерыкі павольна асядалі ў яго глыбіні, аддаючы сваю паверхню раз'ятраным хвалям. На экране вымалявалася невялікае паселішча, на якое імкліва накатвалася вада, — пяць-шэсць жалезабетонных вежаў і натоўп, які ў літаральным сэнсе штурмаваў тры лятальныя апараты ў выглядзе талерак.

— Пераключы, — змрочна сказаў доктар Савіч. — А лепш выключы зусім. На нашых вачах гіне жыццё, — ён павярнуўся да мяне, і ў яго позірку я ўбачыў боль. Разам з тым доктар запытаўся. — А ты заўважыў, што нідзе наўкол не было відно ніякай жыўнасці? Як вядома з нашай зямной, вельмі і вельмі даўняй гісторыі, Ной у свой каўчэг падчас сусветнага патопу браў і хатнюю жывёлу, і птушак... А-а? Цікава, чым жа яны харчуюцца?

— Харчаваліся! З сабою яны і скарбу ніякага ў свае талерачкі не бяруць, ратуюць толькі самае каштоўнае — сваё жыццё, — з гэтымі словамі я выключыў экран.

Яшчэ ніколі нічога падобнага нам не даводзілася бачыць падчас нашых падарожжаў, і мы з доктарам Савічам не знаходзілі слоў, каб выказаць сваё шкадаванне. Лепш бы ўсяго гэтага не бачылі. Але вось доктар запытальна паглядзеў на мяне:

— Ты не супраць, калі я зноў уключу экран? Не хочацца верыць, што хвалі, гэты раз'юшаны вал вады накрыў усю паверхню.

Я не паспеў адказаць, як пачуўся голас Антона, і тое, што ён сказаў, было міжвольным адказам доктару Савічу.

— Увага! Няма ніякага сэнсу вісець над гэтай планетай. Там, унізе, паўсюдна адна вада і цяпер ужо напэўна спатрэбяцца мільёны гадоў, каб на Гусляры зноў адрадзілася жыццё. Будзем шукаць паверхню для пасадкі ў іншым месцы. Пры такой колькасці зорак, як у Яслях, наўкол павінна быць шмат планет.

— Слухай, доктар, а чаму спатрэбяцца мільёны гадоў, каб на Гусляры адрадзілася жыццё? — Я не пагаджаўся з Антонам. — Вада можа адхлынуць і тыя, хто паспеў уратавацца, зноў вернуцца сюды.

— Не думаю, — запярэчыў доктар Савіч. — Штосьці адбылося ў нетрах гэтай планеты. Яе паверхня бы праваліласся, — і ён уключыў экран. Я зірнуў на бясконцы акіян, што распасціраўся далёка ўнізе, і адвярнуўся з адной думкай, ці не прымроілася ўсё тое, што мы бачылі на паверхні планеты з гадзіну таму назад? А доктар Савіч ускрыкнуў:

— Глядзі, Сымон! Вунь там, бачыш, мільгаюць дзве талерачкі.

Я зноў павярнуўся да экрана і пабачыў два лятальныя апараты, не падобныя на нашы караблі. Надта ўжо былі яны пляскатыя, самыя сапраўдныя талеркі, зялёныя па краях.

— Вярнуліся, каб развітацца са сваёю планетай назаўсёды, — зазначыў доктар. — Не пазайздросціш тым, хто знаходзіцца ў іх. Куды цяпер паляцяць, дзе знойдуць новы прытулак?

Нашы позіркі сачылі за талеркамі. Я думаў, што яны вось-вось завіснуць, як і мы, над планетай. Але талеркі не завіснулі. Яны пачалі імкліва зніжацца і на ўсёй сваёй неверагоднай хуткасці ўрэзаліся ў паверхню ўжо супакоенага, сцішанага акіяна, які імгненна выбухнуў двума вадзянымі слупамі такой вышыні, што, здалося, на нейкі час засланілі Свяціла, вакол якога абарачаўся Гусляр. Пырскі разляталіся, мяркую,

на дзясяткі кіламетраў. І на нашым экране былі толькі яны адны.

— Што ты на гэта скажаш? — губы доктара Савіча ледзь варухнуліся.

Я маўчаў, аднак у думках быў упэўнены, што тыя, хто знаходзіўся ў тых талерачках, пажадалі вярнуцца да сваіх родных, каго пахаваў пад сабою акіян, каб назаўсёды застацца разам з імі ў яго глыбінях. І я не памыляўся.

### *Сустрэча з зялёным Дрэйкам*

Мае думкі блыталіся. Было адчуванне душэўнай спустошанасці ад усяго, што давялося пабачыць. Відаць, тое ж самае адчуваў доктар Савіч, таму што паспяшаўся мяне пакінуць. І як толькі я застаўся адзін, адразу ж схацелася забыцца, праваліцца ў глыбокі сон, каб распаволіцца, зняць гнятлівае напружанне, якое быццам скавала мяне. Але перад тым, як гэта зрабіць, я падключыўся да шматсерыйнага дакументальнага фільма «Мая Радзіма — Беларусь», каб у сне зноў і зноў палюбавацца роднымі краявідамі, усім тым, што на працягу многіх стагоддзяў здзяйснялася ў мілай майму сэрцу частцы зямнога свету. Як ніколі раней я хацеў думаць, што на Зямлі ўсё добра, і кадры гэтага фільма маглі толькі ўмацаваць мае думкі.

Сон быў вельмі доўгім, але некалькі апошніх серый я ўсё ж не паспеў дагледзець, падхапіўся, як толькі пачуў Антонаў голас. Камандзір паведамляў, што мы зніжаемся. Пад намі была паверхня невялікай планеты, якую мы неўзабаве, калі на яе апусціўся карабель, назвалі Шэрай Непрыветлівасцю. Там мы і сустрэліся з зялёным Дрэйкам, але не адразу.

Тая планета амаль нічым не ўражвала. Мы ўсе ўжо некалькі разоў выходзілі з карабля, і цешыла толькі адно: на планеце было паветра і была вада. Але гэта была не рака, і не возера, а хутчэй за ўсё штучны канал, невядома кім пра-

капаны. Ён падзяляў планету на дзве роўныя часткі, гэта мы бачылі са сваіх ілюмінатараў, калі набліжаліся да паверхні.

— Безумоўна, тут хтосьці быў да нас, — казаў мне доктар Савіч, калі мы з ім, як заўсёды ў пары, што стала ўжо традыцыяй, крочылі па пульхнай, быццам перасохлы торф, глебе. — Ты спаў, а я сядзеў ля свайго экрана і добра бачыў гэты канал. Ён роўненькі-роўненькі, вада ў ім блакітная...

— Ну, а дзе ж расліны, дзе дрэвы? — пытаўся я ў яго. — Дзе ёсць вада, там заўсёды ўсё зелянее. Такі ўжо закон прыроды.

— Э-э, дазволь удакладніць. Зелянее на Зямлі і ў пэўную пару года, а тут не Зямля, — і чамусьці са ўздыхам доктар дадаў. — Я стаміўся ад гэтага шэрага колеру. Дойдзем вунь да той адзінокай невялікай гары і вернемся.

— Я гатовы хоць зараз вярнуцца на карабель.

У мяне сапраўды было такое жаданне, але Савіч адмоўна пахітаў галавой, і да гары мы ўсё-такі дайшлі.

Не хаваючы расчаравання, глядзелі на яе: гара як гара — панурая шэрая каменная глыба. Мы селі на невялікі выступ у ёй.

— У мяне ёсць ідэя, Сымон, — адазваўся доктар. — У тваіх лабараторных прабірках захоўваецца самае рознае насенне. Давай засеем лапінку тутэйшай глебы, і ажывіцца гэтая планета. Толькі шкада, што ўжо больш ніколі не давядзецца сюды прыляцець. Квітнення на ёй мы так і не пабачым.

Якраз у гэты момант і пачуўся за нашымі спінамі голас:

— Тутэйшую глебу не трэба засейваць. Яна ажывае, але цяпер тут півар[1].

Мы баяліся азірнуцца. Больш за ўсё ўразіла, што ўсё, што мы пачулі, было прамоўлена па-беларуску. І ўсё ж мы азірнуліся...

Гара бы расступілася за нашымі спінамі, і ў чорнай адтуліне стаяў ён — зялёны Дрэйк. Скура на ягоным твары была

---

[1] З мовы зялёнага Дрэйка на бел. — зіма.

колеру ранняй веснавой лістоты. Вялікія выразныя вочы нагадвалі дзве масліны, толькі зрэнкі былі ярка жоўтымі. Доўгі чорны плашч падкрэсліваў стройнасць ягонай постаці, і ва ўсім абліччы адчувалася нейкая ўрачыстасць. Мы міжволі падняліся, але Дрэйк павёў рукою, гэта быў ледзь заўважны рух, і мы зноў апусціліся на выступ у гары. Ён сеў побач з намі. Маіх каленяў краналася крысо яго чорнага плашча. Тонкія губы Дрэйка варухнуліся:

— Крыснар з Зямлі[1]?

Мы яго не зразумелі. Але гэтая наша першая сустрэча зацягнулася, і, паколькі ў ягонай гаворцы пракідвалася шмат беларускіх слоў, многае з таго, пра што ён нам расказваў, мы маглі зразумець, як і тое, што яго завуць Дрэйк. Тады ж мы пачулі ад яго і пра аварыю на караблі, які ляцеў да Паўночнага Асла, чым Дрэйк і патлумачыў веданне нашай мовы. І калі нарэшце ён прамовіў: «Жыццё на Пурнасе стала небяспечным. На дне акіяна ўтварылася расселіна. Яна пашыралася і пашыралася. Узнікла пагроза, што некалі расселіна ўцягне ў сябе мацерыкі, зрушыўшы іх нетры», — мы ўжо не сумняваліся, што ён з Гусляра.

— Значыцца, твая планета называлася Пурнас? — запытаўся ў Дрэйка доктар Савіч. — А мы далі ёй назву Гусляр.

— Вы наведвалі Пурнас? — і зялёны Дрэйк надзвычай ажывіўся. — Туды цяпер паляцелі мае сыны. Мы атрымалі сігнал небяспекі. Яны павінны вярнуцца сюды са сваімі жонкамі і дзецьмі, таму што рана ці позна на Пурнасе здарыцца баўмік[2], і для свайго новага жытла мы абралі гэтую планету.

— З такім невясёлым пейзажам? — мне падумалася, што ў Яслях можна было адшукаць нешта больш прывабнае.

— Пейзаж піварны[3], — адказаў Дрэйк. — Але пройдзе дзевяць міёраў[4] і тут усё ажыве. З'явяцца трава, кветкі, карлікавыя

[1] З мовы зялёнага Дрэйка на бел. — даўно з Зямлі?
[2] З мовы зялёнага Дрэйка на бел. — катастрофа.
[3] З мовы зялёнага Дрэйка на бел. — зімовы
[4] З мовы зялёнага Дрэйка на бел. — дзевяць месяцаў.

дрэвы, праўда, на вельмі кароткі тэрмін. Мы даўно назіралі за гэтай планетай. Я разам з сынамі прылятаў сюды шмат разоў, пакуль, нарэшце, не вырашылі абраць яе для жыцця. Праўда, перад гэтым доўга вагаліся. Ёсць яшчэ адзін варыянт.

Я да гэтага часу не магу растлумачыць, чаму менавіта ў гэты момант запытаўся ў Дрэйка:

— А ў тваіх сыноў лятальныя талерачкі былі з зялёнымі краямі?

— Ты іх бачыў? — і ў голасе Дрэйка пачулася непрыхаваная трывога.

— Мы шмат чаго бачылі, — адказаў за мяне доктар Савіч і падняўся з выступу. — Калі шаноўны Дрэйк жадае, дык мы запрашаем на свой карабель, дзе можна будзе пазнаёміцца з астатнімі членамі нашага экіпажа.

— Дзякуй, — адказаў ён. — Вы ж не заўтра адсюль адлятаеце? Я яшчэ паспею з усімі пазнаёміцца. Цяпер жа мне трэба выходзіць на сувязь з сынамі.

Раблю гэта штодня і ўсё безвынікова. Сувязі няма. Ад трывожных прадчуванняў у мяне халаднее дыханне.

У гэты момант мне здалося, што ён сапраўды дыхнуў холадам. Відаць, тое ж самае адчуў і доктар Савіч, ён пачаў развітвацца.

— Тады бывай... Будзем чакаць цябе на сваім караблі. І замест слоў развітання Дрэйк прамовіў:

— Калі на Пурнасе здарылася бяда, сыны сюды не вернуцца. Яны застануцца там, дзе іх жонкі і дзеці.

З гэтымі словамі ён і пакінуў нас. Мы рушылі назад, у напрамку, дзе знаходзіўся наш зоркалёт, і калі ў нейкі момант азірнуліся, доктар Савіч сказаў:

— Глядзі, адтуліна ў гары знікла, але ў ёй з’явілася акно. Відаць, Дрэйк назірае за намі. Я ўпэўнены, што ў тых талерачках з зялёнымі краямі былі яго сыны.

— І цяпер яны на дне акіяна, там, на Гусляры, дакладней, на Пурнасе, але хіба яму раскажаш пра такое?

— Можам і расказаць, калі прыйдзе да нас на карабель. Думаю, заўтра ён з’явіцца.

Але зялёны Дрэйк не з’явіўся ні заўтра, ні паслязаўтра. І нават калі ў адзін з тых дзён, якія мы правялі на Шэрай Непрыветлівасці, мы яшчэ раз падышлі да яго гары, ён не выйшаў да нас. Мы ўжо сабраліся пакінуць тую планету і якраз у дзень нашага адлёту пабачылі ў нізкім небе талерачку з зялёнаю палоскаю па краях. Яна апусцілася на паверхню планеты дзесьці за гарою, той самай, дзе мы і сустрэліся з зялёным Дрэйкам.

— А сюды прыляцелі госці, нам трэба рыхтавацца да сустрэчы, — занепакоена сказаў тады нехта з членаў нашага экіпажа. А доктар Савіч запрасіў мяне ў свой адсек, дзе я і пачуў ад яго:

— Што ты думаеш, Сымон, пра гэтую талерачку? Асабіста я мяркую, што гэта Дрэйк злётаў да Пурнаса і вось цяпер вярнуўся назад сюды.

І я пагадзіўся з доктарам, хоць ніхто з нас не бачыў, як і калі ён пакідаў Шэрую Непрыветлівасць. А праз некалькі гадзін, калі ў нас ужо ўсё было гатова да адлёту, мы пабачылі зялёнага Дрэйка, які спяшаўся да нашага карабля. Тады і сказаў мне камандзір: «Сыдзі на паверхню, развітайся з ім...», што я і зрабіў.

## *SMSка для Арцёма*

Пакуль я гэта ўсё расказваў, а таксама яшчэ раз пераказваў усё тое, што пачуў ад зялёнага Дрэйка, калі атрымліваў ад яго кампакт-дыск, Алік і Ната слухалі мяне моўчкі, і ў нейкі момант я падумаў: «Ну вось, яны ўсё пачулі ад мяне і цяпер у іх, напэўна, з’явіцца шмат пытанняў». Але, як ні дзіўна, яны ні пра што не запыталіся, толькі Ната, уздыхнуўшы, сказала:

— Нешта вельмі сумнае вы нам расказалі. Але яшчэ больш сумна ад таго, што ў пачутым няма ніякай падказкі, як

нам звязацца з Арцёмам. Гэты зялёны Дрэйк сказаў вам пра «абласакар»...

Ната не паспела дагаварыць. Якраз у гэты момант званком адазваўся мой мабільнік. Тэлефанаваў доктар Савіч, і я не мог не адгукнуцца, раптам ёсць нейкая інфармацыя з Месяца?

Інфармацыя, сапраўды, была. Я слухаў доктара і не верыў таму, што чую.

— Ты разумееш, гуманоіды забралі выключна ўсё з таго вялікага карабля на сваю талерачку: усе расліны, усіх звяроў і зноў пасадзілі карабель на паверхню Месяца. Па нейкіх прычынах ён ім стаў непатрэбным. А можа, гэта і не іхні карабель? Яны проста зрабілі пірацкі налёт і, што называецца, разжыліся такім незвычайным грузам. Можа, яны жывуць на планеце, дзе няма ніякай фаўны і флоры. — Доктар зрабіў кароткую паўзу і, як мне здалося, нават неяк весела працягнуў. — Талерачка, зразумела, адляцела, а нашы зямляне ўсе ў поўным недаўменні. Яны і тых гуманоідаў як след не пабачылі. Адно і было, што мільганне нейкіх стракатых ценяў. Выпадак выключны! Гэта ўсё я пачуў у Асацыяцыі. Дарэчы, там мне сказалі, што для цябе ёсць паведамленне ад саксонца. Ганс, аказваецца, там, на Месяцы. І ён просіць, каб ты тэрмінова з ім звязаўся. У яго для цябе падарунак ад бортмеханіка. Ну, памятаеш, таго самага, якога мы падабралі ўсё на тым жа Месяцы, калі ляцелі да Крабападобнай туманнасці, і які на зваротным шляху, калі мы зноў прыпыняліся на Месяцы, там і застаўся. Ты сам у парадку?! Тады ўсё, звязвайся з Мюлерам! — і доктар Савіч адключыўся.

Я нават не паспеў у яго запытацца, як даўно Ганс Мюлер на Месяцы і ці быў ён на тым караблі, які паднялі гуманоіды? Але доктар гэтага мог і не ведаць, таму лепш за ўсё мне трэба звязацца з саксонцам і ўсё пачуць ад яго самога. Тым больш, што надта ж карцела пачуць, пры якіх абставінах ён сустрэўся з бортмеханікам, таму я і сказаў Аліку і Натцы:

— Хвіліну пачакайце, я зараз патэлефаную на Месяц аднаму добраму знаёмаму, з кім даводзілася даволі часта вы-

лятаць у Космас. Ды вы ж пра яго неаднойчы чулі. На Месяцы — саксонец Ганс. Гэта займе не шмат часу. А потым мы нешта прыдумаем. Я ўпэўнены, што Арцёма мы выцягнем, дзе б ён цяпер ні быў.

— Вы зараз будзеце тэлефанаваць на Месяц? — здзівіўся Алік. — Як вы гэта зробіце?

— Звычайна! Набяру патрэбны нумар, у мяне ж мабільнік класны. Яго падарыў мне адзін рускі вынаходнік, астранаўт з Варонежа. Па ім я магу звязацца нават з чужой Галактыкай, — і я пачаў набіраць нумар саксонца.

— Хвілінку, не набірайце пакуль! — папрасіла Натка. — Калі ў вас сапраўды такі незвычайны мабільнік, што сігнал ад яго можа пранікнуць нават у нейкую іншую Галактыку, дык трэба паспрабаваць паслаць SMSку Арцёму. Раптам ён яе атрымае?! А ваш знаёмы на Месяцы пачакае.

— Ну-у... Ты малайчына, Ната! — толькі гэта і засталося мне сказаць дзяўчынцы. — Вось бачыце, штосьці ўжо намацваецца. Як я сам пра гэта не падумаў? Сапраўды, чаму б і не паспрабаваць адаслаць SMSку Арцёму! Помню, мы былі немагчыма далёка, у чужой Галактыцы, і ў нас адмовіла сувязь. Мы не маглі звязацца з Зямлёю. А тут на шляху малюсенькая-малюсенькая планета. Наблізіліся да яе паверхні, а яна ўся пакрыта пагоркамі, — пагорак за пагоркам, нідзе ніякай роўнай пляцоўкі. Толькі ў адным месцы пабачылі больш-менш прыдатную нізінку, куды можна было пасадзіць зоркалёт. Але там ужо стаяў нечы карабель і ля яго былі людзі. Самыя сапраўдныя людзі ў скафандрах, якія выраблялiся толькі на Зямлі. Калі мы апусціліся зусім нізка, пабачылі сцяжок на борце карабля. Аказваецца, гэта быў рускі карабель. Мы, вядома, і селі на тую планету. Паспрабавалі пасадзіць зоркалёт на адзін з пагоркаў. Вось там Павел, так звалі вынаходніка, і падарыў мне гэты мабільнік.

— А што было на той планеце, яна была незаселенай? Вы там не сустракаліся з абарыгенамі? — запытаўся Алік.

— Я раскажу пра яе, але трошкі пазней, — адказаў я. — Спачатку пашлём SMSку Арцёму. Давайце, думаць, што паведамім, вельмі коратка, але каб ён зразумеў нас.

— А тут і прыдумляць няма чаго, — адазвалася Ната. — Пашлём тое, што вам сказаў зялёны Дрэйк: «Стань на тое ж самае месца, куды ты перамясціўся, у першапачатковую кропку, і мы цябе выцягнем». — Натка паглядзела на мяне і дадала. — З дапамогай дзядзькі Сымона.

— Толькі дапішыце: «У цябе на гэта ёсць гадзіна часу», — сказаў Алік. — Праз гадзіну і паставім кампакт.

— Правільна, Алік! Гэтую тваю фразу трэба дадаць абавязкова, — і я пачаў хутка набіраць тэкст SMSкі.

— А калі раптам Арцём не атрымае наша паведамленне, — засумнявалася Ната. — Што будзем рабіць тады?

— Не панікуй загадзя, — і Алік звярнуўся да мяне. — Дзядзька Сымон, у нас ёсць ажно цэлая гадзіна. Вы абяцалі расказаць пра планету, дзе сустрэліся з рускімі астранаўтамі.

— Зараз раскажу, толькі спачатку звяжуся з саксонцам.

Але звязацца з Гансам мне не ўдалося. Яго мабільнік быў чамусьці адключаны. Я цяжка ўздыхнуў, але не адсутнасць магчымасці звязацца з саксонцам мяне трывожыла. Прызнацца, я не надта верыў у тое, што Арцём атрымае SMSку. Адна справа паслаць электронны сігнал, хай сабе на неверагодна далёкую адлегласць, і зусім іншая — у часавую прастору. Гэта штосьці зусім іншае. Я чамусьці быў перакананы, што перамяшчэнне Арцёма было перамяшчэннем менавата ў часе. Аднак спадзявацца заўсёды трэба, калі нават здаецца, што справа марная.

### *Арцём вяртаецца*

...Я зірнуў на гадзіннік, у нас яшчэ было хвілін восем, але я падышоў да камп'ютара. Чамусьці выцягнуў з CD-ROMа дыск, пакруціў яго ў руках... І міжволі перад вачамі ўсплыла самотная

высокая постаць у доўгім чорным плашчы. І згадаліся словы зялёнага Дрэйка, якія ён прамовіў на Шэрай Непрыветлівасці, калі мы сядзелі разам на каменным выступе: «Я разам з сынамі прылятаў сюды шмат разоў, пакуль, нарэшце, не вырашылі абраць яе для жыцця. Праўда, перад гэтым доўга вагаліся. Ёсць яшчэ адзін варыянт». Цяпер стала зразумелым, што пад гэтым варыянтам ён меў на ўвазе. Безумоўна, тэлепартацыю, як ён сказаў, абласакар! У іншы свет. У тую самую пячору, што з’явілася тут на дысплеі, да тых людзей, апранутых у шкуры дзікіх звяроў. І што ж іх стрымала? Зялёны колер скуры, ці штось іншае?! Гэта ж было не толькі перамяшчэнне ў часе, а, можна сказаць, касмічны палёт з адной планеты ў глыбокае мінулае другой, у яе пячорнае стагоддзе. І тут я ўвесь скалануўся, як жа я раней не дадумаўся?! Арцём, безумоўна, перамясціўся ў тую пячору. Тое, што здалося кадрамі нейкага фільма, было ні чым іншым, як месцам, куды адбылося перамяшчэнне. Ён у мінулым! Але чаму я думаю, што гэта мінулае менавіта зямной цывілізацыі? А можа, гэтая пячора калісьці знаходзілася там, на Пурнасе, які мы назвалі Гусляром? Можа, гэта адзін з самых ранніх перыядаў жыцця на той планеце? Мне стала горача. Не хацелася разважаць далей і я адкінуў ад сябе ўсе думкі. Хутка ўставіў дыск у CD-ROM і ўключыў камп’ютар. І ў той жа момант на дысплеі паплылі кадры...

— Глядзіце! Глядзіце, там Арцём! — закрычала Натка.

Мы сапраўды пабачылі Арцёма. Ён стаяў ля груувасткага драўлянага стала, за якім сядзела надзвычай расхваляваная жанчына ў шкуры, перакінутай цераз плячо, і штосьці здымаў з рукі той жанчыны.

— Што ён робіць? — Алік запытальна паглядзеў на мяне.

— Ды свой гадзіннік з яе рукі здымае, хіба не бачыш? — адказала Ната і працягнула. — У пячоры толькі Арцём, жанчына і барадаты дзядзька. А дзе ж дзяўчынка і хлопец з доўгімі валасамі? Куды падзеліся яны?

— Ты ў Арцёма потым пра гэта запытаешся, — падаў голас Алік.

А на экране тым часам Арцём зашпільваў бранзалетку гадзінніка на сваёй руцэ. І барадаты мужчына, сагнуўшыся, тыцкаў пальцам у земляную падлогу пячоры недалёка ад выхаду з яе.

— Глядзіце, глядзіце! Дзядзька, напэўна, паказвае Арцёму тое месца, куды ён апусціўся, як толькі адбылося перамяшчэнне. Арцём атрымаў нашу SMSку! — І Натка радасна запляскала ў ладкі. — Вунь, вунь Арцём ідзе туды!

Я глядзеў, як Арцём ішоў да таго месца, на якое паказваў яму барадаты мужчына, і думаў, дзе ж гэта ўсё адбываецца? Зямля гэта ці ўсё ж Пурнас? Там жа была не толькі зялёная, а і белая раса. Я адвёў позірк ад Арцёма, пачаў уважліва разглядваць пячору і пабачыў ступу. Самую сапраўдную ступу — старажытную прыладу для апрацоўкі зерня на крупы. Амаль такую ж калісьці, даўно-даўно, у сваім дзяцінстве я бачыў у этнаграфічным музеі ў Мінску. Ступа, трошкі больш за метр вышынёю, зробленая з кавалка тоўстага ствала дуба ці граба, стаяла ў зацемненым кутку пячоры. У яе было ўваткнута два таўкачы.

Мне згадаўся Пурнас. На імгненне ў памяці аднавілася паверхня тых двух мацерыкоў, дзе мы бачылі жалезабетонныя высокія дамы-вежы, пляцоўкі для пасадкі лятальных апаратаў ля іх, і мноства-мноства скульптур... Згадаліся і пурнасцы, так нечакана для сябе ў думках я назваў жыхароў Пурнаса, але хоць бы дзе мы пабачылі жытнёвае поле! Там не было палёў. Значыцца не магло быць і ступы. «Не, гэта, мабыць, усёткі Зямля, — зрабіў я выснову. Значыцца, ужо тады, калі нашы далёкія прашчуры яшчэ былі апрануты ў шкуры, у іх ужо была ступа. Вялікае вынаходніцтва таго часу! А вунь, каля ступы і саж — плеценая з лазы ёмістасць для захоўвання мяса. У ім у старажытнасці нярэдка прасушвалі сыры, трымалі грыбы, зёлкі. Саж я таксама бачыў у этнаграфічным музеі,

а цяпер бачу яго вунь там, у пячоры. Ён запоўнены нейкімі сухімі раслінамі. Мае думкі перапыніў Натчын крык:

— Не спрацавала! Глядзіце, не спрацавала! Вас падмануў зялёны Дрэйк! Арцём стаіць на тым месцы, якое паказаў яму барадаты дзядзька, і нічога не адбываецца!

Я міжволі ўздыхнуў. Арцём сапраўды стаяў на тым месцы, куды з хвіліну таму назад тыцкаў пальцам барадач. А Ната ледзь не плакала:

— Мы яго не выцягнем! Арцём застанецца там назаўсёды!

— Цішэй, цішэй, не хвалюйся, — пачаў супакойваць я дзяўчынку, а сам напружана глядзеў на экран камп’ютара. Вось з-за стала паднялася жанчына, кінулася да барадача і замахала перад ім рукамі. Было падобна, што яны спрачаюцца. Потым яна скіравалася ледзь не да самага выхаду з пячоры і там падняла з земляной падлогі нейкую трэску, пачала размахваць ёю, звяртаючыся, відавочна да Арцёма і, паказваючы на тое месца, дзе ляжала трэска. Арцём кіўнуў галавою, маўляў, я ўсё зразумеў, і пайшоў да таго месца, куды цяпер ужо рукою паказвала жанчына. І, як толькі ён стаў туды, вакол яго адразу ж з’явілася зіхатлівае зялёнае кола. Барадач і жанчына адбегліся ў кут, да ступы, а з зіхоткага кола пачаў вытыркацца зялёны прамень. Спачатку замаруджана, быццам штосьці намацваў, да нечага прымерваўся, а потым вытыркнуўся імкліва, як джала, і ўваткнуўся ў Арцёма. У тое ж імгненне дысплей пагас...

— Вось і тады рыхтык гэтак усё было, мільгалі кадры, усё роўна як фільм які, — нібыта нечага баючыся, ледзь не шэптам прамовіў Алік, які да гэтага моманту ўвесь час маўчаў, не адрываючы позірку ад экрана. — Вось... Вось, глядзіце!.. З’яўляецца шланг!

На дысплеі сапраўды з’явіўся скручаны зялёны шланг. Адзін з яго канцоў варухнуўся, ён нагадваў жывую істоту, і тут жа вытыркнуўся з дысплея. Да мяне данеслася перапу-

джанае Натчына: «Ах!» А шланг пачаў хутка раскручвацца, нібыта рулетка. І вось ужо ён захістаўся ў пакоі на ўсю сваю даўжыню ад сцяны да сцяны. Потым у нейкі момант знерухомеў і... выштурхнуў, бы выплюнуў, з сябе Арцёма. Проста на падлогу, да маіх ног. У тое ж імгненне ён пачаў скручвацца, быццам хтосьці хутка ўцягваў яго назад у дысплей. І вось ужо толькі зялёная кропачка, згасаючы, замільгала на дысплеі. І, як толькі яна зусім згасла, камп'ютар адключыўся.

Натка, Алік і я, як зачараваныя, глядзелі на экран камп'ютара, а тым часам Арцём падняўся з падлогі. Ён пазіраў то на мяне, то на Аліка, то на Натку, нарэшце, пасміхнуўся, быццам з ім нічога такога і не здаралася, і сказаў:

— А вы здорава прыдумалі з SMSкай!

Тут Ната і Алік кінуліся да Арцёма, сціснулі яго ў сваіх абдымках. Дзяўчынка, наогул, павіснула ў яго на шыі, а я, як толькі сустрэўся з ім позіркам, адчуваючы, як спадае нервовае напружанне, папрасіў:

— Ну, цяпер, Арцём, сядай і расказвай...

## *Пра Лянка, Кудлу і іншых*

*(Са слоў Арцёма)*

Ён пачаў свой распавед з таго моманту, калі зялёны шланг паімкнуўся да яго, і ён адчуў, як да рукі даткнулася штосьці прыемна-цёплае...

— Было такое ўражанне, што я на імгненне заснуў, — сказаў Арцём. — А калі прачнуўся і расплюшчыў вочы, дык замест свайго пакоя, Наткі і Аліка пабачыў пячору, тую самую, што з'явілася на дысплеі, калі я ўставіў у CD-ROM дыск і ўключыў камп'ютар. І людзі ў ёй былі тыя ж самыя, апранутыя ў шкуры, хоць адзеннем гэта было назваць цяжка. Нейкія акраўкі матляліся. Я бачыў, што ўсе яны вельмі перапуджаныя. Баяліся зірнуць у мой бок, а жанчына ўвогуле стаяла, адвернутая да сцяны, і хутка-хутка прамаўляла: «У цябе,

лячэ, воўчая галава, аклочаная барада, саламянае чэрава, канапляныя ногі. Згінь! Згінь! Згінь!» І праз невялікую паўзу яна ціха запыталася:

— Ён згінуў, Янук?

Арцём зразумеў, што словы адрасаваліся барадатаму мужчыну, які стаяў і ўвесь тросся.

— Я ў цябе пытаюся, Янук, ён згінуў?

— Мяне карачун скандрычыў, — адказаў Янук. — А ён не-а, не згінуў. Ён сядзіць. На чалавека вельмі падобны.

— Я сапраўды сядзеў на халоднай земляной падлозе, — працягваў Арцём. — Хацеў было падняцца, ды не ведаў, што будзе далей, і проста разглядваў людзей у шкурах. Дзіўна, але я зусім не баяўся, нават хацелася засмяяцца. Сапраўды, было вельмі смешна, калі жанчына падышла да мяне і, утаропіўшыся, спачатку з бояззю, а потым нават ваяўніча, запыталася:

— Ты — хлеўнік[1]? Малако ў маёй каровы ссеш, а я думала, яго вужака высмоктвае.

— Не, Кудлачка, гэта не хлеўнік, — адазваўся мужчына — Ён не з хлява. Гэта, напэўна, пячурнік[2]. З коміна вываліўся.

— З ко-оміна?! Яшчэ што напрыдумляйце, — запярэчыў хлопец з доўгімі валасамі, які трымаў за руку дзяўчынку. — Ён з зялёнага промня зваліўся, вы ж самі гэта добра бачылі. Да чаго комін? Тут яшчэ вакол яго пляма зялёная свяцілася.

— Значыцца, паветрык[3]! У-у, — гнеўна паглядзела на Арцёма жанчына. — Ты навошта ўчора, калі навальніца была, снапы на нашым палетку параскідаў?! Не Пярун жа гэта зрабіў. А цяпер, во-о, і ў хату ўлез, шкоду тут ужо чыніць будзеш! — Жанчына заплюшчыла вочы і хутка-хутка пачала зноў шаптаць замову. — У цябе, лячэ, воўчая галава, аклочаная барада, саламянае чэрава, канапляныя ногі. Згінь! Згінь! Згінь.

---

[1, 2, 3] Міфалагічныя істоты.

Арцём слухаў жанчыну і думаў, як яму быць? Пачаць ім усім расказваць, што з ім адбылася вялікая неверагоднасць? Што ён не хлеўнік, не пячурнік і не паветрык, а звычайны падлетак, які трапіў да іх, у гэтую пячору з далёкай будучыні? Праўда, сам не ведае, як гэта атрымалася?! Але, напэўна, яны не зразумеюць яго. Застаецца проста сядзець і назіраць за ўсім, што адбываецца, а калі раптам спатрэбіцца, — дзейнічаць, сыходзячы з абставін. У пячоры было душна і ён зняў сваю куртачку. І ў тое ж імгненне жанчына адскочыла ад яго, закрычала:

— Янук! Янук! Хадзі, сюды, хутчэй... Глядзі, вунь на руцэ ў яго вока Люцыпара[1].

Янук падышоў да жанчыны, яго вочы акругліліся, як толькі ён зірнуў на Арцёмаў наручны гадзіннік.

— В-вока! Ага-а... вока! — пацвердзіў ён.

І тут да жанчыны кінулася дзяўчынка, прыціснулася да яе, зашаптала:

— Мамачка, у мяне ногі трасуцца. Пойдзем, да старой Паланеі, хай з воскам ляк вылье.

— Я табе сама яго мякішам хлебным выкачаю, ды не цяпер жа! — Жанчына адштурхнула ад сябе дзяўчынку, на імгненне задумалася, зірнула на Арцёма і павярнулася да Янука. — Ён сам адсюль не сыдзе, для нечага ж Люцыпар сваё вока сюды прыслаў?! Трэба ісці да Паланеі.

— Ага-а, да ведзьмы пойдзеш, дык можаш і не вярнуцца! Сурокаў нашле, — адгукнуўся Янук.

— Я залашчу яе, зёлак занясу, а яна няхай нячысціка ад нас выведзе, — жанчына зноў паглядзела на Арцёма. — У-у, чурылка[2], — замахнулася на яго. — Ведзьма з табою разбярэцца!

— Гэта, напэўна, кладнік[3], — адазваўся хлопец. — Калі кветку папараці на Купалле хто знаходзіць, дык зямля ў тым

[1] Люцыпар — галоўны нячысцік.
[2, 3] Міфалагічныя істоты.

месцы пачынае свяціцца, скарбы ў сваіх нетрах паказвае. І нячысцікі вакол скачуць, каб першымі скарб ухапіць. Вакол яго таксама ўсё свяцілася, пляма зялёная была, ага-а? Пад тваім долам скарб, цётка Кудла.

— Для каго Кудла, а для цябе — Агата! Стой тут! — і жанчына тут жа загадала. — Янук, вынось саж у двор, зёлак для Паланеі адбяру. Там у мяне разрыўтрава ёсць, і баркун, і расакіля, і блёкат. Бяры саж, а я ў стойла да жывёлы зайду, гляну, ці шкоды не нарабілася. Гэты, — кіўнула на Арцёма, — псоту на яе мог наслаць, — і жанчына выйшла. За ёю рушыла і дзяўчынка. Янук падаўся ўглыб пячоры да ступы, туды, дзе стаяў саж з зёлкамі. У гэты момант Арцём падняўся з долу і падышоў да хлопца, які адразу ж закрычаў:

— Не падыходзь да мяне! Не падыходзь, нячысцік!

Янук, які ўжо было падхапіў саж, каб несці, прысеў за ступаю, а Арцём сказаў хлопцу:

— Ну які ж я нячысцік! Ці ж ты не бачыш? На мне проста адзенне іншае, таму што я не адсюль. Выгляд інакшы. Я з другога часу. Паміж гэтаю пячораю і горадам, дзе я жыў дасюль, безумоўна, тысячы і тысячы гадоў, але табе гэтага не зразумець, як бы я ні тлумачыў. Мяне не трэба баяцца, я такі ж самы, як і ты, — і тут Арцёму стала вельмі самотна. Ён паспеў ужо добра ўсвядоміць сваё становішча і не бачыў ніякага выйсця, як яму вярнуцца назад, у сваю мінскую кватэру, пра што і сказаў. — Я ніколі не змагу вярнуцца ў свой час, давядзецца застацца тут назаўсёды. Я хацеў бы з табою пасябраваць. А каб мне не быць белаю варонаю сярод вас, знайдзі мне такую ж шкуру. Гэта ўсё, што на мне, я скіну.

— Дзе я табе шкуру знайду, звера трэба забіць, — і хлопец абвёў позіркам сцены пячоры, потым зірнуў на Арцёма. — Для мяне ты ўсё роўна нячысцік, а гэта — не пячора. Жытло з бярвення складзена. У пячорах прадзеды нашы жылі.

Арцём ужо і сам бачыў, што сцены складзены з бярвення, праўда, гэта нічога не мяняла. Пабудова ўсё роўна нагадвала пячору, але не гэта хвалявала яго цяпер.

— Ну чым я табе магу даказаць, што я не дух, не нячысцік! Мова ў нас з табою аднолькавая. Мы разумеем адно аднаго. Ты... Ты — мой далёкі прашчур. Я самы сапраўдны чалавек.

…— Ты ўсё яшчэ не верыш, што я не нячысцік? Добра, не вер, гэта твая справа. Але хаця б скажы, як цябе завуць? Я — Арцём, а якое ў цябе імя?

Хлопец перастаў цягнуць штосьці цяжкое і праз невялікую паўзу адказаў:

— Каб ты быў нячысцікам, дык імя маё ведаў бы. Відаць, усё ж не нячысцік. Лён я, але найчасцей мяне называюць Лянком.

— Ну і імя ж табе далі, — здзівіўся Арцём. — Там, у тым часе, адкуль я тут з'явіўся, лён расце на палетках. Расліна такая, з якой тканіну вырабляюць. Потым з гэтай тканіны шыюць адзенне.

— Што ты сказаў?! Ты ведаеш расліну, з якой можна вырабіць адзенне?!

І штосьці загрукацела, пападала долу. Гэта Лянок пераскочыў праз сваю барыкаду і ўмомант апынуўся ля Арцёма.

— Скажы яшчэ раз! Там, у тваім часе ёсць такая расліна?!

— Чаго ты так расхваляваўся? Я ж сказаў, з лёну вырабляюць тканіну... А ў цябе імя — Лён. У нас там такіх імёнаў няма, але ёсць такая расліна.

Хлопец хутка сеў побач з Арцёмам, пагладзіў калматую поўсць шкуры, якою быў абкручаны, потым сказаў:

— Гэта ваўчыная шкура, новая зусім. А ў Дамінічкі, ты ж бачыў яе, яна — дачка Кудлы, шкура старая, дзіравая. Я пасмяяўся з гэтага, і Кудла разгневалася. Паабяцала, што галдоўнікам мяне сваім зробіць, калі я расліны такой не знайду, з якой можна было б адзенне вырабіць. У нашым селі-

шчы Кудле ніхто не пярэчыць. Я сапраўды стану галдоўнікам. Няма тут у нас такой расліны, а Кудла кажа, што павінна быць. Жыта — корміць, зёлкі — лечаць, значыцца, і апранацца з расліны павінны, каб не хадзіць у шкурах.

Арцём слухаў Лянка і са шкадаваннем думаў: каб жа ён ведаў, што з ім здарыцца такое, што аднойчы ён апынецца ў гэтай цёмнай каморы ў немаведама якім стагоддзі, ён бы там, у Мінску, насіў бы ў сваіх кішэнях насенне лёну і цяпер бы аддаў яго Лянку. І якраз у гэты момант Арцём міжволі ўздрыгнуў: ён пачуў, што мабільнік прыняў сігнал. І гэта не прымроілася, хоць у такое і цяжка было паверыць. Як? Якім чынам з будучыні ў глыбіню стагоддзяў магло прабіцца чыёсьці паведамленне?! Ён выхапіў мабільнік з кішэні і прачытаў SMSку, і ўжо не мог стрымаць сваёй радасці.

— Мяне адсюль выцягнуць! Мяне выцягнуць! — крычаў Арцём. А Лянок надзвычай спалохаўся. Разам з тым з цікавасцю пазіраў на мабільнік. І Арцём патлумачыў яму:

— Гэта мабільны тэлефон. Прылада для сувязі. Тут, у вас, калі трэба звязацца з кімсьці з суседняга селішча, ганца туды пасылаюць, праўда? Ці самі ідуць. А ў нас там па тэлефоне звязваюцца. Вось бачыш, са мною звязаліся сябры. SMSку мне прыслалі, іншымі словамі, паведамленне, — і тут жа задумаўся, а ці вызначыць дакладна ён сам тое месца, куды перамясціўся? Здаецца, сядзеў пасярэдзіне пячоры? Але ён можа і памыляцца, тое памяшканне было даволі вялікім і цемнаватым. І Арцём запытаўся ў Лянка:

— Ты добра памятаеш месца, куды я злез, як ты сказаў, з зялёнага промня? Толькі адтуль я змагу вярнуцца назад. Пакажаш мне яго?

І Лянок адказаў адразу:

— Паказаў бы! Усё адбылося недалёка ад уваходу ў жытло. Але ж мы тут можам праседзець немаведама колькі часу. Можа, пра нас і забыліся ўжо.

— Дык мы зараз пастукаем у сцяну, тут жа дошкі. Нас пачуюць, — сказаў Арцём і падняўся. Яму хацелася як мага хутчэй выйсці з каморы.

— Чакай, сядзь, — папрасіў Лянок. — Спачатку раскажы мне пра тую расліну, з якой вырабляецца адзенне. Можа, яна і ў нас тут ёсць, толькі ніхто пра гэта не ведае, што яна расліна не простая.

Арцём сеў, задумаўся і міжволі пашкадаваў, што сам ніколі не бачыў ільну на палетках, ён — дзіця горада, асфальту і бетону. Толькі ў кніжках даводзілася чытаць пра лён. І ён расказаў Лянку тое, што ведаў.

— Расліна высакаватая, думаю, мне па лытку будзе. Лісце дробненькае. Кветкі таксама дробныя, блакітнага колеру. Калі лён зацвітае, у нас там кажуць, што нібыта мора наўкол разліваецца.

— Раслін з блакітнымі кветкамі ў нас тут многа, — уздыхнуў Лянок. — Як дазнаюся, што гэта менавіта тая расліна?

У гэты момант за невялікімі дзверцамі пачуліся крокі. Арцём і Лянок міжволі сцішыліся. Дзверцы расчыніліся, і ў камору зазірнуў Янук.

— Гэ-эй, чужаніца, выходзь хутчэй! — гучна загадаў ён. — А ты, Лён, заставайся ў каморы. З табою Кудла пасля разбірацца будзе.

— Ідзі, — падштурхнуў Арцёма Лянок. — Помні пра месца, яно недалёка ад уваходу.

І Арцём у адказ дакрануўся да яго пляча. Гэта было знакам развітання.

...Арцём зрабіў крок, другі, трэці і адчуў, як яго ахутвае цяпло. Потым ён пабачыў зіхоткае зялёнае кола вакол сябе, якое пачало звужацца. Яму здалося, што ён трапіў у паветраны вір, штосьці ўцягвала, бы ўсмоктвала яго ў сябе. І тут імкліва з кола вытыркнуўся зялёны прамень. Арцём адчуў, як да яго даткнулася штосьці прыемна-цёплае — і ўсё... Больш ён нічога не памятаў.

У пакоі ўсталявалася цішыня. Арцём зірнуў на мяне і ў яго вачах я прачытаў пытанне: «Што ж такое са мною адбылося? Патлумачце мне гэтую неверагодна-фантастычную з'яву».

— Усё добра, Арцём, — сказаў я. — Цікавыя рэчы ты тут нам расказаў, але галоўнае, што ты — дома! Табе трэба цяпер як след адпачыць, а пазней мы пагаворым пра гэтае тваё падарожжа ў часе. Я сёе-тое ў цябе яшчэ ўдакладню, перапытаю і мы разам усё асэнсуем.

— А што асэнсоўваць? Я быў у нашым далёкім мінулым, — і ў голасе Арцёма чулася расчараванасць. Ён, напэўна, чакаў ад мяне іншых слоў.

— Ага-а, з табою здарыўся абласакар, — сказаў Алік і яго вочы ззялі вялікай цікаўнасцю. Яму, відавочна, пра нешта хацелася распытаць у Арцёма. А той у сваю чаргу запытаўся:

— Як ты сказаў? Абласакар?

— З мовы зялёнага Дрэйка — тэлепартацыя, — патлумачыла Натка. — Ты перамясціўся з адной прасторы ў іншую.

— Хіба я сам пра гэта не ведаю?! Лепш скажы, хто такі зялёны Дрэйк?

І ўсе трое паглядзелі на мяне. Я адчуў, што быў ужо сярод іх лішнім. Не расказваць жа цяпер яшчэ раз пра зялёнага Дрэйка? Хай пра яго ён пачуе ад сяброў. Таму я і сказаў Арцёму:

— Табе пра зялёнага Дрэйка раскажуць Алік і Ната. Яны шмат пачулі ад мяне пра яго. А я зараз звяжуся з доктарам Савічам. Ён ужо з гадзіну шле мне SMSку за SMSкай. Мне ж хацелася даслухаць цябе да канца, не перапыняючы.

І я набраў нумар доктара Савіча, які імгненна адгукнуўся, і голас яго быў надзвычай узрушаны.

— Тэрмінова прыязджай да мяне! Не паверыш, у мяне ўсё атрымалася з Мымам. Яго другое аблічча сцерлася, знікла! Ён цяпер амаль зямны хлопчык.

Мне сапраўды ў гэта не паверылася. На нейкі момант я ўявіў тое, другое, жахлівае Мымава аблічча, поўнае агрэсіі.

Хм-м, сцерлася? Не намаляванае ж яно было! І, даслухаўшы доктара да канца, паабяцаў яму сёння ж быць у яго.

Арцём, Алік і Натка ўжо пра нешта шапталіся паміж сабою і я паспяшаўся развітацца. Мне карцела хутчэй сустрэцца з доктарам Савічам, але не пра Мыма я думаў. Хацелася як мага хутчэй расказаць яму пра ўсё, што адбылося з Арцёмам. І, магчыма, нават заўтра ж пра гэтае яго падарожжа ў мінулае паведаміць у нашу Асацыяцыю міжзоркавых палётаў. Гэта ж грандыёзная сенсацыя!..

### *Цудоўны, амаль зямны хлопчык*

Доктар Савіч ужо чакаў мяне. Я яшчэ не паспеў разлічыцца з таксістам, як ён ужо падхапіў маю дарожную сумку і зашаптаў мне на вуха:

— Абавязкова скажы Мыму, што ён цудоўны! Дарэчы, гэта мы назвалі яго Мымам. А ён на самай справе не Мым, а Мыквік.

...— Як ты з ім паразумеўся?

— Праз камп’ютар. Аказалася, што ў сусветным слоўніку ёсць і яго мова. Ён нашчадак вельмі старажытнай іншапланетнай цывілізацыі. — Доктар хутка ўзбег на ганак і, адчыняючы, дзверы, гукнуў. — Мыквік!

І як толькі Мым, дакладней Мыквік, выйшаў да нас, я не мог не адзначыць, што выраз ягонага твару стаў яшчэ больш прыязным. Вочы ззялі цікаўнасцю і такой цеплынёй, што мне адразу ж згадалася просьба доктара сказаць яму штосьці прыемнае, што я і зрабіў.

...— Ты пераканаўся? — звярнуўся да мяне Савіч. — Амаль цудоўны зямны хлопчык! — і кіўнуў Мыквіку.

— Не хітруй, у Мыквіка на галаве парык?

Доктар пакруціў галавою, хмыкнуў:

— Аднак ты мяне здзіўляеш! Ён жа не зямны, а амаль зямны хлопчык! У яго энергетыка незямная. Аднойчы ён зрабіў

такія высілкі, такое намаганне, што парушыў свой генетычны склад, сваю генетычную схему. А цяпер... Цяпер толькі тое і зрабіў, што аднавіў яе.

Планета, на якой жыў Мыквік, існавала мільярды і мільярды гадоў, пакуль, нарэшце, не здарылася тое, што можа здарыцца з планетай у любой зоркавай сістэме. Яе прыродныя рэсурсы вычарпаліся, жыць на ёй стала цяжка, і пачаўся пошук іншага месца для жыцця. Ён працягваўся датуль, пакуль жыхары той планеты не натрапілі на астэроід, у нетрах якога было шмат нафты. З гэтым радасным паведамленнем на планету вярнулася першая экспедыцыя, а вось другую напаткала няўдача. На караблі, які трымаў курс да таго астэроіда, распаўсюдзілася невядомая касмічная інфекцыя. Члены экіпажа пачалі гінуць адзін за адным і ніякага паратунку не знаходзілася. Лекі, што былі на караблі, не дапамагалі. І калі нарэшце ён быў пасаджаны на паверхню астэроіда, на ім заставаўся цяжка хворы пілот і Мыквік. Ён быў сынам пілота. І праз колькі часу яму давялося пахаваць бацьку.

— У Мыквіка было безнадзейнае становішча, — доктар ужо з паўгадзіны вёў свой расповед, і я не перапыняў яго. — Але яно стала яшчэ больш пакутлівым, калі высветлілася, што на астэроідзе Мыквік не адзін. Яго насялялі пачвары, — гнюсныя лысыя карлікі, якія жылі ў глыбокіх норах і пакідалі іх толькі дзеля таго, каб паздзекавацца з Мыквіка, ведаючы, што заступіцца за яго няма каму. Яны цікавалі за ім і накідваліся звычайна ззаду, чапляючыся за доўгія валасы, сабраныя ў хвосцік, які, напэўна, больш за ўсё цікавіў і раздражняў іх. Карлікі ж былі лысыя! Ад іх немагчыма было схавацца і падсцерагалі яны яго на кожным кроку. Бараніцца Мыквік нічым не мог. Ён быў адзін, а карлікаў было мноства! І вось аднойчы, калі трываць ужо было немагчыма, калі нахабныя карлікі сталі нападаць гуртом, дзясяткамі, чапляючыся за хвосцік, пры гэтым, раздзіраючы скуру плячэй, шыі, галавы, у Мык-

віка і з’явілася ззаду на галаве тое жудаснае аблічча. Зло спарадзіла зло.

Я, відаць, някепскі доктар, ва ўсялякім выпадку, доктар-псіхолаг. Мімікай, рухамі рук змог пераканаць Мыквіка, што на Зямлі яму нічога не пагражае і ён пазбавіўся ад цяпер ужо непатрэбнага яму аблічча. Вось такая гісторыя цудоўнага, амаль зямнога хлопчыка! — Доктар выключыў тэлевізар, дзе ўжо даўно скончылася трансляцыя з Месяца, і экран стракацеў рэкламай.

— Слухай, доктар, як даўно ты ўспамінаў зялёнага Дрэйка?

— Дрэйка? — доктар на імгненне задумаўся, быццам аднаўляў у памяці высокую худую постаць у чорным плашчы. Потым запытаўся. — А чаго гэта раптам ты згадаў пурнасца?

— Ведаеш, той кампакт-дыск, які ён перадаў мне, рэч вельмі і вельмі няпростая!

І я пачаў расказваць доктару Савічу ўсё, што здарылася з Арцёмам. Ужо сонца даўно асвяціла лугавіну ля доктаравай сядзібы, і некалькі разоў спускаўся да нас Мыквік і тут жа падымаўся назад на другі паверх, а я ўсё расказваў і расказваў...

## *Насенне лёну для Лянка*

Ужо хвілін дваццаць я стаяў ля дзвярэй Арцёмавай кватэры і раз-пораз націскаў на кнопку званка. Міжволі пачаў нервавацца: быў бы Арцём дома, ужо даўно адчыніў бы. Можа, з Алікам паехалі на касмадром за Раўбічы? Яны любілі распытваць астранаўтаў, якія вярталіся з далёкіх падарожжаў, і тыя ахвотна расказвалі ім пра свае палёты. «Не, на касмадром наўрад ці яны паехалі, — думаў я, — у маршрутным раскладзе на сёння няма прызямлення. А раптам? Раптам падлеткі ўзялі дыск і пайшлі да каго-небудзь з сяброў, каб

прадэманстраваць, якім дзівам яны валодаюць?» Ад гэтай думкі стала горача. Я яшчэ раз націснуў на кнопку званка, і тут дзверы адчыніліся. Я пабачыў перад сабою Натку. Яна відавочна стушавалася, адвяла позірк, быццам знячэўку яе заспелі за чымсьці непрыглядным.

— А-а? Гэта вы? Арцём і казаў, што можаце заехаць.

— А дзе ён сам?

Замест адказу дзяўчынка запрасіла мяне прайсці ў кватэру, дзе ў Арцёмавым пакоі я пабачыў Аліка. Ён стаяў ля акварыума і карміў залатых рыбак. На маё прывітанне адказаў, не паднімаючы вачэй, і выгляд у яго быў збянтэжаны.

— Ну, дык дзе ж Арцём? — я павярнуўся да Наты, якая паспела ўжо сесці на канапу і штосьці засяроджана адкалупвала пальцам з маленькай скураной падушачкі, што ляжала на канапе.

— Вы, напэўна, прыйшлі, каб забраць дыск, — нарэшце сказала дзяўчынка, але позірку не падняла. — Давядзецца пачакаць. Вы сядайце, — і, зірнуўшы на Аліка, дадала. — Арцём сёння раніцай купіў насенне лёну. Здаецца, ажно цэлы кілаграм.

І я пра ўсё здагадаўся: Арцём — зноў у той пячоры, у мінулым. Ён вырашыў скарыстаць дыск, цяпер ужо наўмысна, каб перадаць насенне лёну Лянку. Які адчайны ўчынак! А раптам штосьці не спрацуе? Гэты дыск — вынаходніцтва чужога незямнога розуму і толькі той, чужы незямны розум, усё ведае пра яго. Тут не проста рызыка, гэта — небяспека!

— Ды вы не хвалюйцеся, — Ната быццам прачытала мае думкі. — Усё было, як і ў мінулы раз: тая ж пячора, тыя ж самыя людзі ў шкурах. У нас дамоўленасць з Арцёмам. Ён ужо з паўгадзіны там. Праз гадзіну нам трэба ўстаўляць дыск у CD-ROM.

— А?.. А?.. А?.. — у маёй галаве круцілася шмат пытанняў. — А вы не падумалі пра тое, што абласакар, ну... тэлепартацыя можа быць абмежаванай. Скажам, туды і назад, а потым — толькі туды!

Алік перастаў карміць рыбак. Я бачыў, што ён захваляваўся, але голасам гэтага не паказаў:

— Мы пра гэта не падумалі, і вы не думайце. Арцёму і SMSку не трэба пасылаць. Ён узяў з сабою крэйду, каб дакладна пазначыць тое месца, куды апусціцца.

— А яшчэ ліхтарык[1] узяў, — бадзёра дадала да Алікавых слоў Натка, але на яе твары чыталася трывога. — Ліхтарык ён хоча падарыць Лянку. А калі раптам там здарыцца штосьці небяспечнае, ён яшчэ і газавы балончык з сабою прыхапіў. Будзе бараніцца.

«Ага-а, у стагоддзе, дзе яшчэ не скінулі шкуры, з газавым балончыкам, — думаў я. — Што заўгодна там можа адбыцца!» І я сеў побач з Наткай. Алік таксама падышоў да нас, апусціўся ў крэсла, што стаяла побач з канапай, і сказаў:

— Гэта была Арцёмава ідэя: з будучыні перадаць насенне ў мінулае. І ён гэта зробіць, калі цяпер лён называецца імем таго, каму Арцём хоча перадаць насенне. Таго ж хлопца ў шкуры з доўгімі валасамі звалі Лянок.

— Ну, канечне ж, — сказаў я. — Арцём перадасць насенне, калі ўжо ён перамясціўся туды, у тую пячору, але, каб з лёну вырабіць тканіну, трэба ведаць, як яго апрацоўваць. Існуе спецыяльная тэхналогія.

— Не хвалюйцеся, — Натка падхапілася з канапы, хутка падышла да стала і зашамацела нейкімі паперамі, раскладзенымі на ім. — Вось глядзіце, Арцём усё прадугледзеў. — Яна ўзяла ў рукі аркуш, амаль ватман, і пачала чытаць. — Валакно гэтай расліны служыла асноўнай сыравінай для вырабу тканін. Для атрымання валакна саломку лёну рассцілалі на лузе, альбо на пожні, звычайна ў канцы жніўня ў час вялі-

---

[1] Некалькі гадоў таму назад археолагі пры раскопках адной са стаянак першабытных людзей сярод рэчаў хатняга ўжытку знайшлі выключна незразумелую рэч, якая чымсьці нагадвала сучасны ліхтарык. Тая рэч засталася загадкай. А раптам гэта і на самай справе быў ліхтарык, які Арцём падарыў Лянку?!

кіх рос. Потым яе замочвалі, сушылі, мялі церніцай, трапалі траплом, часалі грэбенем. Атрыманую кудзелю пралі пры дапамозе прасніцы і верацяна ці на калаўроце. — Натка паглядзела на мяне, маўляў, ну што, чулі? І сказала: — Гэта ўсё Арцём выпісаў з этнаграфічнай энцыклапедыі. Ксеракопію ўзяў з сабою, будзе Лянку ўсё гэта тлумачыць. Тут на стале і шмат самых розных чарцяжоў ляжыць. Зірніце...

«Вось дык Арцём! — думаў я. — І калі толькі паспеў збегаць у бібліятэку! Наўрад ці ў яго дома была этнаграфічная энцыклапедыя. Пасля наведвання Зямлі-2 ён толькі і жыў марамі пра падарожжы да далёкіх планет, а тут аказваецца, што веданне этнаграфіі роднага краю справа далёка не апошняя. Цікава, што ж там за чарцяжы ў яго?!» І я падняўся з канапы, падышоў да стала, узяў у рукі адзін аркуш паперы, другі... І міжволі ацаніў Арцёмавы старанні. З цікавасцю разглядаў кросны з падрабязным апісаннем бёрдаў, нітоў, асновы, панажоў... Тут жа былі чарцяжы, апісанне і малюнкі церніцы, трапла, грэбеня, верацяна. І ўсё было зроблена надзвычай дэталёва. Я міжволі згадаў ступу, якую пабачыў у тым жытле, калі ўчора пачалі мільгаць кадры на дысплеі, перад з’яўленнем зялёнага шланга. Несумненна, там, у тым далёкім мінулым стагоддзі ёсць майстры. І калі яны змаглі зрабіць ступу, то яны змайструюць і кросны, і церніцу, маючы наглядныя дапаможнікі, якія Арцём перадасць Лянку. Напэўна, перадаў ужо! І я зірнуў на гадзіннік. Алік заўважыў гэты мой позірк і заспакоіў:

— Не бойцеся, яшчэ Арцёма выцягваць рана. Я сачу за гадзіннікам.

— І я таксама сачу, — адгукнулася Ната. — Ён яшчэ будзе там цэлых трыццаць пяць хвілін

... — Чаму вы не адказваеце? — пасля гэтых маіх слоў запытаўся Алік. — У вас жа проста разрываецца мабільнік!

Ён сапраўды разрываўся, і гэта быў доктар Савіч. Напэўна, яму карцела хутчэй дазнацца, ці забраў я ў Арцёма дыск?

А што я мог адказаць яму? Тое, што Арцём зноў — у мінулым, і я чакаю, каб ужо праз некалькі хвілін выцягнуць яго адтуль? Сказаць такое, значыцца, прымусіць доктара хвалявацца! Не-е, трэба сказаць, што дыск ужо ў мяне. Але ж пры падлетках такога не скажаш, і я вырашыў выйсці ў суседні пакой.

— Я на хвілінку, — сказаў Аліку і Натцы. — Гэта доктар Савіч. У нас важная размова.

І ўжо там, у другім пакоі набраў доктараў нумар і адразу ж заспакоіў яго:

— Я яшчэ ў Арцёма, але хутка буду выязджаць. Дыск у мяне! У доктара змяніўся голас і ён радасна паведаміў, што да яго прыехаў Антон, наш камандзір, каб паглядзець на Мыквіка, таму што, як і я, не паверыў, што яго жахлівае аблічча знікла. А яшчэ Антон сказаў доктару, што карпарацыя з Жодзіна[1] па вытворчасці зоркалётаў прапанавала нашай Асацыяцыі ажно тры новенькія караблі, і адзін з іх збіраюцца перадаць нам.

— Рыхтуйся да чарговага падарожжа, — сказаў доктар Савіч. — Думаю, дзесьці праз нейкіх паўгода зможам на суперталерцы паляцець да Вегі. Цяпер пераконваю Антона, што трэба, нарэшце, і нам, беларусам, пазнаёміцца з тым мноствам планет...

У гэты момант у суседнім пакоі пачуўся трывожны Натчын крык: «Арцём! Арцём!» І я паспяшаўся развітацца з доктарам Савічам. І як толькі — не ўвайшоў, а літаральна ўбег у Арцёмаў пакой, пабачыў, што Арцём сядзіць на падлозе. Ён увесь скурчыўся, ці то ад перапуду, ці то ад болю, але пабачыў мяне і заўсміхаўся. Мне здалося, што цераз сілу.

— Стукнуўся каленам аб падлогу, — сказаў ён. — Шланг выкінуў мяне на шафу і я адразу ж зваліўся з яе.

---

[1] Цэнтр беларускага машынабудавання, пазней спецыялізаваўся па вырабе зоркалётаў.

Я бачыў, што Арцём расцірае калена, і кінуўся да яго, аднак паспеў заўважыць, што на дысплеі яшчэ свеціцца зялёная іскрынка — ледзь заўважны след ад шланга.

— Мы не сталі вас чакаць, — пачаў тлумачыць Алік. — Ужо трэба было выцягваць Арцёма, і я ўставіў дыск у CD-ROM. І ўсё паўтарылася, як і ў мінулы раз...

Ён хацеў яшчэ нешта сказаць, але ў гэты момант пачуўся даволі гучны трэск, быццам штосьці надламалася ў камп'ютары, і ў тое ж імгненне на дысплеі з'явілася постаць зялёнага Дрэйка. Мне здалося, што яго позірк працяў мяне, а вочы, што нагадвалі дзве масліны, свяціліся такой глыбінёй, быццам яны ўвабралі ў сябе ўсю неабсяжнасць Сусвету. І зараз жа пачуўся яго голас. Дрэйк прамовіў выключна пяць слоў на сваёй пурнаскай мове і знік з экрана. Камп'ютар сам па сабе адключыўся.

— Вы бачылі! Бачылі? — закрычала Натка. — Гэта быў зялёны Дрэйк?! Ага-а?! Дрэйк?

— Штосьці напэўна здарылася з дыскам! — затрывожыўся Алік.

Я падбег да камп'ютара, выцягнуў дыск з CD-ROMа, пакруціў яго ў руках, потым зноў уставіў і ўключыў камп'ютар...

— Што вы робіце?! — Арцём ужо стаяў каля мяне. — Зараз замільгаюць кадры і з дысплея вытыркнецца зялёны шланг!

Але кадры не замільгалі і ніякага зялёнага шланга не з'явілася. Затое зноў у камп'ютары штосьці суха трэснула, пасля чаго на экране вымалявалася постаць зялёнага Дрэйка. Ён прамовіў усё тыя ж пяць слоў на сваёй невядомай нам мове...

Я стаяў, бы аглушаны. Што ўсё гэта можа значыць? І адказ быў толькі адзін: перамясціцца ў іншую прастору з вяртаннем назад можна было толькі два разы. Відаць, пра гэта і паведамляў зялёны Дрэйк, але каму?! Падлеткі стаялі, як

зачараваныя, пазіралі на камп'ютар, быццам чакалі яшчэ нечага, а я выказаў уголас свае думкі:

— Вось яна і разгадка, чаму Дрэйк і яго сыны не скарысталі магчымасць перамясціцца ў іншае месца. У Дрэйка было два сына, але ў сыноў былі жонкі і дзеці. А абласакар, як гэта ўсё назваў зялёны Дрэйк, быў разлічаны толькі на дваіх.

— І атрымалася, што пашчасціла Арцёму, — быццам падвяла рысу пад усім, што здарылася, Натка. — Ён не толькі перамясціўся ў мінулае, да нашых пращчураў, але яшчэ і перадаў туды насенне лёну.

Арцём зірнуў на мяне, і ў яго позірку была нейкая вінаватасць, маўляў, прымусіў вас хвалявацца! І тут жа ён сказаў, быццам апраўдваўся:

— Калі б я гэтага не зрабіў, магчыма цяпер у нас на Беларусі і не рос бы лён.

І з ім нельга было не пагадзіцца.

## *Замест эпілога*

Доктар Савіч яшчэ доўга запэўніваў мяне, што ў яго было надта вялікае жаданне перанесціся ў мінулае, але што зробіш... І ўсё ж, калі я прыязджаю да яго на сядзібу, я заўжды бяру з сабою дыск, каб разам з доктарам па мажлівасці сесці да камп'ютара... І як толькі на дысплеі з'яўляецца постаць зялёнага Дрэйка, мне пачынае ўяўляцца блакітнае мора квітнеючага лёну. І як шкада, што дзесьці там, на Шэрай Непрыветлівасці, сам Дрэйк, безумоўна ж, нават не здагадваецца, што міжволі з яго дапамогай мы можам бачыць гэты цуд — лён цвіце! І нават вырабляць з яго тканіну.

### Пытанні і заданні

1. У чым, на вашу думку, асноўныя адрозненні аповесцей А. Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» і Р. Баравіковай «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка»? Якая з іх

трымае чытача ў большым напружанні і чаму? Якая больш блізкая вам па змесце і перажываннях?

2. Напэўна, вы ўжо знаёміліся з кнігай «Казкі астранаўта» Р. Баравіковай, у якую ўваходзіць фантастычная аповесць «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка», на ўроках пазакласнага чытання ў сёмым класе. Тады вы ведаеце, што ў фантастычным творы апісваюцца падзеі, немагчымыя ў рэальным жыцці. Такая літаратура адкрывае таямнічыя, нязведаныя сферы жыцця (часцей за ўсё касмічныя, часавыя, прасторавыя), дае штуршок нашай фантазіі, дазваляе апынуцца ў свеце цудаў, так патрэбных чалавеку ў дзяцінстве, і не толькі ў ім. Вы маглі заўважыць, што кніга Р. Баравіковай вострa сучасная, але адрозніваецца ад прывычных для інтэрнэта сюжэтаў пра «зорныя войны» і іншых «стралялак» тым, што космас ў беларускай пісьменніцы не варожы чалавеку, яго насельнікі дапамагаюць адно аднаму, разам супрацьстаяць катастрофам, якіх у сусвеце нямала. Сусветны розум імкнецца да гармоніі і дабра — вось асноўны пафас твораў Р. Баравіковай. Яна вучыць гуманнасці, вернасці сяброўству, смеласці і ўменню прымаць неардынарныя разумныя рашэнні ў самых незвычайных сітуацыях.

Казка «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка» вылучаецца сярод іншых «Казак астранаўта» не толькі арыгінальнымі паваротамі фантастычнага сюжэта, але і нацыянальным зместам, сцвярджэннем непарыўнага адзінства мінулага і будучыні. Сцісла перакажыце гэтую казку.

3. Ахарактарызуйце галоўных персанажаў твора: камандзіра астранаўта Сымона, падлеткаў Арцёма, Аліка, Натку, доктара Савіча. Як характарызуе доктара эпізод з дзіўнай істотай Мыквікам?

4. Раскажыце трагічную гісторыю зялёнага Дрэйка. Якую ролю ў творы адыгрывае гэты вобраз, якую ідэйную нагрузку нясе? Як праз яго асэнсоўваюцца праблемы дабра і зла, хаосу і гармоніі?

5. Якую ролю ў творы маюць камп'ютары, мабільнік, кампакт-дыск, пыласос? Ці можна іх лічыць дзейнымі асобамі, хай і фантастычнымі?

6. Пазнаёмцеся з казкамі «Касач — кветка чароўных музыкаў» і «Венерын чаравічак», вызначце іх жанравую адметнасць.

***Творчае заданне.*** Паспрабуйце скласці фантастычнае апавяданне пра кветку Астру. Магчыма, яна магла быць прынцэсай з далёкай планеты ці дачкой загадкавага Месяца і трапіла на Зямлю ў выніку касмічнай катастрофы?

А магчыма, творчая фантазія падкажа вам зусім іншае развіццё сюжэта ў прасторы і часе.

# ДРАМАТЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

***Уладзімір Бутрамееў***

## НОВЫЯ ПРЫГОДЫ НЕСЦЕРКІ

***Камедыя ў васьмі карцінах***

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

**Несцерка** — той самы, што і шыла ў мяшку схавае, і сухі выйдзе з вады, што сто год па зямлі ходзіць, а ўсё яшчэ малады.

**Пшэбыеўскі** — пан багаты, што той чорт рагаты, вус тырчком, галава стручком, з Парыжа фрак, у кішэні пятак, адным словам, франт.

**Бургамістр** — мясцовая ўлада, прыгажэй за таго гада, нос на семярых рос, сам як сава, затое дужа разумная галава.

**Кудрачок Пятро** — былы пісар, у маладосці хітры мужычок, у жыцці здаралася ўсяляк, і плакаць і скакаць мастак.

**Кацярына** — яго дачка, прыгажэй за ўсіх дзяўчына, вусны што малінка, бровы як сярпочкі, вочы што тыя вішні, каму хочаш зблытаюць мыслі.

**Маланння** — маладуха, нібы тая медавуха, ды ўсё ж глядзі, пальца ў рот не кладзі.

**Брындзюкоўна** — жонка бургамістра, на расправу быстра, але здараецца, і сама трапляецца.

І каго там яшчэ толькі не было:

**Андрэй.**

**Кухар панскі,** татарын.

**Салдат Іван**, Маланнін муж.

**Манах.**

**Яцак,** карчмар.

**Адзін з мужыкоў.**

**Пастух.**

**Слуга.**

**Салдат.**

**Дзяўчаты-танцоркі.**

**Музыкі. Вартаўнікі.**

**Лакеі. Гараджане.**

**Стражнікі.**

## КАРЦІНА ПЕРШАЯ

**Карчма. Злева прылавак, за ім Я ц а к прыбірае посуд. За адным са столікаў сядзіць, апусціўшы галаву, К у д р а ч о к. Больш нікога няма. Потым уваходзіць Н е с ц е р к а, перад гэтым чуваць, як ён пяе.**

Н е с ц е р к а. Туды еду — сюды еду, карчмы не мінаю. Які чорт яе прыдумаў — далібог, не знаю. Эгей, Яцак, здароў! Што гэта ў цябе сёння гэтак ціха? Нясі сюды цэлы кумпяк ды палову вядра заціркі. Даўно табе вінен не быў.
Я ц а к. У доўг — смалы б табе гарачай у глотку! Думаеш, не памятаю кірмаш? Ты што ж гэта мне прадаў?
Н е с ц е р к а. А тое і прадаў, што ты купіў — на тое і кірмаш. Ды не сярдуй — грошы тыя я ж зноў да цябе ў карчму прынёс. Вядома — грошы. Сёння ў мяне, назаўтра ізноў у цябе. А багацце тваё — галоўнае, неразменнае — пры табе ж засталося ***(хлопае Яцака па жываце).***
Я ц а к ***(б'е Несцерку ручніком).*** Ах ты прайдзісвет! Зубаскал галодны! Без грошай не лезь у карчму!
Н е с ц е р к а. Ды як тут не зойдзеш, калі яна якраз ля дарогі стаіць!
Я ц а к. Я цябе! ***(Б'е ручніком).*** Сабака, валацуга.
Н е с ц е р к а. Цішэй, цішэй, а то растрасеш багацце сваё, неразменнае.

**Кудрачок звяртае ўвагу на шум і пазнае Н е с ц е р к у, падбягае.**

К у д р а ч о к. Несцерка? Ты? ***(Адпіхае Яцака).*** Ды супакойся! Вось не чакаў сустрэць — адкуль?

Н е с ц е р к а. Ды ўсё адтуль — мімаходам. Га — дык гэта ж Кудрачок! І сапраўды, у карчме не прападзеш! Ты ж мяне галодным не пакінеш.

**Яны абдымаюцца і ідуць да стала.**

Я ц а к. Каб ты хадзіў мімаходам да самае магілы.
Н е с ц е р к а ***(прыпыняецца і звяртаецца да Кудрачка).*** Ты не ведаеш, Кудрачок, чаго карчмары такія злосныя?
К у д р а ч о к. Не магу ўцяміць.
Н е с ц е р к а. Бо ім на тым свеце надта дрэнна даводзіцца.
К у д р а ч о к. Чаму ж гэта?
Н е с ц е р к а. З іх пузам больш як па адным у кацёл не ўлазяць — вось і кіпяць у адзіноце, няма з кім і словам перакінуцца.

**Смяюцца і ідуць за стол, садзяцца.**

Я ц а к. У астрог бы ўсіх валацуг, я табе пакажу той свет — сам у пекле будзеш.
Н е с ц е р к а. Ну, дзякуй, гусінае пяро! Дай табе Бог чарніла і паперы! Расказвай, як жывяце, можаце.
К у д р а ч о к. Ат, што мы... Ты з дарогі — усе навіны пры табе.
Н е с ц е р к а. Мае дарогі канца не відаць — колькі яе таптаць, адзін Бог ведае. А навіны — куды ні пайдзі — усюды людзі. Адны нараджаюцца, другія ўлюбляюцца, трэція на пагост збіраюцца. Усе пад сонейкам таўкуцца, а яно свеціць усім аднолькава.
К у д р а ч о к. Эх, брат, не аднолькава... А ты, я бачу, не змяніўся, усё весялішся...
Н е с ц е р к а. А бедаку толькі і застаецца на гэтым свеце, што з гора павесяліцца. А ты што галаву схіліў? Памятаеш, як вытраліся на кірмашах?
К у д р а ч о к. Эх, браток, мне ўжо пара з кірмаша... Не тыя гады.
Н е с ц е р к а. Якія гады? Гэта ўсё ад твае граматы. А цяпер чым прасцей, тым і пражыць лягчэй. Вось я — толькі да дзесяці лічыць магу — і то калі грошы. А колькі там мне год — і не цікавіўся.
К у д р а ч о к. Яно і не толькі ў гадах справа...

Несцерка. Кінь!
Кудрачок. Эх, Несцерка. Заблыталі, брат, мяне.
Несцерка. Хто ж цябе заблытаў?
Кудрачок. Ат, не след і расказваць... Так, душу адвесці... Падлавіў мяне Пшэбыеўскі, што таго карасіка.
Несцерка. Стары дурань Пшэбыеўскі — цябе?!
Кудрачок. Стары ўжо паўгода як Богу душу аддаў.
Несцерка. Трэба Богу ягоная душа, як мне баба ў каноплях.
Кудрачок. Ну, значыць, чорт прыбраў.
Несцерка. Іншая справа. Нікому так не добра, як пану ў пекле. Куды ні глянь — усюды свае.
Кудрачок. Цяпер сынок яго з Варшавы прыехаў. А мяне чорт штурхнуў — захацеў пабагацець. Узяў казённыя грошы, звязаўся з гандлярамі — абяцалі барыш, атрымаўся шыш. Ледзь у астрог не трапіў. Вось Пшэбыеўскі і даў — і купіў мяне з вантробамі.
Несцерка. Тае бяды. Доўг — не вяроўка, не парвецца.
Кудрачок. Не вяроўка, а шыя ў пятлі. Не проста ён грошы даў — прыглянулася яму мая дачка — Кацярынка. Патрабуе замуж за сябе.
Несцерка. А яна што ж — не хоча?
Кудрачок. Эх, там таго пана... і нораў што ў казла — ніводну бабу не прапусціць. І вытварае — то коней арабскіх заводзіў, цяпер тэатр нейкі прыдумаў. З такім пажывеш — намучышся. Ды ўсё ж пан. За ім босая хадзіць не будзе. Яно і да лепшага. Але штось грызе мяне, нешта неяк не па сабе.
Несцерка. Э, братка, не звяртай увагі, гэта сумленне. Самая непатрэбная рэч на свеце. Людзі без яго за мілую душу абыходзяцца. І табе, калі ў падпанкі сабраўся, яно таксама не трэба.
Кудрачок. Чаму ты так рашыў?
Несцерка. Таму што бачу — круціш. Каб захацеў — паслалі б мы твайго жаніха да чорта — ці нам упершыню?

К у д р а ч о к. Э, браток, у цябе ні кала, ні двара, па свеце гойсаць лёгка. Але ты не падумай...
Н е с ц е р к а. А што мне думаць, ад думак галава босай становіцца. У мяне свой клопат. Заўтра кірмаш, а ў мяне ў кішэні толькі вош на прывязі, ды і тая галодная. ***(Дастае з торбы варону. Яна каркае. Звязвае ёй дзюбу ніткаю).*** Вось, галубка, каб не хвалілася, хто ты і адкуль.
К у д р а ч о к. Навошта табе варона?
Н е с ц е р к а. Не будзь сам варонай, спатрэбіцца і варона. Дзе мае фарбы? ***(Дастае з торбы фарбы).*** Зробім з цябе птушку заморскую, як ні кажы — кірмаш!

## КАРЦІНА ДРУГАЯ

**Кірмаш, шмат людзей. Усе гандлююць хто чым. Справа гандляр у дзіўнай накідцы-халаце і чалме. Гэта Н е с ц е р к а . Перад ім Б р ы н д з ю к о ў н а са слугою.**
Н е с ц е р к а. Які колер! А як выглядае, як трымаецца! Толькі сапраўдны пан можа трымаць у сябе гэткую птушку. Гэткія ў вашы краі і не залятаюць. Адно слова — заморская!
Б р ы н д з ю к о ў н а. Палова сотні і за заморскую занадта.

**Вакол збіраюцца людзі.**

Н е с ц е р к а. Гэ! Палова сотні за яе і не грошы. У самога індыйскага імператара жыве. Канечне, хто не панскае пароды, той не ацэніць, не зразумее. Ну дык бераце?
Б р ы н д з ю к о ў н а ***(азіраючыся на людзей).*** Канечне, бяру — я ж адразу бачу, што заморская.

**Аддае грошы, слуга забірае птушку.**

Н е с ц е р к а. Толькі з павагі да вас, яснавяльможная пані, і аддаю. Калі яшчэ ў вашых краях будзе магчымасць заморскую птушку набыць.

**Б р ы н д з ю к о ў н а выходзіць. Несцерка аддае аднаму з мужыкоў (гэта П я т р о К у д р а ч о к) сваю чалму і халат, падыходзіць з ім да гандляроў з пірагамі.**

Ну вось, Пятро! ***(Аддае яму грошы).*** Палова сотні ёсць. Я ж казаў — са мною не прападзеш, хаця гора і цяпнеш. Але ў астрозе сядзець не будзеш. Назбіраем яшчэ адзін чырвонец — вось і ўся твая нядоімка. ***(Купляе пірог, дае палову Пятру).*** Крыху паштурхаемся сярод людзей, глядзіш, і яшчэ чырвонец набудзем.

К у д р а ч о к. Век Бога за цябе мне маліць, як і разлічуся з табою, не ведаю.

Н е с ц е р к а. Аб гэтым не турбуйся. Пусціш добрага чалавека з дарогі пераначаваць — вось і ўвесь доўг, дасі жабраку грош — вось і квіты, плюнеш пану ўслед — вось і разлічыліся. А ўжо калі што — вугалькамі на тым свеце разлічымся.

К у д р а ч о к. Вугалькамі? Няўжо мы з табою ў пекле будзем? Нас за гэтае гаротнае жыццё ў рай пасля смерці трэба.

Н е с ц е р к а. Не па кішэні нам туды квітанцыю купіць. У рай, браток, толькі тых пускаюць, у каго кішэня поўная.

К у д р а ч о к. А нам поп на пропаведзі наадварот казаў.

Н е с ц е р к а. Казаць ён казаў, а ў самога бруха — во! Трох гэткіх, як ты, трэба. Паглянь, а вунь і яшчэ адзін. Мала яму касцёла — і да ярмаркі дабраўся.

**У гэты момант з’яўляецца М а н а х . Ён залазіць на калёсы, падымае рукі.**

М а н а х . Браты! Браты, спыніцеся!

**Усе здзіўлена глядзяць на М а н а х а .**

Браты! Успомніце пра Бога! Успомніце пра душу. Праз уцехі зямныя не згубіце царства нябеснага. Грошы, што на рынку нажылі, вуголлем гарачым будуць гарэць у пекле пад катламі грэшнікаў.

**Усе здзіўлена, у розных паставах, слухаюць Манаха.**

Забудзем дарогу сюды. Збярэм нашыя грошы на касцёл — райскімі птушкамі будуць звінець яны ў садах эдэмавых. Па загаду самога папы Рымскага пачалі будоўлю новага касцёла Святога Пятра — не пашкадуйце на Божую справу!

**Манах злазіць з калёсаў і з квартаю абыходзіць людзей. Чуваць галасы: «А што, і сапраўды, і пра душу падумаць трэба!»**

Не пашкадуйце, на тым свеце ўсё залічыцца.

**Многія кідаюць грошы ў кварту. Манах падыходзіць да Яцака-карчмара. Той бокам адыходзіць ад яго.**

Не пашкадуй, сын мой, на Святога Пятра.
Яцак. Няма, няма ў мяне.
Несцерка. Га, пачакай, пачакай, як гэта — няма? З усіх цягнеш — і няма? Бач, бруха ненасытнае. Усё яму ў карчму як у прорву, а як Пятру дык фігу! ***(Б'е Яцака па кішэні, там звіняць грошы).*** А гэта што? Ану, высыпай на Пятра.

**Усе шумяць: «Правільна, правільна. Не ўсё ж у карчму, трэба і пра душу падумаць».**

Ды не трасіся ты гэтак над грошмі. За поясам у цябе заўсёды чырвонец, я ж ведаю!

**Тузае Яцака за пояс, сыплюцца грошы, людзі збіраюць іх у кварту Манаху. Яцак уцякае.**

Манах ***(да Несцеркі).*** Дзякую, сын мой. Ведай, стараннасць твая не прападзе.
Несцерка. Яшчэ б, прапала. Але адным дзякуй не абыдзешся. ***(Забірае ў Манаха кварту з грашыма).*** Ды тут два чырвонцы будзе, не менш. Людцы добрыя! І навошта святому Пятру грошы? Яму ж ні падаткаў плаціць не трэба, ні дзетак карміць. І нядоімкаў у яго няма. А вось сябра мой — таксама Пятро, толькі зямны, гэткі ж бедалага, як і мы, — у астрог

трапіць можа за нядоімку, а ў яго ж сем дзетак. Лепш аддадзім яму гэтыя грошы, а Пётр святы пачакае.

Манах. Но-но! Ты хто такі, каб тут камандаваць?!

Несцерка. А ты хто такі?

Манах. Я ад самога папы Рымскага!

Несцерка. Папа далёка, хто цябе ведае, раптам ты не ад яго.

Манах. Як гэта не ад яго?! Вось і грамата і пячаць!

Несцерка. Мы людзі непісьменныя, у граматах і пячацях не разумеем. Надта ж ты малады?

Манах. З пяці год я ў келлі. Дваццаць год вучыўся святой мудрасці.

Несцерка. Дык, значыць, ты манах вучоны?

Манах. Пісанне ведаю я з пачатку ў канец і з канца ў пачатак. І ўсе словы святых нашу ў душы сваёй.

**На Манаха не зважаюць. Галасы: «А ты, Несцерка, шмат дзе пабываў. Дык раскажы нам, што там, на белым свеце, творыцца? Што новага?»**

Несцерка. Ды ўсё па-старому. Куды ні пайдзі — усюды людзей многа, а паабедаць няма дзе. Гэтак і хаджу, часам з квасам, парою з вадою, а калі добрыя людзі накормяць — то і слава Богу.

**Галасы: «А праўда, што ты і да яго самаго, да Бога, заходзіў!»**

Чаму ж не зайсці, калі па дарозе? Заходзіў.

**Галасы: «Дык раскажы, як ён там?»**

У Бога спраў многа. Прыходжу гэта я — гляджу, аж, браточкі мае, — сядзіць наш Бог ля печкі, лапці пляце. Госпадзі, пытаю, няўжо ў цябе ботаў няма? «Ёсць, кажа, але новыя, ціснуць. А мне даўно трэба на зямлю сходзіць, праверыць, як там апосталы ўпраўляюцца. У лапцях, яно, ведаеш, лепей. Ды вось, — кажа, — ніяк да канца даплесці не магу. Ну,

а што там у вас на зямлі? — пытае ў мяне. — Ці ў парадку правасуддзе, ці не забываеце сумленне, дабрадзейнасць?» Усё ў парадку, кажу. Правасуддзе ў турме сядзіць, сумленне ахрыпла, дабрадзейнасць жабруе на дарозе — адным словам, кажу, — жывём пакрыху.

**Галасы: «Малайчына! Бач, як закруціў! Малайчына!»**

Ну, пагутарылі мы пра тое-сёе, да вечара амаль сплёў ён лапці — крышачку толькі засталося. А ноччу, братачкі мае, чую: нешта шамаціць — гляджу: аж гэта святы Пётр лапці пакрыху расплятае!

**Галасы: «Вось табе і на! Чуе кошка, чыё мяса есць!»**

Вось-вось! Так гэтыя лапці і плятуцца па сённяшні дзень.

**Галасы: «Ты б параіў!»**

Ат, свой грызіся — чужы не лезь. Не стаў я мяшацца ў гэтую блытаную справу. Прыхапіў боты ды ў ногі. А боты — якраз па назе прыйшліся. ***(Ставіць нагу ў боце на калёсы).***

**Галасы: «Ай ды Несцерка! Малайчына! Не прамаргаў!»**
**Несцерка злазіць з калёсаў, абдымае Пятра.**

Ну, пойдзем, браток.

Пётр ***(глядзіць на боты).*** Няўжо ад самога Бога боты?

Несцерка. Ад яго самога.

Пётр. Добрыя боты. Я свае ўжо год як прадаў. Ды з ботаў толку мала. Ты б лепш спытаў у Бога рубель неразменны...

Несцерка. Толку мала, а нагам усё ж прыемна. А рубель неразменны мне Бог даўно выдаў.

Пётр. Дзе ж ён?

Несцерка. Вось тут ***(пляскае сябе далонню па лбе).*** З гэткім рублём, браток, не прападзеш, яго і не згубіш, і злодзеі з кішэні не выцягнуць. І нядоімку з ім сабралі, га?

**Уваходзяць стражнікі і Яцак.**

Яцак *(паказвае на Несцерку).* Вось ён! У мяне ў карчме гэтую птушку і маляваў!

Стражнікі. Ага, папаўся! Будзе табе птушка заморская! *(Хапаюць і выводзяць Несцерку).*

Пётр. Людзі, дапамажыце — добрага чалавека ў астрог пацягнулі!

**Людзі разыходзяцца хто куды. Застаецца адзін Манах.**

Манах. Добраму чалавеку толькі ў астрозе і месца!

## КАРЦІНА ТРЭЦЯЯ

**Памяшканне ратушы. Стол, за сталом Бургамістр. Вокны выходзяць на плошчу. Уваходзіць Маланння.**

Маланння. Дзень добры, пан бургамістр.

Бургамістр. Дзень добры, пані Маланння! *(Выбягае насустрач, садзіць яе ў крэсла. Маланння дастае веер і пачынае абмахвацца).*

Маланння. Да вас не прабіцца, кожнаму растлумач — навошта, ды яшчэ глядзяць, каб пятак выцыганіць.

Бургамістр. На тое яна ўлада, што не лёгка да яе трапіць, пані Маланння. З якой гэткай патрэбай прыйшлі?

Маланння. Даўно не бачыла пана бургамістра, засумавала.

Бургамістр. Жартуеце, жартуеце, пані Маланння. Чуў, усё больш іншым сваю ўвагу аддаяце.

Маланння. Дзе ж там іншым, усё вас ніяк з галавы выкінуць не магу.

Бургамістр. Няўжо?

Маланння. Усё думаю, калі ж гэта пан бургамістр абяцанне свае выканае?

Бургамістр *(як бы не разумеючы).* Якое абяцанне?

Маланн я. А паперу пра скасаванне шлюбу аформіць.
Бургамістр. Якую такую паперу?
Маланн я. А тую самую, што пісалі ў мяне.
Бургамістр. Штосьці не памятаю. ***(Бярэ з рук Маланні паперу).*** Даўно не прыходзілася быць у пані Маланні, даўно ў госці не запрашала — не памятаю, дык жа яна і без пячаткі?
Маланн я. Вось па пячатку і прыйшла.
Бургамістр. А навошта пані Маланні гэтая папера спатрэбілася?
Маланн я. А надакучыла ў саламяных удовах хадзіць, папрокі слухаць, што гонар мужа не зберагаю, ды тырана свайго не чакаю — калі ён вернецца, каб здзекавацца з мяне.
Бургамістр. Гэта хто ж папракае пані Маланню — ды і за што ж гэта такое?
Маланн я. А за тое, што ў госці заходзяць.
Бургамістр. А хто ж гэта заходзіць?
Маланн я. А ваша светласць не прыпомніць?
Бургамістр. Гм-м, каму ж гэта быць? Калі я заглядваў, дык жа ціхенька, ціхенька. А вось калі хто не тройках пад’язджае, тут без шуму не абыдзешся...
Маланн я. Хто ж гэта такі на тройках пад’язджае?
Бургамістр. Вось не ведаю, не ведаю. Што людзі кажуць, то кажуць. Мо для гэтага госця і папера тая патрэбна?
Маланн я. Вы прыдумаеце, дык прыдумаеце. І прыйдзе ж гэткае ў галаву.
Бургамістр. Прыдумваць не трэба — людзі скажуць. Ва ўлады ўсюды і вуха, і вока. І ўчора, і трэцяга дня...
Маланн я. Дык вы што, сачыць за мною?!
Бургамістр. Не тое каб сачыць, у мяне свая карысць...
Маланн я. Што ж, пан бургамістр ад свайго абяцання адказваецца?
Бургамістр. Чаму ж адказваюся? Даўно было, запаматаваў. Каб крыху прыпомніць — хаця б увечары. А то ж незаконная папера — адказчыка ж няма.

Маланне. А калі я прыпомню пану бургамістру, як гэтага адказчыка па фальшывых паперах у салдаты забралі?
Бургамістр. Навошта гэта?
Маланне. А каб пан бургамістр успомніў, як такія паперы пішуцца.
Бургамістр. Гэта не абавязкова, гэта нікому не трэба.
Маланне. А можа, каму і цікава, што ў вас тут робіцца?
Бургамістр. Не варта, не варта. Ці ж мы паміж сабою не паладзім?

**Чуцен шум. Бургамістр прыслухоўваецца. Чуцен голас Брындзюкоўны: «Бургамістаршу! У горадзе! Не, здаецца не ён, той у чалме быў!»**

Эх, чорт, пані Маланне, схавайцеся за шафу. На хвіліначку, на хвілiначку.

**Маланне хаваецца за шафу. У пакой уваходзяць стражнікі, Яцак, Несцерка, Брындзюкоўна.**

Яцак. Ён, ён самы, у мяне ў карчме...
Брындзюкоўна. Не. Той у чалме быў.
Яцак. Ён, ён.
Бургамістр. Ціха! Ціха! Разбярэмся! А вы — марш у сені!

**Яцак і стражнікі выходзяць.**

Бургамістр ***(да Несцеркі).*** Хто такі?
Несцерка. Чалавек.
Бургамістр. Бачу, што не баран. Адкуль?
Несцерка. Прахожы.
Бургамістр. А пашпарт у цябе ёсць?
Несцерка. Няма, ваша светласць.
Бургамістр. Ага! Дзесьці я цябе бачыў. Дык як жа так? Чаму без дакумента?
Несцерка. Бог мяне з таго запечка на гэты свет без пашпарта выпусціў — гэтак і хаджу.

Бургамістр. А ты ведаеш, што бяспашпартнаму валацузе бывае? Які ты без пашпарта чалавек? Ведаеш, што я магу з табою зрабіць, калі ты без дакумента?!
Несцерка. А што са мною зробіш. Мужыка ніжэй, чым ёсць, не разжалуеш.
Бургамістр. Маўчаць! Ты з кім размаўляеш? Я тут — улада! А ты ведаеш, што гэта такое? ***(Выходзіць з-за стала і падносіць да носа Несцеркі кулак).*** Астрогам пахне! Хто ў горадзе гаспадар? Мне і Пшэбыеўскі не ўказ! Перада мною ўсякі шапку здымае! Усякі дрыжыць перад уладаю! На тое і ўлада, каб баяцца. ***(Падымае палец угару).*** Улада...

**Бryндзюкоўна ходзіць па пакоі і ў гэты момант бачыць за шафаю Маланню.**

Брындзюкоўна. Ах ты, паганец, ах ты, казёл ненажэрны, ты ўжо ў ратушы з ёю круціш! Увесь горад ведае! Людзі ў вочы кажуць, паганец!

**Кідаецца да мужа, той хаваецца пад стол. Брындзюкоўна б'е кіем па стале, налятае на Маланню, хоча яе ўдарыць кіем, але тая не даецца.**

Ах ты, макрахвостка, мала, што да цябе палова горада ходзіць, дык ты і да майго?!
Маланння. Бач, шалёная, з ланцута, дурніца таўстапузая!
Брындзюкоўна. Сучка, сучка ты!
Маланння. Ханыга рылатая!
Брындзюкоўна. Макрахвостка, вернецца Іван, ён цябе...

**Несцерка хоча разняць жанчын.**

Несцерка. Ціха, ціха, бабы, бач, не падзялілі. Ціха, гэй, ціха!

**Несцерка становіцца паміж жанчынамі. Брындзюкоўна б'е кіем і трапляе яму па галаве ў той самы момант, калі ён паварочваецца да Маланні.**
**Несцерка падае.**

А-а-а, забілі!

**Абедзве жанчыны схіляюцца над ім, стукаюцца лбамі.**

Маланння ***(прыкладае пятак Несцерку да галавы).*** Бач ты, як трапіла, карова таўстамордая — напавал!
Бryндзюкоўна. Вось бы цябе гэтак у лоб!
Маланння. А вось табе — бачыла?

**Паказвае фігу. Брындзюкоўна размахваецца, хоча ўдарыць, Несцерка падымаецца — і ўдар зноў дастаецца яму.**

Несцерка. Заб'е — далібог, заб'е — лепш ужо ў астрог!
Маланння. Супакойся, чалавека заб'ем, мардавароціна! І як толькі мужа жывога яшчэ трымаеш?
Брындзюкоўна. А не твой клопат, не разявайся на чужое!
Маланння. Патрэбен ён мне!
Брындзюкоўна. А непатрэбен, дык і нечага бегаць!
Несцерка. Ціха, ціха, бабы, ціха, гаспадынька.
Брындзюкоўна. А чаго гэтая макрахвостка лезе да чужога!
Несцерка. Ціха, гаспадынька, — дай слова сказаць. Не так сабе мы зайшлі — я вось да яе работнікам наняўся. Паперу трэба выправіць на гэта...
Брындзюкоўна. Ёй бы жарабца ў работнікі!
Маланння. А цябе б самую замест валоў запрэгчы.
Брындзюкоўна. А ты...
Несцерка. Ціха, ціха, вось напіша пан бургамістр паперу — мы і пойдзем. Гэй, ваша светласць, вылазь!
Бургамістр. Не крычы! Тут я гаспадар! Дзе хачу, там і сяджу.
Маланння ***(дастае свае паперы).*** Стаўце пячатку!

**Бургамістр вылазіць, ставіць пячатку. Маланння хоча забраць паперу, але ён не дае.**

Бургамістр. Гэта яшчэ ў пісара запісаць трэба. І пошліну заплаціць. Прыходзьце заўтра.

Маланн я. Пішыце што трэба — колькі да вас хадзіць!
Бургамістр. Пойдзем, калі пісар на месцы — усё і афармім. ***(Да Несцеркі).*** А цябе я дзесьці бачыў.

**Бургамістр выходзіць разам з Маланняй.**

Брындзюкоўна. Вось верціхвостка! Вось няшчасце на маю галаву, сораму — на ўвесь горад! Гэта ж падумаць — мяне, бургамістаршу, на гэтую верціхвостку памяняць!
Несцерка. Э-э, хто без граха. Чужая жонка мёдам мазана, а свая смалой.
Брындзюкоўна. Божа, замучылася. Раней, калі гандлявалі, як добра ўсё было — а як вылезлі ў гэтыя бургамістры — і пайшло, і паехала, і пакацілася!
Несцерка. Здараецца. Ад вялікага звання кроў пачынае кіпець. Але ёсць ад гэтага адзін сродак...
Брындзюкоўна. Які сродак? Што толькі я ні рабіла — і травы варыла, і да шаптух хадзіла — які сродак скажы, мілы чалавек?
Несцерка. Сродак верны. Але задатачак бы наперад...
Брындзюкоўна. Наперад толькі дзеўкі жэняцца. Калі дапаможа — не пашкадую грошай, век памятаць будзеш.
Несцерка. Ды я цябе і так не забуду ***(мацае галаву).*** Ну, добра, слухай. Уся бяда ад трох сівых валасін, што выраслі ў твайго мужа пад барадою. Трэба выразаць іх — і ні на каго, акрамя законнай жонкі, і не гляне.
Брындзюкоўна. А як жа гэта зрабіць?
Несцерка. Кухонным нажом. Навастрыць перад гэтым, і тры разы плюнуць на яго — інакш не атрымаецца. Ну, а мужа падпаі — каб не пачуў.
Брындзюкоўна. Ну, гэта ўжо не дурніца, сама ведаю. ***(Бягом бяжыць да дзвярэй).***
Несцерка. Гэй, куды так хутка? Вось праўда, ахвота горш няволі. ***(Мацае галаву).*** У-у, як дала, а? Ну ды ладна — будзе і табе «сродак».

## КАРЦІНА ЧАЦВЁРТАЯ

**Добра прыбраны пакой. За перагародкай бачны ложак, стол, шафа, буфет, насупраць печка. Частка сцэны — вуліца, ганак, насупраць відаць лесвіца на гару, бачна адрына. Сцяна хаты выходзіць на першы план так, што заслона можа закрываць толькі частку сцэны — вуліцу або хату. У пакоі Маланн я. Яна паглядае ў акно, кагосьці чакае.**

Маланн я ***(пяе).*** Не закрыю на ноч дзверы,
Няхай будзе халадок.
Каб хадзілі кавалеры
І насілі мне мядок.

**Нехта грукае ў дзверы, Маланн я выглядае ў акно.**

А Божачка, і прынёс жа цябе чорт за пазухай ***(адчыняе дзверы).*** Пан бургамістр, рада бачыць. Праходзьце, праходзьце.

Бургамістр. Добры вечар, пані Маланння. Як жывяце?

Маланн я. Вядома ж — жыццё ўдавы невясёлае. Сядайце, калі ласка, гарбаты пап'яце?

Бургамістр. Гарбаты, ды з цукрам, а самі пані Маланння саладзей за той цукар. ***(Садзіца ля стала, хоча абняць Маланню).***

Маланн я. Вы ўсё жартуеце, а як Брындзюкоўна прыйдзе — зноў пад стол.

Бургамістр. Пані Маланння прыдумае — пад стол. Паперка патрэбная звалілася — вось і прыйшлося падняць.

Маланн я. То вы ўсе свае паперы пад стадом пішаце?

Бургамістр. Улада, пані Маланння, ведае, дзе што пісаць. Ва ўлады ўсюды клопат. Вось і да вас сягоння не так сабе.

**Бургамістр пакрыху падсоўвае сваё крэсла да Маланні, а яна пакрыху адсоўвае.**

Маланн я. Які ж у вас да мяне клопат?

**Бургамістр дастае паперку і здалёк паказвае яе. Цяпер Маланння падсоўвае сваё крэсла, а Бургамістр адсоўваецца.**

Што гэта ў вас?

Бургамістр. Ды так, паперка адна.

Маланння. Пакажыце.

Бургамістр. Із пячаткаю, і ўсё як трэба.

Маланння. Дайце, дайце паглядзець.

**Бургамістр перастае адсоўваць крэсла, Маланння падсоўваецца, потым перасядае на калені да бургамістра і забірае паперу.**

***(Спявае).*** Аддала ў салдаты Ваню,
Не качала галавой.
Была дзяўчынкаю — гуляла.
Пагуляю і ўдавой.

**Пачынае танцаваць і спяваць разам з Бургамістрам.**

Бургамістр. Для цябе стараюся,
Раскраса-красавіца,
Ты ж мяне кахаць не хочаш,
Што не падабаецца?

Маланння. Ты малы і пузаты
І нізкага росту.
Цябе трэба ўтапіць
З высокага мосту.

Бургамістр. Як мае чырвонцы брала,
Губы не крывіла,
А цяпер пускаць не хочаш,
Нячыстая сіла.

Маланння. А я грошы брала, брала.
Усё жартам выдавала.
Ды ты стары, як калода,
А я млада, як ягода.

**У час танца Бургамістр ловіць Маланню і пачынае абдымаць яе. Тут нехта грукоча ў дзверы.**

Бургамістр. Каго гэта нясе?

Маланння. Мо зноў Брындзюкоўна?
Бургамістр. Э-э, куды ж гэта мне? ***(Хоча схавацца пад стол).***
Маланння. Бач ты, прывык. Лезь сюды, потым у сенцы выкіну.

**Бярэ мех, Бургамістр залазіць. Яна завязвае і ставіць ля дзвярэй. Выглядвае ў акно, прыхарошваецца, адчыняе. Уваходзіць пан Пшэбыеўскі.**

Добры вечар, пан Пшэбыеўскі!
Пшэбыеўскі. Вітанне пані Маланні. Пані выглядае, што тая кветка, з ёю і дзень і вечар добры.
Маланння. Праходзьце, праходзьце. Я гэтак чакала, сядайце.

**Маланння дастае з печы гуся, з шафы віно. У гэты час на вуліцы з'яўляецца Несцерка, ён бачыць усё праз акно.**

Частуйцеся, калі ласка.
Пшэбыеўскі. Дзенькуем ***(падсоўвае крэсла да Маланні).*** З вашых рук, пані Маланння, — усё як мёд. А сама пані Маланння — саладзей за мёд.

**Яны выпіваюць віно.**

Маланння. Ах, як вы ўсё гаворыце, якія ў пана манеры.
Несцерка ***(на вуліцы).*** Эх, аж слінкі цякуць! Была не была — я ж да яе ў работнікі наняўся. ***(Грукоча ў дзверы).***
Пшэбыеўскі ***(спалохана).*** Цо такое?
Маланння ***(ідзе да дзвярэй).*** Каго там чэрці прынеслі? ***(Адчыняе дзверы).*** Табе чаго?
Несцерка. Што лаешся, маладзіца, — хіба забылася, як у бургамістра паперу пісалі?
Маланння. А, работнічак? Што трэба?
Несцерка. Вядома, што. Наняўся — прадаўся. З рукамі, нагамі — але і з вантробамі. А яны — вантробы — павячэраць патрабуюць. Ды і пераначаваць бы не шкодзіла.

Маланння. Бач ты — павячэраць. Але раз ужо наняўся, занясі гэты мех да бургамістра — скажаш, плата за падаткі. Ды на вось посцілку — пераспіш на сене. А як заўтра дровы ўсе паколеш, то будзе і вячэра і сняданак. ***(Дапамагае яму ўзяць мех і зачыняе дзверы, вяртаецца да стала).*** Прабачце, то хлоп.

**Заслона закрывае палову сцэны з хатаю. Засталася толькі вуліца. Несцерка нясе мех.**

Несцерка. Вось і паеў, спрытная кабетка! Але ж і цяжка, чым гэта яна такім у казну падаткі плаціць?

**Кідае мех на зямлю. Чуецца стогн.**

Эге, ды тут нехта ёсць!

**Развязвае мех, Бургамістр высоўвае галаву, Несцерка хуценька завязвае мех.**

Хто такі будзеш і як сюды трапіў?
Бургамістр. Ты што, не бачыш? Развязвай!
Несцерка. Бачыць я бачу, а развязвацьне буду.
Бургамістр. Развяжы! Я бургамістр!
Несцерка. А як дакажаш? Пашпарт ё? Няма? А ты ведаеш, што бывае з бяспашпартнымі валацугамі? Ды яшчэ ў мяху? Ты ведаеш, што я магу з табою зрабіць? Я ж цябе — раздва — і ў рэчку. Няхай там табе ракі дакументы выпісваюць, бо яны вусатыя, як валасны пісар. ***(Цягне мех па вуліцы).***
Бургамістр. Э-э, пачакай, давай па-добраму. Я табе заўтра пашпарт выпішу.
Несцерка. Патрэбны ён мне, што мерцвяку балалайка. Я лепш цябе бултых — і ў рэчку.
Бургамістр. Э-э, я табе гандляваць без пошлін дазволю.
Несцерка. І гэта мне, што казе гармонік. ***(Цягне далей).***
Бургамістр. Э, пачакай, ну што ты здзекуешся з чалавека.
Несцерка. А — і табе з бургамістраў у чалавекі захацелася? Заплач, тады адпушчу.

Бургамістр. Э-э-э... ***(Плача).***

Несцерка. Што, браток, гульнуў, як голы ў крапіве? Ну ды ладна, калі вада з вачэй яшчэ цячэ — то, можа, штось чалавечае засталося, адпушчу. Толькі памятай — прахожых больш не крыўдзі!

Бургамістр. Навошта ж крыўдзіць?

Несцерка. Эх, бачу, і ты чалавек неблагі!. Ды толькі вось не жылец ужо.

Бургамістр. Гэта чаму ж?

Несцерка. Чуў краем вуха, зарэзаць цябе хочуць. Жонка твая. Напоіць і... дамаўлялася яна.

Бургамістр. Брэшаш! З кім дамаўлялася?

**Бургамістр вылазіць з мяха і ідзе налева, а Несцерка вяртаецца да хаты Маланні, бярэ посцілку і хоча лезці на гару спаць. Але тут ззаду падыходзіць салдат Іван і хапае яго за каўнер.**

Іван. Я табе пакажу — красці!

Несцерка. Эй-э, што красці — я спаць лезу.

Іван. А хто ты такі — спаць у маёй адрыне?

Несцерка. Работнік я, наняўся дровы калоць. А ты што ж, гаспадар гэтай хаце будзеш?

Іван. Быў гаспадар, ды не паспеў вокам маргнуць, як затараканілі мяне, братка, у салдаты.

Несцерка. І што ж — адслужыў!

Іван. Эге, братка. Адтуль толькі старым ці калекам адпусцяць. Армія ідзе маршам да граніцы. Кароль суседні з царом нашым у карты гуляў — ды і хлоп яго па лысіне. Казаў, муху хацеў забіць. А цар кажа: не было ніякай мухі. Адным словам, вайна можа быць. Гэта, брат, палітыка — справа тонкая.

Несцерка. Бач ты?!

Іван. Ну пайшлі ў хату, што, табе там месца не знайшлося?

Несцерка. Хто яго ведае. Я чалавек прахожы, мне не пад плотам — і то добра. Дзе пакладуць, там і лягу, хоць і не вячэраўшы.

І в а н . Ну то і перакусім разам. Мяне ж іх благароддзе на гадзіну адпусціў — дай Бог яму здароўя, паставіў яму выпіць на апошні рубель. Эй, Маланння, адчыняй.

**М а л а н н я адчыняе дзверы, відаць, як П ш э б ы е ў с к і ха ваецца ў бочку ля печы.**

М а л а н н я ***(убачыўшы Івана).*** А-о-о-о...
І в а н . Што, касатка, — не рада?
М а л а н н я . А-о-о-о-о...
І в а н . Сядай, добры чалавек. А ты цягні на стол усё, што ёсць. Можа, апошні раз у сваёй хаце перакусіць давядзецца — палітыка, брат, — тонкая справа. Ды расказвай, як жывеш тут без мужа.
М а л а н н я ***(ставіць на стол хлеб і сала).*** Вядома, як удава.
І в а н . Мабыць, не сумуеш?
М а л а н н я . А і не павесялішся — на хлебе з салам.
І в а н. А салдат і вадзе, бывае, рад. А з салам ды хлебам — то свята.
Н е с ц е р к а . Гэта так. Сала — добра, а вось гусь — таксама не горш.
І в а н . Які гусь?
Н е с ц е р к а . Тушаны — з печы, вунь там, за услонам.
М а л а н н я . Што ты мелеш, мо п’яны?
І в а н . А ты адкуль ведаеш?
Н е с ц е р к а . Ды я, міл чалавек, наскрозь бачу. Асабліва, калі есці хочацца. Заглянь, заглянь, гаспадынька, у печ і ў шафу.
М а л а н н я . Што ты вярзеш, валацуга!
Іван. Ну-ну, не шумі, я і сам загляну ***(дастае гуся).*** Каму ж гэта ўсё прыгатавана. Ох, дабяруся я да цябе...
Н е с ц е р к а . Давай, салдацік.
І в а н . І як ты на гэтую шафу глянуў? А то бачыш, як з бабаю. А вось у нас таксама быў адзін гэтакі, як і ты. Але ён усё больш чарцей бачыў — дык яго ў манастыр адпусцілі.
Н е с ц е р к а . Эй, чарцей — гэта я яшчэ ў дзяцінстве мог.

М а л а н н я . Ды ты сам чорт бязрогі.
Н е с ц е р к а . Вось, напрыклад, бачыш бочку?
І в а н . Ну.
Н е с ц е р к а . А ў ёй — бачу — сядзіць чорт.
І в а н. Не можа быць. А калі яго перахрысціць?
Н е с ц е р к а . Не заўсёды дапамагае. Каб чым другім...
І в а н . Ану, пачакай... ***(Бярэ ружжо, цэліцца).***
М а л а н н я . Ты што, здурнеў, у хаце...

**І в а н паспявае стрэліць, бочка падае, П ш э б ы е ў с к і выскоквае, уцякае праз акно.**

І в а н . Каб сам не бачыў — не паверыў бы. Я думаў, чэрці ўсе чорныя, а гэты голы, як турэцкі святы.
Н е с ц е р к а . Э-э, братка. Усялякія бываюць.
І в а н . А ты, жонка, што скажаш? Даўно ў хаце чэрці завяліся?

**У разбітае акно заглядвае салдат.**

С а л д а т . Гэй, Іван, паспяшай, апошняя рота на маршы!
І в а н . Ну, альбо вярнуся — чарцей выведу, альбо зусім не вярнуся — знайду сабе месца: з табою жыць, што з тым чортам. Бывай і ты, добры чалавек.

**С а л д а т ы пайшлі. М а л а н н я хапае качаргу і кідаецца да Н е с ц е р к і .**

М а л а н н я . Бач, работнічак! Я табе пакажу, як саваць нос у чужую задніцу!
Н е с ц е р к а. Ціха, ціха, мілая.
М а л а н н я . Не тое што праз заслонку — свету божага не ўбачыш.

**М а л а н н я б’е качаргою. Н е с ц е р к а аббягае вакол стала. М а л а н н я б’е яшчэ раз, трапляе па стале, разбівае посуд.**

Н е с ц е р к а . Ты што нарабіла?

**М а л а н н я , змарыўшыся, кідае качаргу, садзіцца на крэсла.**

М а л а н н я . О Божа! Прынеслі цябе чэрці на маю галаву.

Н е с ц е р к а . Ты б лепш дзякуй сказала, а яна — з качаргою.

М а л а н н я . За што табе, іраду, дзякуй?

Н е с ц е р к а . А ты падумай сваей бабскай галавою — не было б мяне, дык застаў бы вас Іван уціхую? А расказаў бы я яму пра твае хітрыкі — пра скасаванне шлюбу, думаеш, ён бы ў бочку з свайго ружжа стрэліў ці ў цябе — га?

М а л а н н я ***(спалохана).*** Што ты кажаш!

Н е с ц е р к а . Баба — волас доўгі, розум кароткі. Івану што там, на вайне, загінуць, што тут — адна рэдзька. Вось і думай.

М а л а н н я . А ты спрытнюга. Бач, як усё перавярнуў. Мне б гэткага памочніка. Яно і сапраўды — баба ёсць баба.

Н е с ц е р к а . А што за дапамога табе патрэбна?

М а л а н н я . Не простая. З розумам трэба.

Н е с ц е р к а . Гэткага дабра ў мяне хапае.

М а л а н н я . Наперад не выхваляйся. Не ведаю — казаць табе або не. ***(Закрывае падушкаю пабітае акно).*** А, цяпер усё роўна. Трэба мне Пшэбыеўскаму вяселле сапсаваць. Хоча ён Кацьку, пісараву дачку, браць.

Н е с ц е р к а . А навошта табе гэта?

М а л а н н я . Даход маю з яго.

Н е с ц е р к а . Калі пачала — кажы да канца. Паперу аб скасаванні шлюбу навошта брала?

М а л а н н я . Добра. Абяцаў мяне Пшэбыеўскі ў Варшаву завезці. Сам падумай, што мне тут. Вернецца Іван — кіне мяне. Мы ж з ім нават у касцёле не вянчаліся, толькі ва ўправе і запісаны. Лепш я сама пра сябе патурбуюся. А Пшэбыеўскага калі ў рукі ўзяць, то і грошы будуць.

Н е с ц е р к а . Бачу, ты свайго не мінеш.

М а л а н н я . А ажэніцца — памінай як звалі.

Н е с ц е р к а . Памог бы я табе — мне гэта, што вус пакруціць. Але за проста так і сабака не пачэшацца, а мужык задарам і да чорта не пашле.

Маланн я. Не турбуйся — разлічымся.
Н е с ц е р к а. Гэта чым жа?
Маланн я. Пры бабе заўсёды ёсць чым заплаціць. ***(Падсаджваецца да Несцеркі і падштурхоўвае яго пад бок).***
Н е с ц е р к а. Бач ты! Яно, канечне, баба ты гладкая. Але ў мяне з гэткае манеты рэшты няма. Мне чырвонцамі трэба.
Маланн я. Будуць і чырвонцы, але з мяне наперад не выкруціш. Вучаная. Колькі хочаш?
Н е с ц е р к а. Тысячу.
Маланн я. Ты што! Тысячу!
Н е с ц е р к а. А за кукіш — не купіш. Калі я зраблю ўсё як след — у цябе гэтых тысяч будзе што гразі пад свіннёю. Пішы распіску.
Маланн я. Добра, прайдзісвет. Але наперад — ні грошыка. ***(Піша распіску).***
Н е с ц е р к а. Не турбуйся. Толькі зачэпка патрэбна. Парай пану мяне ў лакеі ўзяць. Скажы, маўляў, каб не я — вам бы абаім — крышка. А там справа пойдзе. ***(Пяе).***

Калі я за справу ўзяўся,
То ўсё будзе гладка.
Не турбуйся, маладзіца,
Пагуляеш сладка.

Маланн я. Маё жыта не арана,
Але поле родзіць.
Нікаго я не заву,
Самі ўсе прыходзяць.

Н е с ц е р к а. У цябе ёсць тры капейкі,
У мяне тры грошы.
Пацалуй мяне, галубка,
Калі я харошы.

Маланн я. Выйду я на вуліцу,
Туды-сюды гляну:
Адзін мне нясе бліны,
А другі смятану.

Н е с ц е р к а. Ой, скрыпяць калёсы,
Няма на іх мазі.

Я прыбіўся да цябе,
Як свіння да гразі.

М а л а н н я . Як была я маленька,
Калыхала маменька.
А як стала падрастаць,
Сталі хлопцы калыхаць.

Н е с ц е р к а . Хай цябе, мая галубка,
Чэрці калыхаюць.
Я ж на гэта не прыгодны,
Мяне людзі знаюць.
Лепей я павесялюся.
Чым я бабай задаўлюся.

## КАРЦІНА ПЯТАЯ

**Дом Бургамістра. Стол, крэслы, канапа. Б р ы н д з ю к о ў н а адчыняе дзверы, уваходзіць Б у р г а м і с т р .**

Б р ы н д з ю к о ў н а . Праходзьце, праходзьце, змучылася чакаючы.

Б у р г а м і с т р ***(з асцярогаю).*** Клопат — адзін клопат. Вось і затрымаўся. Горадам кіраваць...

Б р ы н д з ю к о ў н а ***(лісліва).*** Канечне, канечне — за ўсім даглядзі... Б у р г а м і с т р . Вось і затрымаўся — клопат. На ўсё час патрэбен.

Б р ы н д з ю к о ў н а . Вашымі клопатамі горад жыве — сябе не шкадуеце. Адпачніце, павячэрайце.

Б у р г а м і с т р . Яно і вядома — улада. Сказана ў пісанні: ярмо ўлады.

Б р ы н д з ю к о ў н а . Павячэрайце, адпачніце. Стамілася, чакаючы — усё хочаш як лепш, усё як дагадзіць. ***(Дапамагае распранууца, збірае на стол).***

Б у р г а м і с т р . Што гэта сёння як на свята?

Б р ы н д з ю к о ў н а . А для законнае жонкі муж цераз парог — і ў хаце свята. Пасля працы — і паесці і адпачыць.

Б у р г а м і с т р . Яно, канечне, так...

Б р ы н д з ю к о ў н а . Пакаштуйце віна — сама купляла.

Бургамістр. У Яцака?
Бryндзюкоўна. Адкуль у яго добрае віно? Упраўляючы пана Пшэбыеўскага ўступіў, а яшчэ — ах, забылася, зусім забылася. ***(Выбягае).***
Бургамістр. Пшэбыеўскага? Дык няўжо? ***(Праводзіць рукою па горле).*** Гэты што хочаш зробіць. Глядзі, галава, глядзі!

**Прыбягае Брындзюкоўна, на талерцы нясе кансерву.**

Брындзюкоўна. «Пашлет» — з самой Францыі. І віно адтуль. Піце, піце — усё як у людзей, яно ж вядома — бургамістр, не памужыцку ж...
Бургамістр ***(п'е і закусвае, Брындзюкоўна, бегае вакол, падсоўвае талеркі, падлівае віно).*** Што гэта вы клапоціцеся сёння?
Брындзюкоўна. Хто ж паклапоціцца, як не законная жонка. Селядца вазьміце, «пашлет» паспрабуйце.
Бургамістр. Што гэта вы... турбуецеся... як на свята...
Брындзюкоўна. Хто ж патурбуецца, як не законная... наліце яшчэ.
Бургамістр ***(п'е).*** Дзякуй, дзякуй, толькі што гэта вы так частуеце...
Брындзюкоўна. Хто ж пачастуе, як не жонка законная. Ноч не спіш, думаеш, як дагадзіць.
Бургамістр. Дзякуй, дзякуй... Толькі што гэта вы...
Брындзюкоўна. Наліце, наліце хранцузскага. Калі ж і адпачыць, як ні пасля працы, дзе ж як не дома — а жонка, законная, усё падрыхтуе. ***(Выбягае).***
Бургамістр. Няўжо праўда? Падрыхтуе? З Пшэбыеўскім ***(праводзіць рукой па горле).***

**Прыбягае Брындзюкоўна, нясе падушку, кладзе на канапу.**

Моцнае віно...
Брындзюкоўна. Заморскае, адпачніце, дзе ж адпачнуць...

**Бургамістр лажыцца на канапу і пачынае храпці. Брындзюкоўна ходзіць вакол яго, прыносіць нож, вострыць яго,**

**плюе тры разы, прыстаўляе да шыі. Бургамістр хапае яе за руку, кідае на падлогу і пачынае біць плёткай.**

Езус Марыя, Езус Хрыстус, — дапамажы.

Бургамістр. А, душагубцы! Я табе пакажу, як людзей рэзаць! Законнага мужа! Я вас выведу на чыстую ваду. Змова! На ўладу руку паднялі — га?!

Бryndзюкоўна. А-а, Езус Марыя, дапамажы!

Бургамістр. Я табе дапамагу — і да Пшэбыеўскага дабяруся! Ён на мяне даўно зубы вострыць — бач, дарогу яму перайшоў. Я вам пакажу! Мужа рэзаць!

Брындзюкоўна. А-а-а-а, я не рэзала, гэта ўсё ён навучыў!

Бургамістр. І да яго дабяруся! Не пагляджу, што Пшэбыеўскі! Усе на катаргу пойдзеце! Бургамістр проста так не дасца! ***(Кідае плётку, становіцца насупраць Брындзюкоўны і паказвае ёй фігу).*** Зарэзаць — а вось бачыла?

Брындзюкоўна ***(хапае яго за руку, але Бургамістр штурхае яе, і яна садзіцца на падлогу).*** Не хацела я рэзаць!

Бургамістр. Смерці мае захацела?

Брындзюкоўна. Не смерці я хацела, а кахання... А-а-а...

Бургамістр. Якога кахання?

Брындзюкоўна. Такога, як тады, калі пажаніліся, каб не бегаў па патаскухах... а-а-а...

Бургамістр. Ты што вярзеш?

Брындзюкоўна. А-а-а... ***(Мацае плечы).*** Што толькі ні рабіла — і зеллем паіла, і шаптух вадзіла, у, казёл праклятый, як да жонкі — дык яго няма — усё па патаскухах. Валацуга гэты і параіў выгаліць тры валасіны пад барадою і — ад іх, кажа, усё зло. Ці ж я не законная жонка, ці ж я не хачу кахання?! А-а-а...

Бургамістр. Які валацуга?

Брындзюкоўна. У ратушы ў тваёй, калі застала цябе з гэтай макрахвосткаю — а-а-а! — прападзі ўсё пропадам, у манастыр пайду ад такога жыцця — а-а-а... ***(Паўзе на карачках праз усю сцэну).***

Бургамістр. Стой! Стой!

**Бryндзюкоўна спыняецца і аглядваецца.**

Успомніў. Успомніў, дзе я яго бачыў! Гэта ж ён у мяне ля рэчкі штаны ўкраў! І Яцаку прадаў — а я яго чуць у астрог не пасадзіў! Гэта ж Несцерка! Гэта ж яму стары Пшэбыеўскі коней прайграў! Ага! Дык вось як яно?! Ну пачакай! Я цябе дастану! Толькі трэба ўзяцца з розумам! Я табе выпішу пашпарт! Паглядзім, хто каго!

## КАРЦІНА ШОСТАЯ

**У панскім палацы — сцэна, на ёй рэпеціруюць дзяўчаты, на першым плане Кацярына, да яе падыходзіць лакей.**

Лакей. То хай пані пачакае, пан зараз прыйдзе.

**Уваходзіць Несцерка.**

Кацярына. Дзядзечка Несцер!
Несцерка. Вось табе і на — мне пан загадаў сетку сплесці ды птушку злавіць — а яна сама ў клетку прыляцела.
Кацярына. Што вы тут робіце?
Несцерка. Я то заўсёды пры пану, як тая блыха пры сабаку. А вось ты як сюды трапіла?
Кацярына. Бацька прыслаў. Пан хоча, каб я яго тэатр паглядзела.
Несцерка. Э-э, пан не толькі гэтага хоча, ды, бачу, і бацька твой таксама.
Кацярына. Ведаю, ведаю, дзядзечка, што яны хочуць. ***(Закрывае твар рукамі).***
Несцерка. Ну, не трэба слёзкі ліць. Паглядзі, у якой прыгожай клетцы жыць будзеш.
Кацярына. З мілым і ў запечку добра.
Несцерка. А пан што — не мілы? Багаты і знатны. А які на погляд — як важна выступае, які гонар ***(паказвае, як пан хо-***

***дзіць).*** Не тое што які мужык — Андрэй, напрыклад, — ні форсу, ні грошай у кішэні.

Кацярына. Ды затое як прытуліць ды як прыгалубіць, ой, што гэта я кажу!

Несцерка. То і кажаш, што ў думках. Каханне і кашаль не схаваеш. Толькі забудзь пра сваё каханне. Якая з яго карысць? Самая непатрэбная рэч на свеце. Будзеш жыць у палацах, у Варшаву паедзеш, у золаце будзеш хадзіць, на Андрэя свайго і не паглядзіш, а на дзядзьку Несцера і плюнуць не захочаш.

Кацярына. Ой, дзядзечка, не рвіце душу, я і так усе ночы праплакала.

Несцерка. Няўжо праплакала? Няўжо паненкаю быць не хочаш?

Кацярына. Каб бацьку не ў астрог — збегла б куды вочы глядзяць. А каб прымусілі — то і ў ваду б.

Несцерка. Э, да ты не ў бацьку, ты ў маці нябожчыцу. Памятаю яе, зямля ёй пухам. І цябе з калыскі памятаю, птушачка ты мая. І калі ты сапраўды за панствам не гонішся, у бядзе не пакіну.

Кацярына. Ой, дзядзечка Несцер! ***(Абдымае Несцерку).***

Несцерка. Ну, ну. Толькі вось бацька твой — ці з розуму зжыўся, ці ў падпанкі яму свярбіць...

Кацярына. Вінен ён пану тысячу рублёў — пасадзяць яго ў астрог. Каб не гэта...

Несцерка. А і пасядзеў бы крыху — можа, розуму дабавілася б.

Кацярына. Не, дзядзечка, я гэтак не згодна. Лепш век гараваць, чым бацьку ў астрог аддаць.

Несцерка. Ну-ну, не сумуй. Знойдзем тысячу.

Кацярына. Дзе ж гэткія грошы ўзяць?

Несцерка. Была б бяда. Яна навучыць. А разумны чалавек і без грошай выкруціцца.

Кацярына. Андрэй павёз тавар гандлярам — павёз няходжанымі шляхамі і ўжо вестачку прыслаў — усё добра абыш-

лося. Грошы ёсць. Ды і пан пра гэта даведаўся — цягне ў касцёл як у пятлю.

Несцерка. Ну дык слухай. Скажа што пан пра вяселле — нічога не абяцай. А ўвечары пад'еду я на панскіх конях — сядай і насустрач Андрэю. А пакуль вы вернецеся, мы тут неяк пратрымаемся.

Кацярына. Значыць, мы коней гэтых украдзём? Так нядобра.

Несцерка. Э-э, Бог чэсных любіць, ды долі не дае. Не ўкрадзём, а пазычым. Толькі вось бацьку б твайго ўламаць. А вунь і сам Пшэбыеўскі сюды стрыканожыць — ну, да вечара.

**Несцерка выходзіць. З'яўляецца пан Пшэбыеўскі.**

Пшэбыеўскі. О! Пані Катажына! Бардзо рады бачыць! ***(Кланяецца).*** Дзенькуем пані за візіт. Я меў смеласць прыгатаваць пані сюрпрыз — о, пані будзе мець шмат прыемнасці. У гэткай глушы прывабная пані не мае забавы. Я хацеў, каб пані паглядзела мой тэатр.

**Кацярына кланяецца.**

То, канешне, не Варшава, але я намагаўся зрабіць так, каб пані мела прыемнасць. Я сам аўтар, я напісаў вершы, музыку — то опера прысвечана пані Катажыне.

**Кацярына зноў кланяецца.**

***(Хлопае ў далоні, звяртаецца да дзяўчат-танцорак).*** Прыгатаваць усё! Першая сцэна — танец. Музыка — раз-два — раз-два-тры!

**Танцоркі пачынаюць танец. Яны ў антычным адзенні, дэкарацыі — горы, воблакі, кіпарысы.**

О! Матка боска — як нежывыя — віва, віва, вось гэтак. Амарозо — вось так ***(паказвае, як трэба рухацца).*** Зноў — музыка — кантабіле, кантабіле. От, як з дрэва зробленыя! Рукі — рукі — грацыя. О, пані Катажына, — як вывучыць

гэтых! І музыка — хоць вушы затыкай. Трэба выпісваць італьянцаў. Пастух, дзе пастух? — выхад пастуха.

**З'яўляецца Пастух, усе заміраюць.**

Пастух ***(спявае).***

О! Як я кахаю пастушку!
О! Як яна прыгожа.
Я ноч не сплю!

**Усе зноў працягваюць танец вакол Пастуха.**

Пшэбыеўскі. Стоп, стоп, усё не тое! ***(Выходзіць сам, робіць некалькі «па» і пяе).***

А! Як я кахаю пастушку!
О! Як яна прыгожа!
Я ноч не сплю!

От, пані Катажына — ну што з імі зробіш. І потым, што гэта за мова?! Ці ж можна размаўляць на гэткай туземнай мове?! На сцэне трэба па-французску або па-польску.

Кацярына. А па мне, паночку, няма лепш той мовы, на якой маці калыханку пела.

Пшэбыеўскі. Маці! Калыханку! Не, Не. Ні пець, ні танцаваць! Не тая парода. Трэба выпісваць італьянак.

Кацярына. Занадта складана пан усё прыдумаў — вось і не атрымліваецца. А што пець ды скакаць — нашы дзяўчаты не горш за італьянак могуць.

Пшэбыеўскі.О пані! Мастацтва — тонкая рэч. Тут патрэбна парода. Віва — кантабіле, тэмпо — брыо.

Кацярына. А вось пагляньце — ваша брыла.

**Кацярына збірае танцорак і музыкаў, і пачынаецца танец, усе спяваюць.**

Чабарок, чабарок,
Ды каля дарожкі,
Харошанькі мой міленькі,
Ды крывыя ножкі.
А мой жа ты даўганосы,
Ой, які ж ты нехарошы;

Каб ты быў такі, як я,
Дык даўно была б твая.
Каля саду я хадзіла...
Ды шчыпала вішні.
Дай жа, Божа, кавалера
Ды пад мае мыслі.

**Дзяўчаты акружаюць пана, танцуюць з ім. Кацярына пяе.**

У агародзе буракі,
А на лузе мята.
Любіць, любіць мяне мілы,
Хоць я не багата.

**Танец працягваецца, усе пяюць.**

Біла мяне мама з ночы,
За Івана кары вочы.
І казала: буду біць,
Каб Іванку не любіць.
Я ж Іванку так мілую,
Дзе ўбачу — там цалую.

**Кацярына зноў побач з панам, спявае.**

Ты не топай нагой,
Не пайду я з табой,
Лепш босаю хадзіць,
Чым нямілага любіць.

**Пасля гэтых слоў Пшэбыўескі грозна топае нагой, усе разбягаюцца.**

Пшэбыеўскі. То цо такое пані мувіць!
Кацярына. А гэта песня такая.
Пшэбыеўскі. Ах, то песня?
Кацярына. Песня, песня.
Пшэбыеўскі. Песня добрая. Гэткія песні трэба запісаць і выдаць ксёнжкай у Варшаве. То туземны фальклор.
Кацярына. Пан так навукова кажа, што і зразумець цяжка.
Пшэбыеўскі. Але. Да навукі я маю розум. А пані Катажына вельмі добра скакала. Зусім як тая козачка. ***(Хоча абняць Кацярыну).***

Кацярына. Козачкі не толькі скачуць, яны яшчэ і бадаюцца.
Пшэбыеўскі. О, пані Катажына, я толькі меў намер падзякаваць за танец.
Кацярына. Пан казаў, што мы не ўмеем танцаваць.
Пшэбыеўскі. О, я толькі меў на ўвазе, што гэткія танцы не для сцэны. Мастацтва — тонкая рэч. Вось калі будзе гатова мая опера...
Кацярына. А калі ж яна будзе гатова?
Пшэбыеўскі. О! Такое грандыёзнае прадстаўленне мае быць толькі па асаблівым выпадку. Напрыклад, для вяселля. Як пані Катажына адносіцца да вяселля?
Кацярына. Гэта справа добрая. Ды вось жаніха няма.
Пшэбыеўскі. Жаніха можна знайсці.
Кацярына. Цяжка знайсці такога, якога хочацца.
Пшэбыеўскі. А якога пані хоча?
Кацярына. Каб быў прыгожы...
Пшэбыеўскі. То ці ж я не прыгожы — такіх шчыблетаў ні ў кога ў акрузе няма, а фрак з самога Парыжа.
Кацярына ***(убок).*** Добры фрак, ды сам дурак. ***(Пшэбыеўскаму).*** Яшчэ каб разумны быў.
Пшэбыеўскі. О, па розуму мне тут роўных няма.
Кацярына. Вось гэта праўда, цяжка пару знайсці.
Пшэбыеўскі. Другі раз ну проста распірае ад розуму, не ведаеш, што і рабіць.
Кацярына. Падзяліліся б з кім.
Пшэбыеўскі. А я так і раблю, я парады ўсім тады даю. Вось і панне Катажыне хачу даць.
Кацярына. Якую ж гэта параду пан хоча мне даць?
Пшэбыеўскі. Выходзьце, пані Катажына, замуж.
Кацярына. Дзякуй, так і зраблю. Толькі вось каго жаніхом абраць — парады ў пана пытаць не стану.

**Уцякае, пан бяжыць следам.**

П ш э б ы е ў с к і. За мяне, за мяне, як крулеву апрану, у Варшаву завязу.

**К а ц я р ы н а выскоквае ў дзверы, а пан сутыкаецца з Н е с ц е р к а м.**

Н е с ц е р к а. Дзень добры, паночку.
П ш э б ы е ў с к і. От, халера ясна, збегла.
Н е с ц е р к а. Э, паночку, дзеўку голымі рукамі не зловіш.
П ш э б ы е ў с к і. Тады сеткай зловім, залатой. Як адвязу ў Варшаву... Кажы, што новага.
Н е с ц е р к а. Ох, паночку, што ні навіна, то не радасць.
П ш э б ы е ў с к і. За дрэнныя весткі — сам ведаеш, якая ўзнагарода.
Н е с ц е р к а. Што рабіць, як лепшых няма. І так заходзіў, і гэтак. І з ёю гутарыў, і з бацькам. Убіла сабе ў галаву гэтага Андрэя — за яго, або ў ваду, кажа, — і ўсё тут.
П ш э б ы е ў с к і. А што ж бацька — тысячу мне вінен, — сілком хай цягне да касцёла. За гэтыя грошы дзве такія Катажыны купіць можна.
Н е с ц е р к а. Ён не супраць, але ж пан хацеў паціхеньку абвянчацца.
П ш э б ы е ў с к і. Але. Катажына хаця і прыгажуня, а мяшчаначка, не з рукі мне, Пшэбыеўскаму, пры ўсім народзе. Вось пажыве ў Варшаве, стане паненкаю...
Н е с ц е р к а. А сілком, паціху, — не атрымаецца. Дзеўка не конь, вупраж не накінеш.
П ш э б ы е ў с к і. Захочаш пакатацца — запражэш. Дзе ж твая хвалёная хітрасць?
Н е с ц е р к а. Пры мне, паночку, пры мне. Вы казалі, што вам абы да касцёла, а там ужо ваш клопат.
П ш э б ы е ў с к і. От, пасля касцёла дзеўка мякчэй становіцца.
Н е с ц е р к а. Вось я і прыдумаў...
П ш э б ы е ў с к і. Ну дык расказвай, што ты прыдумаў.
Н е с ц е р к а. Даведаўся я, паночку, што Кацярына чакае Андрэя з дня на дзень. І хочуць да касцёла...

Пшэбыеўскі. То разбой! Я паклічу варту!
Несцерка. Э, паночку. Толькі спалохаеце. А вось мы ёй вестачку пададзім — як ад Андрэя. А пан пераапранецца — ды замест яго пад вянец. А там — воля ваша, мой клопат — да касцёла.
Пшэбыеўскі. От праўда, галота на выдумкі хітрая.
Несцерка. Хай пан загадае запрэгчы тройку — увечары я пад’еду па Кацярыну, у мяне ўжо ўсё дамоўлена.
Пшэбыеўскі. Малайчына! Толькі зробім гэта заўтра. Усё падрыхтаваць трэба.
Несцерка. Як пан скажа. А тады б няшкода перакусіць ды выпіць.
Пшэбыеўскі. Пшэбыеўскі ведае, як мужычка ўзнагародзіць. За тое, што добра прыдумаў — добра і пагуляеш. Я ведаю, што вашаму брату трэба. ***(Адкрывае заслону — за ёю стол з ежай і вінам).*** Пі, гуляй, а заўтра праспішся — і за работу.
Несцерка. Было б сказана — нам забыць нядоўга.
Пшэбыеўскі ***(прыпыняе Несцерку).*** Толькі памятай, аб нашых задумах ніхто не павінен ведаць.
Несцерка. Што гэта пан як быццам некага баіцца?
Пшэбыеўскі. А ты што, нікога не баішся?
Несцерка. А каго ж мне баяцца?..
Пшэбыеўскі. Ды вось прыходзіў раніцой бургамістр, цябе шукаў, казаў, трэба, маўляў, у астрог пасадзіць.
Несцерка. То ад добрае душы. Ведае, што ў мяне ні даху над галавой, ні хлеба ў абед — вось і турбуецца.
Пшэбыеўскі ***(смяецца).*** Дык, значыць, бургамістр добры чалавек.
Несцерка. Канечне, добры, калі спіць, і з дубінай прайсці міма можна.
Пшэбыеўскі ***(смяецца).*** То добра мовіш. То б запісаць і выдаць ксёнжку ў Варшаве — як фальклор туземны.
Несцерка. Пішыце, пішыце, паночку ***(убок),*** каб табе чэрці віламі па скуры пісалі.

**П ш э б ы е ў с к і выходзіць.**

Узрадаваўся. Што ты скажаш, як атрымаеш дулю, а не Ганулю.

**Уваходзіць М а л а н н я.**

М а л а н н я. Ну што, работнічак, на другія харчы перайшоў — ці мае не да смаку?

**Н е с ц е р к а разводзіць рукамі.**

Нешта ты і носа не паказваеш. Чула, у пана за лепшага сябра. Можа, і пра тое, аб чым дамаўляліся, забыў. А ён...

**Н е с ц е р к а зноў разводзіць рукамі.**

Якая ў мужыкоў памяць? Дзеўку як адзін раз у сямнаццаць гадоў навучыць, дык тая ўсё жыццё памятае. Можа, і мне расказаць пану, дзеля чаго ты да яго ўладкаваўся?
Н е с ц е р к а. Ты што малоціш?
М а л а н н я. А тое, што ў мяне ў гэтым доме таксама вока ды вуха ёсць. Чула, пану Кацьку сватаеш? Хочаш і каля яго, і каля мяне разжыцца.
Н е с ц е р к а. От дурніца. Табе б у сямнаццаць гадоў да той памяці яшчэ б розум. Гэта ж «манеўр».
М а л а н н я. Які «манер»?
Н е с ц е р к а. Глухому што ні кажы — сваё чуе. Нельга напрамкі лезці — у абход трэба, зразумела? Ты толькі рыхтуй грошыкі. Заўтра вечарам... Адным словам, з'едзе твая саперніца адсюль — табе і карты ў рукі.
М а л а н н я. Ох, спрытны ты круцель. Але каб і мяне не падмануў заадно.
Н е с ц е р к а. Ну, ну — дзякаваць будзеш.
М а л а н н я. Гэта я заўсёды гатова — ды ты сам упіраешся. Колькі год адзін шляешся — і да бабы цябе не цягне — га? ***(Абдымае Несцерку.)***
Н е с ц е р к а. Ну, ну, дзіравага меха не напоўніш, карысці ад вас, ад баб, вось я лепш сто грамаў вып'ю.

Маланне. Эх ты, не тваім носам маліну кляваць. Відаць і забыўся як.

**Чуваць шум.**

Ой, Пшэбыеўскі ідзе, трэба схавацца.
Несцерка. Уцякай у другі пакой, а я тута.

**Несцерка бярэ бутэльку і лажыцца, быццам п’яны, пад стол. Маланне выходзіць. Уваходзяць Пшэбыеўскі і панскі кухар татарын Мустафа.**

Пшэбыеўскі ***(адхінае заслону).*** Ужо пад сталом валяецца. Дапусці свінню да талеркі. А сёння гэтак і трэба, усё па задуманым. Ты ўсё вывучыў добра?
Кухар. Усё, усё.
Пшэбыеўскі. Прачытаеш — скажаш: «Будзьце мужам і жонкаю» — і хуценька ў алтар. Вопратку скінеш — і на козлы. І адразу кіруйся на Варшаўскі тракт. Гэткае вяселле лепш у Варшаве гуляць.
Кухар. Усё зробім, як дамовіліся. Колькі пан заплаціць?
Пшэбыеўскі. Аб гэтым потым, потым.
Кухар . Грошы адразу. Грэх вялікі.
Пшэбыеўскі. Які табе грэх — ты не хрысціянін. Твая вера гэтага не забараняе.
Кухар. Паганіць касцёл — вялікі грэх. Грошы наперад.
Пшэбыеўскі. Наперад. А ты ўцячэш пасля, а як я дзеўку Кудрачку вярну, хто дакажа, што ты вянчаў?
Кухар. Мяне тады людзі адарвуць мая башка.
Пшэбыеўскі. За тое і грошы табе плачу.
Кухар. Дзеньга — гэта добра. За дзеньга ўсё зробім.
Пшэбыеўскі. Вось яшчэ таксама — туземец. Добра. Палову.
Кухар. Такія — не. Залаты, залаты давай.

**Пшэбыеўскі дае мяшэчак з грашыма.**

Пшэбыеўскі. Ды ты не турбуйся за сваю галаву. Пажыве дзеўка ў Варшаве — памякчэе, і шуму не будзе ніякага.

К у х а р. Пан дзеньга даст — всё будзет харашо, шума не будзет.
Пшэбыеўскі. Пан грошай не пашкадуе. А як прыцямнее — едзь да Кацярыны, скажаш, ад Несцеркі. А то гэтаму прайдзісвету дай коней — ні дзеўкі, ні коней не знойдзеш. Ксяндза адвязеш у суседняе мястэчка. Вось запіска.
Кухар. Усё як пан скажа.
Пшэбыеўскі. Пайшлі, трэба ўсё хутка рабіць, хутка!

**Выходзяць. З-за заслоны выходзіць Несцерка.**

Несцерка. Вось табе і на! Я яго шапкаю, а ён мяне — абухом!

**Уваходзіць Манах.**

Манах. Што аслупянеў, як маланкаю стукнула?
Несцерка. Стукнула, брат, ды так стукнула — хоць крычы. А ты што тут робіш — усё на касцёл збіраеш?
Манах. Даўно кінуў гэты занятак. Жыву вось у пана Пшэбыеўскага за вучонага сакратара. А заадно даследую яго вінныя падвалы. Ды ён, відаць, зразумеў гэта. Схаваў ключы. Вось я іх і шукаю. Во яны — ключы пазнання сэнсу нашага існавання праз элексір жыцця.
Несцерка. Няўжо?
Манах. Павер мне. Я чалавек вучоны. Толькі вось бяда — ключы я не знайшоў, а з раніцы ў роце ні кроплі не было.
Несцерка. Э, браток, ведаю гэткую бяду. Але ўмеючы, дапамагчы няцяжка. Адкрый заслону.

**Манах адкрывае заслону.**

Манах. Божа! Як мудра ўсё на гэтым свеце! Трэба толькі адкрыць заслону!

**Яны садзяцца за стол, наліваюць віна.**

Несцерка. Але ж у цябе і мерка!

М а н а х . Як самі сабе мераем — гэткай меркаю і нам адмераюць. ***(Выпівае).***

Н е с ц е р к а . І колькі ж ты можаш выпіць?

М а н а х . Гэта гледзячы па абставінах. Якое віно, якая закуска. У пакоях або на вaздусях, за сваё ці дармавое.

Н е с ц е р к а . Ну, калі найлепшае віно, і закуска, ды ў садку пад вішнямі — і на дармаўшчыну?

М а н а х . Тады да бясконцасці, і яшчэ адна бутыль.

Н е с ц е р к а . Чакай, калі да бясконцасці, то навошта яшчэ адна бутыль?

М а н а х . А каб раніцай апахмяліцца было чым.

Н е с ц е р к а . Божа! Вось што значыць вучоны чалавек. Колькі гадоў гэтую гадасць п’ю — а да гэткага не дадумаўся.

М а н а х . Таму дурная галава раніцай і баліць. Налівай.

Н е с ц е р к а . Але так піць — і ў царства Божае не трапіш.

М а н а х . Сказана: царства Божае — унутры нас. ***(Выпівае і гладзіць сябе па жываце).*** А дзе ж наш благадзецель, пан Пшэбыеўскі?

Н е с ц е р к а . Ксяндза шукае.

М а н а х . А навошта?

Н е с ц е р к а . Жаніцца хоча.

М а н а х . І дарэмна. Сказана: жанчына — ёсць сетка.

Н е с ц е р к а . Ахвота горш за няволю.

М а н а х . І гэта праўда. Я б і сам мог дапамагчы нашаму благадзецелю. Я ж не проста манах — я і ксяндзом, і вікарыем магу і грахі адпускаць маю права — у мяне папера ад самога папы ёсць. Сам папа падпісаў — эх, яго б сюды. Ён жа плакаў, калі мяне праводзіў, а вось цяпер бы мы павесяліліся?!

Н е с ц е р к а ***(хоча наліць).*** Стары фокус — зноў пуста.

М а н а х . Неразгаданая загадка быцця колькі ні пі — дап’еш да дна, а назаўтра зноў поўна — га? «Чудзен сей мір», — хвала яго тварцу. А хто п’е — налівайце, а хто не п’е — не давайце.

**М а н а х засынае, седзячы на крэсле. Уваходзіць М а л а н н я .**

Маланна. Ну што, дарваліся, як свінні да гразі — цяпер да раніцы.
Несцерка. Ох, галубка, не да віна — абкруціў мяне Пшэбыеўскі. Правёў на мякіне. Я думаў, ён дурны, як яго стары бацька, — ды дзе там!
Маланна. Стары хоць шчодры быў.
Несцерка. А ты і яго грэла?
Маланна. А чаго б і не пагрэць, калі холадна старому.
Несцерка. А вось сынок падпёк — хоць локці кусай.
Маланна. А ты думаў за ўсіх хітрэйшы?
Несцерка. Дурніца, табе ж горш. Вось падсуне свайго татарына замест мяне да Кацярыны — у касцёл ды і ў Варшаву. А ты з носам застанешся.
Маланна. Бач ты! Што ж рабіць?
Несцерка. Што рабіць? Трэба нешта прыдумаць. А як дурнем прыкідваўся, га — я і паверыў.
Маланна. Я ж казала — гэты такога наабяцае. Мне таксама — у Варшаву завязу, ажанюся з табой. І ўсё — адны абяцанкі. Стары хоць грошы даваў.
Несцерка. Дык ён ажаніцца з табою абяцаў?
Маланна. Што бабе не паабяцаеш, пакуль яна гарачая. А я, дурніца, і паверыла.
Несцерка. Што ж ты адразу не казала?
Маланна. Гэтак вам кожнаму ўсё і скажы. Але я ім пакажу вяселле, і нявесце, дастанецца. Я ім пакажу — злосць хоць зганю.
Несцерка. Пачакай, пачакай. Зноў ты напралом. Вось хто нам дапаможа. ***(Хлопае Манаха па спіне, той падае з крэсла).***
Маланна. Эй, цішэй, заб'ецца.
Несцерка. Яго і колам не заб'еш, цягні на канапу.

**Цягнуць Манаха за ногі праз усю сцэну.**

Ну і цяжкі, не падняць. Нездарма на жывот плячысты. Заставайся тут — вартуй, і каб да вечара цвярозы быў. Расолу прынясі. І чакай мяне.

**Н е с ц е р к а і М а л а н н я выходзяць у розныя бакі.**

М а н а х *(падымае галаву).* А хто п’е — налівайце, а хто не п’е — не давайце. *(Зноў падае і храпе).*

## КАРЦІНА СЁМАЯ

**Невялікі пакойчык, лаўкі, стол. За сталом Н е с ц е р к а і К у д р а ч о к.**

К у д р а ч о к. Кінь ты са сваёю свабодаю. Свабода, свабода, а калі есці захочаш, так і глядзіш, у якое б ярмо галаву ўсунуць. Адно мёртвы і свабодзен, ды яшчэ той, у каго грошы ёсць.
Н е с ц е р к а. Вось табе грошы і засланілі ўвесь свет. Гэта пад старасць шчасце ў цёплым закутку ды пры кавалку хлеба. Кацярыне сямнаццаць год — а ты ёй старэчае шчасце навязваеш. Ці сапраўды астрога баішся?
К у д р а ч о к. Ведаеш, Несцерка, хочаш крыўдзіся, хочаш не, але ты пражыў галота галотаю. Хочаш, каб і другія ўсё жыццё задам свяцілі?
Н е с ц е р к а. Я на жыццё не ў крыўдзе.
К у д р а ч о к. Ат, ні кала, ні двара, галаву прытуліць няма дзе. Я і сам не болей за цябе нажыў. Ды аднаму лягчэй. А як мне на дачку глядзець — яе жабрачкаю пусціць па жыцці! Маладосць пройдзе — кветка адцвіце, дзяцей раджаць, гаспадарку трымаць — не тая песня. Кажаш, астрога баюся? Ды я да канца дзён гніць у ім згодзен, толькі б Каця шчаслівая жыла.
Н е с ц е р к а. Не блытай шчасце з багаццем. Быў ты голы, пеў ды весяліўся, і жонка твая не сумавала. А цяпер яшчэ і панам не стаў, а ўжо асунуўся — у труну лепшага кладуць.
К у д р а ч о к. Вось выведу дачку ў людзі — тады можна і ў труну.
Н е с ц е р к а. А чым Андрэй не людзі? Шукай цар царыцу, а пастух пастушку.

Кудрачок. Значыць, мяне — у астрог, дачку — у жабрачкі. Добрая парада.
Несцерка. А калі закладу за цябе тысячу Пшэбыеўскаму?
Кудрачок. Адкуль яны ў цябе?
Несцерка. Я ж табе казаў: у мяне мільён незаробленых, а з сабою тысяча.
Кудрачок. Ну, а што дрэннага, калі за Пшэбыеўскага пойдзе? За панам босая не будзе.
Несцерка. А што я мацеры яе скажу, як сустрэну на тым свеце?
Кудрачок. Маці дзякуй скажа.
Несцерка. Круціш, братка. Ды мяне не правядзеш. Табе самому хочацца ў падпанкі пралезці.
Кудрачок. І самому пад старасць пажыць трэба.

**Уваходзіць Кацярына.**

Несцерка. Ну, радуйся, прынёс я грошы, аддаць Пшэбыеўскаму.
Кацярына. Праўда?
Несцерка. Ну дык што перадаць Пшэбыеўскаму — хай вяселле рыхтуе?
Кацярына. Ні за што на свеце!
Кудрачок. Ну вось што, Несцерка, не муці ваду. Не мяшайся не ў сваё.
Кацярына. Не, тата, не пайду за Пшэбыеўскага.
Кудрачок . Эх, дачушка. Не ўсё ж табе сямнаццаць год будзе. Затое будзеш пані. У вышэйшым свеце.
Несцерка. Адусюль па злодзеі — вось і вышэйшы свет.
Кудрачок. А з панам жыць — не з мужыком. Які ні ёсць, а культура.
Несцерка. Вазьмі розум у зубы. Бачыў я свіней панскае пароды. Думаеш, салодка жыць з такім? Ён жа як певень вакол кожнае дзеўкі скача.
Кацярына. Татачка, кахаю я Андрэя. З ім мне і жыць, а без яго — хоць у ваду.

Кудрачок. А, дык вы дамовіліся! У роднага бацькі за спіною?! Ну дык садзіце мяне ў астрог, рэжце, рабіце што хочаце ***(хоча пайсці з пакоя).***

Кацярына. Не, чакайце, не. Будзе гэтак, як тата кажа. Знаць, такая мая доля.

Несцерка. Ну, не! Апошняе слова будзе за мною. Слухай, стары дурань. Хацеў я цябе па-добраму ўгаварыць, хацеў, каб ты гонар свой успомніў. Ну дык ведай. Не збіраецца Пшэбыеўскі вянчацца з тваёй дачкою. Наняў ён татарына, каб адслужыў замест ксяндза, забярэ Кацярыну, пацешыцца ды і аддасць табе назад.

Кудрачок. Ды ты што?! Брэшаш, прыдумаў усё.

Несцерка. Сваімі вушамі чуў. А не верыш — праверыць лёгка. Бачыш — тройка едзе. Гэта татарын па Кацярыну. Вось мы яго спытаем.

**Несцерка бярэ мяшок і становіцца ля дзвярэй. Уваходзіць кухар-татарын.**

Кухар. Мая прывёз...

**Несцерка накрывав яго мяшком, валіць і завязвае.**

Несцерка. Бач ты, нехрысць, вочы ў сабакі пазычыў, ану, што тут у яго ***(дастае адзенне ксяндза).*** Бачыш? ***(З кішэні адзення дастае пісьмо і чытае).*** «Той, хто перадасць гэтае пісьмо, адвязе вас па маіх справах. Пшэбыеўскі». Ага, гэта мне спатрэбіцца. Ну, што пан загадаў рабіць увечары?

Кухар. Мая твая не разумей.

Несцерка. Зараз зразумееш ***(бярэ нагайку і б'е).*** Што пан загадаў рабіць увечары?

Кухар. Стой, стой, разумей, мая твая разумей!

Несцерка. Кажы, а то яшчэ ўсыплю.

Кухар. Вянчаць пана з Кацярынаю загадаў — я не хацеў, але пан загадаў — а яго спалохаўся.

Несцерка ***(б'е).*** Не палохайся пана, падпанак чортаў.

Кудрачок. О Божа! Я ж стары дурань — сам сваю дачку на гэткае аддаваў!
Несцерка. Паверыў?
Кудрачок. Прабач, што я, стары дурань, нарабіў бы! Але гэта так проста яму не сыдзе. Я да губернатара дайду — найду ўправу.
Несцерка. Э, кінь. Там, наверсе, яшчэ толькі лапці плятуцца, каб пайсці на людское гора паглядзець. І заўсёды хто-небудзь знойдзецца, каб гэтыя лапці паціху расплесці.
Кудрачок. Ды што ж, гэта яму ўсё так і сыдзе?
Несцерка. Не, брат, спускаць нельга. Толькі не жаліцца, што мы самі не знойдзем на панскі розум мужыцкай хітрасці?

**Уваходзяць Бургамістр і вартаўнікі.**

Бургамістр. А — вось ён. Хапайце яго — і ў мех, і завяжыце, каб больш не ўцёк.

**Вартаўнікі запіхаюць Несцерку ў мех.**

І нагайку прынясіце мне — я яму адразу ўсыплю.

**Вартаўнікі выбягаюць.**

Кудрачок. За што ж гэта вы добрага чалавека ў мех?
Бургамістр. Добрага? Ведаю я гэтага добрага. Але на гэты раз ад мяне не ўцячэ. За ўсё разлічуся — эй, нагайку нясіце!

**Выбягае таксама следам за вартаўнікамі. Кудрачок хутка мяняе мяхі — з кухарам на сярэдзіну хаты, з Несцеркам — пад стол. Убягае Бургамістр.**

***(Б'е.)*** Вось табе, вось табе тры валасіны, вось табе тры валасіны!
Кухар. Разумей, мая ўсё разумей!
Бургамістр. Зразумееш у астрозе, з цябе скуру спушчу — усё зразумееш! Бургамістра не правядзеш!

**Вартаўнікі забіраюць мех, усе выходзяць. Кудрачок выпускае Несцерку з мяха.**

Несцерка. Вось як, братка. Відаць, намазоліў я тут вочы, трэба далей ісці.
Кудрачок. А як жа з Пшэбыеўскім?
Несцерка. Тут брат — разарвацца, а не паддацца. Адпраўляй Кацярыну насустрач Андрэю, а як звечарэе — прыходзь да касцёла. Будзе яму нявеста, ды з другога цеста. Папомні маё слова: што лапці сплятуць, таго боты не разблытаюць. Будзе вяселле!

## КАРЦІНА ВОСЬМАЯ

**Злева — алтар касцёла. Амаль уся сцэна свабодная для танцаў. Пшэбыеўскі ў простым адзенні пад руку з нявестаю. Цёмна, гарацць свечкі. За маладымі Кудрачок і некалькі лакеяў. Гучыць арган.**

Манах ***(у адзенні ксяндза).*** Будзьце мужам і жонкаю, дзеці мае. Пацалуйцеся!

**Пан падымае фату нявесты і здзіўлена адскоквае. Нявеста — гэта Маланняя, якая хапае яго і цалуе.**

Пшэбыеўскі. То цо такое?! Хто то? Ты каго, нягоднік, мне падсунуў?
Кудрачок. Не ведаю, паночку. Вы маскарад зрабілі, а мы — кірмаш. Вось і атрымалася ўсё шыварат навыварат.
Пшэбыеўскі. Ага, акруціць мяне захацелі — не выйдзе — вянчання не было, то ж не ксёндз, то кухар мой, татарын Мустафа.
Манах. Пабойцеся Бога, пан Пшэбыеўскі, які ж я татарын?
Пшэбыеўскі. А-а-а, а ты адкуль узяўся, цябе хто клікаў?
Манах. Несцерка прывёз — вось па вашым пісьме. ***(Падае пісьмо).***

П ш э б ы е ў с к і. «Той, хто перадасць гэтае пісьмо, адвязе вас па маёй справе», — а, дык гэта гэты прайдзісвет!

**З'яўляецца Н е с ц е р к а.**

Н е с ц е р к а. Я-я, паночку, — прабачце, што затрымаўся, пакуль праспаўся пасля вашае гарэлкі.
П ш э б ы е ў с к і. Ды вы ўдвух — і ты ***(кідаецца да Кудрачка),*** ды я цябе за доўг у астрог!
Н е с ц е р к а. Заплоцім паночку — толькі распіскаю. Ад вашае жонкі. Памятаеш, Малання, тысячу, што дамаўляліся?
П ш э б ы е ў с к і. Якой жонкі?
М а л а н н я . А то не? А то не абяцаў, а то не вянчаліся?
П ш э б ы е ў с к і. Ціха, ціха.
М а л а н н я. А то я не пры ўсіх правах!

**Н е с ц е р к а аддае распіску.**

Н е с ц е р к а. Вось і разлічыліся. Адным словам, каму вінен — усе прабачце.
П ш э б ы е ў с к і. Ды што ж мне цяпер рабіць?!
Н е с ц е р к а. Вяселле гуляць. Такая ўжо тут справа — глядзець трэба. На кірмашы і бык цельны. А купіў мыла — еш, хаця і не міла.
П ш э б ы е ў с к і. Стойце! Гэта разбой! Лакеі — хапайце яго.
Н е с ц е р к а. Ціха, ціха, паночку, — я таксама не адзін. Гэй, людзі.

**Уваходзяць людзі. Шум. Крыкі. Вяселле. Прыбягаюць К а ц я р ы н а і А н д р э й.**

А н д р э й. Чакайце, дзе ксёндз — і нас таксама.

**Агульны шум, крыкі, вянчаюць К а ц я р ы н у і А н д р э я. Раптам убягае к у х а р Мустафа, падае ў ногі П ш э б ы е ў с к а м у і крычыць: «Мая твая разумей, разумей!» За ім бягуць в а р т а ў н і к і і Б у р г а м і с т р, з крыкам «Пярэварацень, пярэварацень!»**

Несцерка. Гэй, ваша светласць, — давайце на вяселле. Пасля разберацеся, хто і ў што перавярнуўся. Гуляй, людцы, пакуль вяселле.

**Пачынаюцца танцы, песні.**

Вось цяпер мне пагуляць,
Пакуль грае скрыпка.
Рукі-ногі не баляць,
Сярэдзіна гібка.

Маладыя хлопцы ***(акружаюць Маланню).***

Эх, жаніўся мех на торбе,
Будзем танцы танцаваць,
Няма грошай ні капейкі,
Застаецца пагуляць.

Малання.

Мілы мой, харошы
Не люблю цябе за так,
А люблю за грошы.

Маладыя хлопцы ***(вакол Пшэбыеўскага).***

Без мяне мяне жанілі,
Мяне дома не было.
Я спачатку зажурыўся,
Потым стала весяло.

Андрэй.

Ох, не піў бы і не еў бы,
Усё на мілую глядзеў бы.

Кацярына.

Хоць пад лаваю сядзець,
Ды на прыгожага глядзець.

Маладыя хлопцы ***(вакол Манаха).***

А хто любіць пана,
А хто пападдзю,
А я, дурачок,
Люблю папоўскіх дачок.

**З'яўляецца Брындзюкоўна з таўкачом.**

Несцерка. Кінь сваю пушку. Дапамаглі сродкі — цяпер твой муж да Маланні ні нагой!

М а л а д ы я х л о п ц ы ***(вакол Брындзюкоўны).***

Знаў Бог,
Што не даў свінні рог.
А каб баба рогі ўзяла,
Усіх на свеце б забадала.

Н е с ц е р к а ***(аказваецца з Пшэбыеўскім на пярэднім плане).*** Не хмурся, паночку, больш убачыш. Вось бы гэтую гісторыю запісаць у ксёнжку ды і выдаць у Варшаве — от бы быў фальклор. Ну ды прыйдзе час, напішуць кніжкі і пра нас! Эх, гуляй людцы, пакуль вяселле!

Ой, без дудкі, без дуды
Ходзяць ногі не туды.
А як дудкі заіграюць,
Ногі ўдзержу не знаюць.

**Усе разам танцуюць.**

А не ўсё па горы плакаць,
А не ўсё па ім тужыць.
Прыйдзе час — хаця хвілінку
Ды ў вясёласці пажыць.

**Заслона апускаецца. Застаецца адзін Н е с ц е р к а.**

Ну, людцы добрыя, закончан баль — і дудкі ў торбу! Вось гэтак і жывём — часам плачам, часам скачам. Торба не груз, сто вёрст не пераход — дарогу топчам, хлеб есца, лапці трэплюцца, а ногі свае, не казённыя, так і хаджу — паміраць няма калі. І пакуль вы, людцы добрыя, смяяцца не развучыцеся — далібог, не памру. Адным словам, што было — то прайшло, што будзе — то пабачым, а што дрэнна — то не мы. Здаровы бывайце, дабром памінайце, у госці чакайце: здарыцца зноў вашы мясціны праведаць — не праміну зайсці паабедаць. ***(Кланяецца і выходзіць, закінуўшы за плечы торбу).***

**Заслона.**

## Пытанні і заданні

1. Сцісла перакажыце прыгоды Несцеркі. Які эпізод уяўляецца вам самым цікавым і смешным? Растлумачце чаму.

2. Ахарактарызуйце галоўнага героя п’есы. Прывядзіце прыклады, якія найбольш ярка паказваюць, што гэта дасціпны, добры і шчыры чалавек.

3. Якімі вам уяўляюцца іншыя героі камедыі: Пятро Кудрачок, Кацярына, Маланне, Бургамістр, Пшэбыеўскі, Брындзюкоўна? Як іх характарызуе ў пачатку твора драматург?

4. Які момант у сюжэце п’есы з’яўляецца кульмінацыйным? Прачытайце яго па ролях.

5. У чым адметнасць мовы камедыі? Прывядзіце прыклады прыказак і прымавак, прыпевак і яркіх народных выразаў, ужытых у творы.

## З М Е С Т

**Дарагія васьмікласнікі! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3**

**Хто такі пісменнік? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5**
*Сергей Грахоўскі.*
«Каб пісаліся вершы...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
*Алег Салтук.*
Натхненне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**Што такое твор? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7**
**Агульнае ўяўленне пра роды літаратуры . . . . . . . . . . . . 8**
*Андрэй Федарэнка.*
Рэпетыцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

**Лірычныя жанры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26**
*Рыгор Барадулін.*
Мая Бацькаўшчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
*Пятрусь Броўка.*
Як ліст дубовы... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
*Яўгенія Янішчыц.*
«Ты пакліч мяне. Пазаві» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
*Адам Русак.*
Дзе ты, зорка мая? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
*Максім Танк.*
«Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...» . . . . . . . . . . . . . . 31

**«Цвёрдыя» страфічныя формы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32**
*Максім Танк.*
Санет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Антысанет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
*Янка Сіпакоў.*
Максім, Ялта і кіпарысы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

**Эпічныя жанры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35**
*Алесь Бадак.*
Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца. . . . . . . . . . . . . . . 35
*Валерый Гапееў.*
Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці . . . . . 60
*Раіса Баравікова.*
Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка . . . . . . . 89

**Драматычныя жанры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132**
*Уладзімір Бутрамееў.*
Новыя прыгоды Несцеркі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132

В у ч э б н а е   в ы д а н н е

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**РУСІЛКА** Вольга Іванаўна

**НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРА Ў ЯГО РОДАВАЙ І ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІЦЫ**

**8 клас**

*Дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання*

Рэдактар *К. С. Голуб*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Макаранка*
Мастацкі рэдактар *В. П. Калінін*
Стыльрэдактар *К. С. Голуб*

Падпісана ў друк 20.10.2010. Фармат $60\times84^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times New Roman. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 10,7. Ул.-выд. арк. 8,34. Тыраж 3400 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня "Перамога"».
ЛП 02330/0494182 ад 03.04.2009.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.

## ДЛЯ ЗАМЕТАК